WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 ЧЭРВЕНЯ 2010 г.
АЎТОРАК
№ 119
(26727)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ПЫТАННІ БЯСПЕКІ БЕЛАРУСІ І РАСІІ НЕ ПАВІННЫ ЦЯРПЕЦЬ З-ЗА НЯВЫРАШАНЫХ ПРАБЛЕМ У ЭКАНОМІЦЫ І ІНШЫХ СФЕРАХ

Аб гэтым учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з сакратаром Савета бяспекі Расіі Мікалаем Патрушавым.

«Думаю, як і вырашаных пытанняў у той сферы, якой займаюцца саветы бяспекі Беларусі і Расіі, дастаткова, так ёсць і нявырашаныя праблемныя пытанні. Ад гэтага нікуды не дзенешся. Як бы ў нас не складваліся адносіны ў эканоміцы, іншых сферах, бяспека нашых дзяржаў, Саюзнай дзяржавы — пытанні даўно вырашаныя, і тут жартаваць ніхто не павінен. Вядома, усё гэта сёння ва ўвязцы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым, Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што заўсёды гаварыў аб тым, што «тут, на заходніх рубяжах, у рускага чалавека ёсць надзейная апора і ёсць сябры, у якіх бы абставінах мы ні знаходзіліся і ні працавалі». «Думаю, нам трэба зрабіць усё для таго, каб людзі ў Беларусі і Расіі ні на хвіліну не сумняваліся, што мы абсалютна цесна супрацоўнічаем у сферы бяспекі, абароны нашых дзяржаў», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Пры гэтым ён адзначыў, што калі б грамадзянскія ведамствы дзвюх краін мелі такія адносіны і вынік сумеснай работы, як МУС і Мінабароны, то не было б ніякіх праблем. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў Мікалаю Патрушаву падчас сустрэчы адкрыта абмеркаваць усе існуючыя праблемы і намеціць шляхі іх вырашэння.

У сваю чаргу Мікалай Патрушаў адзначыў: «Мы нацэлены толькі на развіццё супрацоўніцтва. Мы ведаем аб выкліках і пагрозах, якія існуюць». Ён падкрэсліў, што гэтым пагрозам неабходна не толькі процістаяць, але і сумесна папярэджваць і прадбачыць іх, праводзіць сумесную работу па лакалізацыі пагроз.

УЛАДЗІМІР СЯМАШКА ДАЛАЖЫЎ АЛЯКСАНДРУ ЛУКАШЭНКУ АБ НОВЫХ ПЛАНАХ РАЗВІЦЦЯ БКК

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора сустрэўся з першым віцэ-прэм'ерам Уладзімірам Сямашкам. Адным з галоўных прадметаў абмеркавання ў час рабочай сустрэчы сталі перспектывы развіцця Беларускай калійнай кампаніі (БКК).

11 чэрвеня адбылася здзелка, калі былы мажарытарны акцыянер ААТ «Уралкалій» Дзмітрый Рыбалоўлеў прадаў свой кантрольны пакет тром новым акцыянерам. Яны пацвердзілі, што не маюць намеру выходзіць з Беларускай калійнай кампаніі. Новыя акцыянеры адназначна запэўнілі, што звязваюць будучае свайго бізнэсу менавіта з БКК. Таксама было прынята рашэнне аб тым, што Дзмітрый Рыбалоўлеў застанецца старшынёй Наглядальнага савета БКК. Ён таксама застанецца ў бізнэсе «Уралкалію» (яму па-ранейшаму належыць 12,4 працэнта акцый гэтай кампаніі). Уладзімір Сямашка далажыў Прэзідэнту аб новых планах па развіцці і ўмацаванні БКК.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ ПЛАНУЕ РАЗЛІЧЫЦЦА ЗА ГАЗАВЫ ДОЎГ З РАСІЯЙ НА ПРАЦЯГУ ДВУХ ТЫДНЯЎ

Аб гэтым журналістам паведаміў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка.

Пры гэтым беларускі бок выставіў расіянам сустрэчнае патрабаванне: пагасіць доўг за транзіт газу ў $217 млн. Уладзімір Сямашка адзначыў, што перагаворны працэс па газавай тэматыцы з расійскім бокам ідзе ў патрэбным напрамку. Ён падкрэсліў, што ў перагаворах з «Газпрамам» выспявае пэўны кампраміс. «Па-першае, нам паграмадзілі 85-працэнтным абмежаваннем паставак. Але сёння ўведзена абмежаванне толькі 15 працэнтаў. Гэта ўжо можна перажыць і думаць аб тым, як кампенсаваць», — сказаў чыноўнік. Першы віцэ-прэм'ер таксама паведаміў, што ў выніку перагавораў «з'явіўся нейкі пратакол, з якім мы не можам быць згодныя ў тым выглядзе, як ён ёсць. Але важна, што расійскі бок прызнаў, што вінаваты беларускаму боку $217 млн за транзіт». «Такім чынам, калі расіяне нам заплацяць $217 млн за транзіт, то мы гатовы заплаціць $187 млн за газ», — растлумачыў Уладзімір Сямашка, удакладніўшы, што хто будзе плаціць першым — непрынцыпова.

«Мы не скрываем, што ў Беларусі складана з валютай. І каб увайсці ў рэжым рэальнага часу з аплатай, мы павінны пазычыць валюту, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — Мы разлічымся. Можа, не сёння, можа, на працягу двух тыдняў знойдзем магчымасць, пазычым, але разлічымся. А яны разлічацца за транзіт». Уладзімір Сямашка дадаў, што беларускі бок «не выйдзе з перагавораў, мы будзем настойваць, пераконваць калег, шукаць кампраміс». Першы віцэ-прэм'ер нагадаў, што ў 2006 годзе, калі заключаўся кантракт па пастаўках газу, абодва бакі зыходзілі з разумення таго, што трэба выйсці на прынцып роўнадаходных цэнаў. «Гэта значыць, што прыбытак, закладзены пры продажы газу Германіі, Польшчы, Беларусі і ўнутры самой Расіі, павінен быць аднолькавы, — растлумачыў Уладзімір Сямашка. — Мы разумелі пазіцыю расійскага ўрада. Праблема была ў тым, што ў Расіі да нядаўняга часу продаж газу быў стратным, «Газпрам» прадаваў газ унутры Расіі па стратных цэнах, таму трэба было ўзнімаць цэны. І мы, разумеючы сваіх калег, згадзіліся на сінхроннае павышэнне цэнаў. Але гэта было ў 2006 годзе, і былі запэўненні, і былі дакументы, якія сведчылі аб нашай салідарнасці. Але мінула тры гады, і мы бачым, што траекторыя, якую абазначаў урад Расіі, рэальная траекторыя руху да роўнадаходных цэнаў значна ніжэйшая за тую, якая зададзена. І мы бачым, што Расія не выйдзе ўжо да 1 студзеня 2011 года на роўнадаходныя цэны. Мы ўжо бачым афіцыйныя заявы на ўзроўні міністраў РФ, што яны плануюць выйсці на роўнадаходныя цэны да 2015 года».

«Калі так, то мы гаворым: гэта форс-мажорныя абставіны. Мы гаворым, што нам патрэбны цэны, супастаўныя з расійскімі», — рэзюмаваў Уладзімір Сямашка.

БЕЛТА.

22 чэрвеня. Брэсцкая крэпасць

А СЁННЯ БЫЛА ВАЙНА...

ПРАЙШЛО ўжо 69 гадоў... Тады, у чэрвені 1941-га, усе яшчэ былі жывыя ў невялікім горадзе Брэсце на заходняй мяжы. У Кабзона ёсць песня пра гэтыя дні: «Вальс. Политрук приглашает невесту. Все еще живы...» І сапраўды, усе былі заняты звычайнымі справамі, нехта ўладкоўваўся на працу, нехта рыхтаваўся паступаць у інстытут, нехта збіраўся ствараць сям'ю. Іншыя працавалі, гадавалі дзяцей, будавалі планы, як палітрук Пачэрнікаў і яго жонка Аляксандра. І раптам усё рушыцца, перакрэсліваецца, абрываецца. Потым пачынаецца яшчэ больш страшнае — смерць родных, блізкіх, сяброў. Вайна паглынае каштоўнасці, створаныя працай чалавечай, і саміх людзей. І ўсё для задавальнення нечых палітычных амбіцый і нажывы аграмадных багаццяў. Дзіка, неверагодна, але рэальна.

Кадр з фільма «Брэсцкая крэпасць».

Колькі іх, нечых блізкіх, палягло на зямлі Брэсцкай крэпасці ў першыя дні вайны! Гэта найбольш балюча і шчымліва адчуваеш у цішыні, за некалькі хвілін да традыцыйнага мітынгу, які ўжо шмат гадоў праводзіцца ў крэпасці ў чатыры раніцы 22 чэрвеня. Людзі звычайна збіраюцца за гадзіну да пачатку, калі яшчэ спяць птушкі і чутно ваду ў Мухаўцы і Бугу. А экскурсавод, што сустракае дэлегацыі з іншых гарадоў і краін, звычайна нагадвае радкі з кнігі нямецкага гісторыка Карэла пра Другую сусветную вайну. Відаць, ніхто лепш за яго не апісаў гэтыя апошнія перадваенныя хвіліны ваколіц Брэста: «Было 3 гадзіны 12 хвілін. Кожны глядзеў на цыферблат. У кожнага быў камяк у горле. У кожнага пачашчана білася сэрца. Цішыня была невыносная. Тры гадзіны 13 хвілін. Яшчэ было не позна змяніць ход падзей. Пачатак незваротнага яшчэ не адбыўся. Але далей паўзлі па цыферблаце мінутныя стрэлкі, і вайна супраць Савецкага Саюза, які ляжаў наперадзе, у мёртвай цішыні, набліжалася няўхільна... У 3.15 пачаўся ўраган і пранёсся над нашымі галовамі... Гэты гіганцкі канцэнтраваны агнявы вал літаральна скалануў зямлю. Над цытадэллю як грыбы выраслі густыя чорныя фантаны зямлі і дыму». Гэта ўспаміны чалавека, які потым стане пісьменнікам, прайшоўшы па нашай зямлі з арміяй, што несла смерць і разбурэнні.

А ў крэпасці тады людзі не паспелі ўцяміць, што здарылася. Адным першыя імгненні падаліся гіганцкай небывалай навальніцай, іншыя прынялі атручаны едкім агнём хаос за канец свету. І толькі потым, праз хвіліны, прыходзіла горкае разуменне існага. Многія гінулі адразу ад бомбаў і снарадаў. А шматпакутнаму палітруку Івану Пачэрнікаву і яго жонцы выпала з найгоршых выпрабаванняў. Снарад разарваўся на лесвічнай пляцоўцы. На вачах бацькоў загінулі дзеці. Немцы акружылі дом і патрабавалі здацца. Тады Іван і Аляксандра застрэліліся. Гэта адзін з трагічных эпізодаў гісторыі крэпасці. А яе гісторыя складаецца з тысяч падобных эпізодаў.

Пра гэта і здымалі расійска-беларускае кіно «Брэсцкая крэпасць». Чаканы, анансаваны праект завершаны. Здымкі фільма, дарэчы, пачыналі тут, на зямлі цытадэлі, у чатыры гадзіны раніцы два гады таму. Калі нумар газеты прыйдзе да чытача, прэм'ера стужкі, якую зняў рэжысёр Аляксандр Кот, ужо адбудзецца. На гэты раз мерапрыемствы пачнуцца не ў чатыры раніцы, а значна раней і будуць доўжыцца ўсю ноч. Пасля прэм'еры фільма на традыцыйны мітынг-рэквіем збярэцца шмат гасцей з Расіі: пасажыры Цягніка памяці, удзельнікі журналісцкага прэс-тура, прадстаўнікі грамадскасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Гаспадары

СПРАВА ДЛЯ ДАМСКІХ ПАЛЬЧЫКАЎ

Ганчарная справа ў жаночых руках? Так! Калі не ўсёй Беларусі, дык Гарадоцкага раёна, дакладна. Бо менавіта ў гэтым рэгіёне традыцыйнага ганчарства сталася так, што за справу адраджэння промыслу ўзяліся менавіта прадстаўніцы прыгожай паловы.

Настаўнік працы па адукацыі **Алена БАРАЎЦОВА** (на фота ў цэнтры) прыйшла ў Гарадоцкі Дом рамёстваў шаснаццаць гадоў таму і вырашыла аднавіць колішнюю, амаль згубленую традыцыю стварэння глінянага посуду. Яна адшукала даўнейшых майстроў працы з глінай і пераняла ад іх сакрэты ляпіць і абпальваць гладышы, місы, спарышы, макітры. Майстры былі яшчэ з даваенных ганчарных дынастый і не забылі, як з кавалка гліны можна атрымаць патрэбную і практычную ў гаспадарцы рэч. Алена засвоіла ад іх тэхніку загартоўкі керамікі дымленнем і абварваннем, а ганчарны круг цяпер бездакорна дапамагае яе таленавітым рукам у стварэнні формаў.

Хоць шмат гадоў Алена Бараўцова ўзначальвае Гарадоцкі Дом рамёстваў, ганчарства не перастала быць яе захапленнем. Дарэчы, гэтая культурная ўстанова не раз прызнавалася лепшай у краіне, а ў 2007 годзе калектыў Дома рамёстваў за адраджэнне сваіх уласных традыцый атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта.

— Я заўсёды глядзела на ганчарства з узрушэннем, — кажа Алена Міхайлаўна, пачынаючы выводзіць на ганчарным крузе тонкасценны сувенірны збаночак. — Гэтае захапленне стала для мене не толькі любімым, але і справай гонару — адрадзіць наноў шматвяковую традыцыю.

Цяпер побач з Аленай ганчарны круг круціць і **Ірына ШАЛАЕВА** (на фота-здымку). Яна, як і Алена Бараўцова, не лічыць, што ганчарства і кераміка — толькі мужчынскія абавязкі. Гэтак лічыць і яшчэ адзін кераміст цэнтра — **Алена АРХІПАВА**. Нашчадкі колішніх майстроў у Гарадку ў асобах гэтых абаяльных жанчын імкнуцца да сваіх сапраўдных вытокаў, высока трымаючы планку народнага мастацтва. Не чакаючы, калі яго нарэшце пяроймуць моцныя мужчынскія рукі.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

І ў працяг тэмы. *Сёння ў вёсцы Гарадная Столінскага раёна – гэта поўдзень Беларусі і ў супрацьлеглым баку ад Гарадка, пачынаецца Другі міжнародны пленэр ганчароў. Ён бу-дзе доўжыцца да 5 ліпеня і чакаецца, што ў ім прымуць удзел майстры з Расіі, Украіны, Польшчы, Прыбалтыкі, Германіі і Даніі. Вядома, не абыдзецца без сваіх утаймавальнікаў гліны і агню, толькі адных гараднянскіх будзе з дзясятак. Палескі фэст канстатуе жывую цікавасць і вяртанне да рамяства, якое існуе ад часоў з'яўлення на зямлі чалавека. Верагодней за ўсё менавіта ганчары былі першымі майстрамі на зямлі. Значыць, першымі ў Гарадку і Гарадной.*

Мінэнерга Беларусі выпрацоўвае меры па рабоце сістэм газазабеспячэння ва ўмовах абмежавання падачы газу

Міністэрства энергетыкі Беларусі выпрацоўвае меры па рабоце сістэм газа- і энергазабеспячэння рэспублікі ва ўмовах абмежавання ААТ «Газпрам» падачы газу. Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА прэс-сакратар Мінэнерга Людміла Заньковіч. Прэс-сакратар адзначыла, што «сапраўды «Газпрам» учора з 10.00 увёў абмежаванні паставак прыроднага газу спажыўцам Беларусі на 15 працэнтаў ад планавага аб'ёму». У сувязі з гэтым Міністэрства энергетыкі праводзіць мерапрыемствы па недапушчэнні збояў у энергасістэме. Выпрацоўваюцца меры і прымаюцца рашэнні па рабоце сістэм газа- і энергазабеспячэння Беларусі ва ўмовах уводзімых ААТ «Газпрам» абмежаванняў у падачы газу, падкрэсліла прадстаўнік Мінэнерга.

БЕЛАРУСЬ І МАЛЬТЫЙСКІ ОРДЭН ВЫПУСЦІЛІ АГУЛЬНУЮ ПАШТОВУЮ МАРКУ

Гашэнне першай паштовай маркі, прысвечанай паштоваму пагадненню Беларусі і Суверэннага Мальтыйскага Ваеннага Ордэна, адбылося 21 чэрвеня ў штаб-кватэры Беларускага таварыства сяброўства і культурных сувязяў з замежнымі краінамі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Злева направа: першы намеснік міністра замежных спраў Ігар ПЕТРЫШЭНКА, Манах Капелан Мальтыйскага ордэна, Мітрапаліт Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Суверэннага Ваеннага Мальтыйскага ордэна ў Беларусі Пауль Фрыдрых фон ФУРХЕР падчас гашэння першай паштовай маркі «28 красавіка 2009. Паштовае пагадненне з Суверэнным Ваенным Мальтыйскім ордэнам».

Як адзначыў першы **ў гісторыі суверэннай Беларусі святар і іерарх, які стаў Манахам Капеланам Мальтыйскага Ордэна, Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч**, «хоць Мальтыйскі Ордэн і не мае сваёй тэрыторыі, але гэта суб'ект міжнароднага права і асобная дзяржава. Вельмі важна, што паміж нашымі краінамі развіваюцца таварыскія адносіны. Мы ведаем дабрачынныя акцыі мальтыйскіх арганізацый, якія прыязджаюць у Беларусь з гуманітарнай дапамогай. І той факт, што ад сённяшняга дня ў нас ёсць свая паштовая марка, сведчыць пра тое, што нашы адносіны развіваюцца. Патэнцыял Мальтыйскага Ордэна ў Беларусі яшчэ далёка не выкарыстаны. І я мяркую, што сённяшняя падзея — гэта новы крок да выкарыстання гэтых новых магчымасцяў».

— Я думаю, гэты дзень увойдзе ў гісторыю нашага супрацоўніцтва, — адзначыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Суверэннага Ваеннага Мальтыйскага Ордэна ў Рэспубліцы Беларусь Пауль Фрыдрых фон Фурхер**. — Практыка паказала, што ўсе заключаныя паміж намі дамовы заўсёды выконваюцца. Надалей плануем пашырыць наша супрацоўніцтва ў гэтай галіне — выпуск чарговай маркі, другой па ліку, адбудзецца ў Рыме ў найбліжэйшыя два гады, куды будуць запрошаныя прадстаўнікі «Белпошты» і Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі.

Паштовая марка, мастацкім афармленнем якой займалася Яўгенія Бядонік, выпушчана тыражом у 40 тысяч экзэмпляраў.

— Над макетам маркі працавалі разам дызайнеры дзвюх паштовых адміністрацый, — расказала **намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Беларусі Ніна Гаўрылава**. — Рэалізацыя гэтага праекта — яркае пацверджанне нашага супрацоўніцтва. Спадзяёмся, што сумесны выпуск паштовай маркі паслужыць далейшаму развіццю двухбаковых адносінаў, а таксама стане ўпрыгожваннем калекцый філатэлістаў шэрагу краін.

Дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Суверэнным Ваенным Мальтыйскім Ордэнам былі ўсталяваны ў 1996 годзе. Дамова аб абмене паштовымі адпраўленнямі паміж ведамствамі была падпісана ў Рыме ў красавіку 2009 года.

Ілья ЛАПАТО.

НЕ ХАДЗІ КУПАЦЦА ЎНАЧЫ З НОЎТБУКАМ

Жыхар Брэста паскардзіўся ў міліцыю, што ў яго скралі ноўтбук за два з паловай мільёны рублёў... з двух да трох ночы на гарадскім пляжы.

Начнога злодзея неўзабаве затрымалі. Ім аказаўся малады жыхар горада Высокае Камянецкага раёна.

Яна СВЕТАВА.

Закупачныя цэны на малако вышэйшага і першага гатунку павышаны ў сярэднім на 10 %

У Беларусі закупачныя цэны на малако вышэйшага і першага гатунку, якое закупляецца для дзяржаўных патрэбаў, павышаны ў сярэднім на 10 %. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 923, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Апараце Саўміна. Закупачныя цэны на малако вышэйшага гатунку цяпер складаюць Br865 за 1 кг, першага гатунку — Br795. Раней яны складалі адпаведна Br785 і Br725.

ЗА АБАРАЧЭННЕ НАРКОТЫКАЎ — 9 ГАДОЎ

Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска прызнаў Генадзя Ляховіча вінаватым у незаконных набыцці, захаванні, перавозцы і збыце асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва ў буйным памеры і наркатычных сродкаў. Прызначанае пакаранне — 9 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму. Як паведамілі ў прэс-службе ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці, было ўстаноўлена, што падазроная асоба мае намер рэалізаваць пэўную колькасць асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва — метамфетаміну. Супрацоўнікі УКДБ затрымалі зламысніка на адной з аўтастаянак Мінска. Падчас вобыску ў Ляховіча і ў яго аўтамабілі было выяўлена 12 пакецікаў з метамфетамінам.

Святлана БАРЫСЕНКА.

14 ЧАЛАВЕК ДАВЯЛОСЯ ЭВАКУЯВАЦЬ

позна вечарам са шматкватэрнага дома ў цэнтры Гомеля. Выраваталынікі, якія прыехалі на выклік, пабачылі, як з акна на чацвёртым паверсе 5-павярховай «хрушчоўкі» ідзе густы чорны дым. Высветлілася, што гаспадароў у кватэры няма. Пажар атрымалася патушыць праз 20 хвілін, але маёмасць і мэбля ў пакоях моцна пашкоджаныя. На ўсякі выпадак супрацоўнікамі МНС былі эвакуяваны з суседніх кватэр чацвёртага і пятага паверхаў жыхары, з іх тры дзіцяці. Ніхто з людзей не пацярпеў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«Прамая лінія»

САМААДЧУВАННЕ НЕ ВЫДАТНАЕ?

Не адкладвайце на заўтра вырашэнне праблем, звязаных са здароўем. Удакладняйце незразумелае, не займайцеся самалячэннем, калі да справы можна падысці прафесійна. А на дапамогу вам гатова прыйсці **дацэнт кафедры гераналогіі і геріятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў Пятроўна ВАРОНІНА.** Яна адкажа на любыя вашы пытанні **1 ліпеня, у чацвер, з 14.00 да 15.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.**

ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ

КУПП «Витпекс» в г. Витебске по ул. Володарского, 100.

ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.

Информация на сайте: **www.vitinvest.biz**
Тел.: **431 498;**
+375336480387 (МТС).

УНП 300149663

ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов в Логойском районе в том числе:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Стартовая цена бел. руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации бел. руб.
1	д. Знаменка, уч. № 2 623284603001000139	0,1972	2553192	1196468
2	д. Знаменка, уч. № 3 623284603001000142	0,1970	2550602	1196468
3	д. Знаменка, уч. № 4 623284603001000141	0,1960	2537655	1196468

Задаток в размере 10 % от начальной стоимости земельного участка перечисляется на р/с № 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения. **Аукцион состоится 22 июля 2010 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. № 6, ком. № 7.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20 июля 2010 года** по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6, ком. № 9.

Контактные телефоны: (01774) 55473, 54350.
Информацию можно найти на сайте www.logoysk.by.

Трагедыі

РАКАВАЯ ПАЕЗДКА

У Мінску на 22-ім кіламетры Мінскай кальцавой дарогі ў дарожна-транспартным здарэнні загінулі адразу шэсць чалавек.

Страшная аварыя здарылася каля 20.50 у нядзелю, калі аўтамабіль «Фіят Брава» рухаўся па вонкавым коле МКАД з боку вуліцы Казінца ў бок вуліцы Кіжаватава: машына на хуткасці выехала за межы праезнай часткі і ўдарылася ў асвятляльную мачту. Удар быў такі моцны, што аўтамабіль разарвала мачтай на дзве часткі. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле агітацыі і прапаганды ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, у «Фіяце Брава» знаходзіліся шэсць чалавек — чатыры дзяўчыны і два маладыя чалавекі, з якіх, на жаль, нікому выратавацца не ўдалося. Паводле папярэдніх звестак, прычынай ДТЗ стала тое, што кіроўца не справіўся з кіраваннем аўтамабіля. Праўда, пакуль дакладна невядома, хто ж знаходзіўся за рулём злашчаснага аўто. Між тым, паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, машына належала 21-гадовай мінчанцы, якая таксама стала ахвярай гэтага здарэння. Акрамя таго, на месцы ДТЗ былі ўстаноўлены асобы яшчэ трох загінулых — гэта мінчанін 1989 года нараджэння, жыхарка пасёлка Гатава 1989 года нараджэння і 20-гадовая дзяўчына з Браслава. Асобы яшчэ дзвюх ахвяр учора высвятляліся. Расследаваннем гэтай трагедыі займаецца следчае ўпраўленне папярэдняга расследавання ГУУС Мінгарвыканкама.

Ігар ГРЫШЫН.

МАРШРУТКА З ТРАЛЕЙБУСАМ: ЛОБ У ЛОБ — ЁСЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫЯ

У прыватнасці, паведаміла карэспандэнту «Звязды» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Савецкага РУУС Марыя Дзьякава, кіроўца маршруткі ў цяжкім стане змешчаны ў рэанімацыю, а яшчэ два пасажыры, якія ехалі ў маршрутцы, дастаўленыя ў бальніцу з цялеснымі пашкоджаннямі.

Дарожна-транспартнае здарэнне мела месца ўчора ў Мінску на вуліцы Мірашнічэнкі каля 9.17 раніцы: кіроўца маршруткі раптоўна выскачыў на сустрэчную паласу, па якой рухаўся тралейбус, і не змог пазбегнуць сутыкнення. Між іншым, паводле звестак старшага інспектара, летась кіроўца маршруткі ўжо прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за ўчыненае ДТЗ. Акрамя таго, у мінулым годзе было зафіксаванае перавышэнне гэтым кіроўцам хуткасці, а таксама ён двойчы парушаў правілы дарожнага руху, рухаючыся на чырвонае святло святлафора...

Ігар ГРЫШЫН.

ISSN 1990 - 763X

ЛЕТНІ ФЭСТ «АЛЕКСАНДРЫЯ ЗБІРАЕ СЯБРОЎ» СТАНЕ ТРАДЫЦЫЙНЫМ

Аб гэтым заявіў 19 чэрвеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на свяце.

«Мы зробім усё, каб гэта акцыя стала традыцыйнай. Можа, прымяркуем яе да нашага ўсенароднага свята і станем збірацца тут на Івана Купалу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ідэя правядзення свята нарадзілася спантанна і нечакана. «Мы не планавалі гэта свята ў мінулым і нават у гэтым годзе», — сказаў ён, адзначыўшы, што хай ненадоўга, але штогод прыязджае ў родныя месцы.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ён не чакаў, што гэта мерапрыемства ператворыцца ў такое грандыёзнае свята, на якое прыехалі людзі не толькі з навакольных вёсак, але і з Оршы, Шклова, Магілёва і нават сталіцы.

Прэзідэнт пажадаў удзельнікам свята добрага настрою, шчасця, поспеху, матэрыяльнага дабрабыту і працы на карысць беларускага народа.

Пасля прыбыцця на свята Прэзідэнт наведаў «Горад майстроў», пагутарыў з народнымі ўмельцамі. Спецыяльна для кіраўніка дзяржавы кавалі зрабілі падкову на шчасце, у стварэнні якой Аляксандр Лукашэнка і яго малодшы сын Мікалай таксама прынялі ўдзел.

У летнім фэсце «Александрыя збірае сяброў» прымалі удзел больш як 3 тыс. чалавек. Мерапрыемства праходзіла на беразе Дняпра каля моста, які нядаўна злучыў не толькі дзве суседнія вёскі, Александрыю і Копысь, але і дзве вобласці — Магілёўскую і Віцебскую.

Для ўдзельнікаў і гасцей фэсту была арганізавана шырокая культурная праграма, пачынаючы ад «Горада майстроў» і магчымасці паспрабаваць традыцыйныя беларускія стравы і напіткі, заканчваючы выступленнямі народных калектываў і канцэртам з удзелам вядомых артыстаў беларускай эстрады. Праграма мерапрыемства таксама ўключала феерверк і лазернае шоу.

Як адзначаюць арганізатары, фэст — гэта своеасаблівы пілотны праект. Ідэя арганізаваць тут такое мерапрыемства ўзнікла не на пустым месцы. Здаўна Днепр быў важнай суднаходнай артэрыяй Беларусі, часткай шляху «З варагаў у грэкі». З-за гэтага вёскі Александрыя, Копысь і горад Шклоў былі традыцыйнымі месцамі правядзення кірмашоў і народных гуляняў. Так, напрыклад, Шклоў славіўся сваімі ўмелымі рэзчыкамі па дрэву, якія ў тым ліку выраблялі іканастасы для храмаў у Маскве і Смаленску. Александрыя знакамітая майстрамі лозапляцення. А ганчары з Копыся былі вядомыя не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. Таму гэта мерапрыемства мае пад сабой глыбокія гістарычныя карані. Яно з'яўляецца важным элементам захавання культурных, моўных традыцый беларускага народа, рамёстваў.

Акрамя таго, цяпер актыўна прапрацоўваецца магчымасць арганізацыі турыстычных маршрутаў па Дняпры. І гэта мерапрыемства, калі яно будзе праводзіцца рэгулярна, таксама будзе вельмі прывабнае для патэнцыяльных турыстаў сваім народным каларытам.

Варта таксама адзначыць, што ў гэтым годзе фэст праводзіўся ў дзень народнага свята — Фядота-ўраджайніка. Традыцыйна ў гэты дзень народ варажыў, спадзеючыся на добры ўраджай.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Вяртаючыся да надрукаванага

«АДМІНІСТРАЦЫЯ КСУП ПРЫНЯЛА РАШЭННЕ ПАКІНУЦЬ ДОМ ЗА МУЖАМ ЗАЯЎНІЦЫ»

У НУМАРЫ «Звязды» ад 15 чэрвеня пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» была змешчана заметка «Карыстацца службовым жыллём сям'я зможа яшчэ два месяцы». Коратка нагадаем сутнасць узнятай у ёй праблемы і дадзенага на яе адказу. З Брагінскага раёна патэлефанавала жанчына, якая паскардзілася, што, у сувязі са звальненнем мужа з мясцовай гаспадаркі, яе разам з трохгадовым дзіцём з гэтага калгаснага доміка фактычна высяляюць на вуліцу, прычым у трохдзённы тэрмін. У гэтай сітуацыі, наколькі можна было зразумець, гаворка ішла пра службовае жыллё, якое некалі атрымаў муж заяўніцы, хоць сама жанчына так не лічыла. Сама яна да гаспадаркі ніякага дачынення не мела.

Што бывае далей у такіх выпадках? Атрымаўшы скаргу, супрацоўнік газеты мусіць, як правіла, напачатку звярнуцца па каментар ці тлумачэнне сітуацыі да прадстаўнікоў мясцовых органаў улады, арганізацый ці ўстаноў. У нашым выпадку мы звярнуліся да старшыні КСУПа: патэлефанавалі, назваліся і папрасілі даць афіцыйны адказ. Кіраўнік у гутарцы ўпэўнена назваў згаданы домік службовым жыллём, якое, як вядома, даецца работніку толькі на час працы, як у нашым выпадку, у КСУПе. Калі звольніўся — вызваляй жыллё. Тут ніякіх парушэнняў няма. Больш за тое, як старшыня сказаў далей, ніхто ў трохдзённы тэрмін высяляць людзей не збіраецца. Маўляў, сям'я можа яшчэ два месяцы карыстацца службовым жыллём. Гэта чытачцы паведаміла камісія ў складзе трох чалавек, якая наведала яе. Ды і побач жывуць шматлікія сваякі і мужа і жонкі, у якіх сям'я ў выпадку, як мы зноў жа зразумелі, вострай неабходнасці, магла спыніцца. Гэтая інфармацыя і была выкладзеная на старонках газеты. Што яшчэ трэба было дадаваць, калі кіраўнік гаспадаркі ўсё патлумачыў?

Аднак пасля выхаду публікацыі ў рэдакцыю зноў патэлефанавала заяўніца. Эмацыйна абвінаваціла рэдакцыю ў ананімнасці, а аўтара — у ... Зрэшты, пакінем гэта «па-за кадрам». А назаўтра на імя галоўнага рэдактара даслала тэрміновую тэлеграму, дзе назвала прыведзеную ў адказе інфармацыю скажэннем фактаў і запатрабавала правядзення журналісцкага расследавання. Гэтая тэлеграма сапраўды дала штуршок далейшаму высвятленню акалічнасцяў справы, тым больш што з кожным новым тэлефонным званком жанчыны (а іх потым было шмат) іх рабілася ўсё больш. Але напачатку пра ананімнасць. Ці трэба заўсёды называць на старонках газеты прозвішчы і адрасы бакоў канфлікту?

Гэтае пытанне трэба падзяліць на дзве часткі. Першая частка. Калі карэспандэнт газеты мусіць звяртацца, як было сказана вышэй, па тлумачэнні, афіцыйныя адказы ў органы мясцовай улады, у арганізацыі і ўстановы, каб дапамагчы чалавеку ў вырашэнні яго праблем, ён у большасці выпадкаў проста абавязаны называць прозвішча заяўніка. Таму што, па-першае, трэба ўстанавіць сам факт наяўнасці такога чалавека, па-другое, праверыць выкладзеную ім інфармацыю. Усе мы рознымі: і па ўзросце, і па ўзроўні адукацыі, і па прафесіі або спецыяльнасці, і па стажы працы, і... яшчэ па чым шмат. Іншымі словамі, задаючы канкрэтнае пытанне, нельга атрымаць агульны адказ. Таму і ўзнікае неабходнасць назваць прозвішча і адрас заяўнікаў, пра што мы апошніх заўсёды папярэджваем. Частка другая. Калі ўсе акалічнасці высветленыя, ці павінна гучаць імя чалавека ўжо са старонак газеты? Журналіст заўсёды павінен улічваць меркаванне заяўніка. Часам бывае так, што чалавек задаў зусім нейтральнае пытанне, ніякіх наступстваў для яго зварот мець не будзе, аднак заяўнік чамусьці ўпарта настойвае на сваёй ананімнасці. І мае на тое права — застацца невядомым для чытачоў (але не для работніка рэдакцыі). А бывае і так, што вырашаецца балючае (у маральным, этычным плане) пытанне для заяўніка, але ён не супраць, каб яго назвалі на старонках газеты. Нават калі чалавек і не супраць, менавіта журналіст прымае рашэнне — рабіць гэта ці не. Эмоцыі ў заяўніка суціхнуць, пройдзе час, а імя-прозвішча на газетнай паперы застанецца. Ці не пашкадуе ён потым пра тое?.. Выходзячы менавіта з гэтых меркаванняў прозвішча заяўніцы з Брагінскага раёна, а заадно і старшыні КСУПа не было названым у памянёным «Гарачым» тэлефоне». Аднак далей, як мы сказалі, падзеі набылі зусім іншы накірунак...

Пасля тэлеграмы чытачкі рэдакцыя была вымушана звярнуцца да **першага намесніка старшыні Брагінскага райвыканкама, начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Валянціна ХМЕЛЯНКІ** з просьбай правесці больш дэталёвую праверку скаргі заяўніцы наконт высялення з калгаснага дома сям'і. Тым больш што чытачка працягвала настойваць, што ён не меў статуса службовага, што на яго ўвогуле няма тэхпашпарта, што яны ўклалі вялікія сродкі ў рамонт некалі выдзеленай развалюхі... Праверкай займалася **галоўны спецыяліст па кадрах Ніна КАВАЛЕЦ,** якая асабіста наведала і нашу чытачку ў вёсцы Вуглы Брагінскага раёна.

Цяпер прыйшоў час назваць яе імя, тым больш што жанчына настойліва гэтага хацела. Звярталася ў рэдакцыю **прыёмшчыца КБА Наталля Уладзіміраўна ПІШЧУК.** Менавіта яе не па сваёй волі, як і іншых чытачоў, рэдакцыя ўвяла ў зман, за што прыносіць прабачэнні. **Імя дырэктара ордэна Леніна КСУП «Брагінскі»,** які і даў нам недакладную інфармацыю, — **Анатоль Іванавіч ХАДАСОК.** Чым ён кіраваўся, у нас высветліць не атрымалася: прынамсі, у другой палове мінулай пятніцы па стацыянарным тэлефоне, як нам паведамілі, яго не было, а на шматлікія званкі на мабільны ён не адказваў. Зараз у райвыканкаме сітуацыю вакол калгаснага доміка называюць асцярожнымі словамі: «быў не зусім кампетэнтным у гэтым пытанні», «спецыялісты, што адказваюць за пытанне, увялі яго ў зман».

Як высветлілася, згаданы домік сапраўды не з'яўляецца службовым жыллём. Прынамсі, дакументы наконт гэтага на момант падрыхтоўкі публікацыі ў гаспадарцы не знойдзены. Таксама было ўстаноўлена, што не было і ніякага дазволу на двухмесячнае пражыванне сям'і ў гэтым доме. Адзіны знойдзены дакумент, як паведаміла нам Ніна Кавалец, гэта адпраўленае поштай паведамленне аб неабходнасці вызваліць жыллё ў трохдзённы тэрмін... Пакуль вялася праверка выкладзенай Наталляй Пішчук інфармацыі, падчас нашых перамоў з Нінай Іванаўнай стала вядома: гаспадарка пакідае дом за сям'ёй. А на падставе якіх дакументаў, пацікавіліся мы? Калі і статус яго дакументальна як быццам бы нічым не пацверджаны, і тэхпашпарт, як настойвае Наталля Уладзіміраўна, адсутнічае?

... У панядзелак раніцай Ніна Кавалец, як мы загадзя і дамаўляліся, адправіла нам па факсе адзіны пакуль атрыманы ад дырэктара КСУП Анатоля Хадаска на імя першага намесніка старшыні Брагінскага райвыканкама Валянціна Хмелянка дакумент. Мае сэнс прывесці яго цалкам. «Ордэна Леніна КСУП «Брагінскі» паведамляе вам, што адміністрацыя КСУП «Брагінскі» прыняла рашэнне, улічваючы тое, што ў Пішчук Наталлі Уладзіміраўны маленькае дзіця, дом, у якім яны пражываюць па адрасе: вёска Вуглы, вуліца Гарына, пакінуць за Ігнаценкам Аляксандрам Сяргеевічам (мужам заяўніцы — **С.Р.**)». Подпіс, пячатка. Як неспецыялістам, нам падалося, што гэтая папера — не надта канкрэтная. Што значыць «пакінуць»? На час, назаўсёды, на якіх умовах?.. Словам, пытанні засталіся. Па просьбе рэдакцыі гэтая праблема да канчаткова яе вырашэння, як мы дамовіліся, застанецца на кантролі ў Брагінскага райвыканкама.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абзац

◢ У Мінску разглядаецца магчымасць увядзення платы за права ўезду транспартных сродкаў у цэнтральную частку сталіцы. Такая навацыя накіраваная на папаўненне гарадскога бюджэту. Прапаноўваецца таксама разгледзець пытанне рэалізацыі з аўкцыёну зямельных участкаў для размяшчэння рэкламы і збірання за рэкламную прастору штомесячнай платы.

◢ **Увоз партыі бананаў на суму Br54 млн з парушэннем патрабаванняў заканадаўства спынены супрацоўнікамі Віцебскай мытні ў Полацкім раёне. Садавіну вёз айчынны перавознік індывідуальнаму прадпрымальніку з Гродна. Адсутнічаў імпартны карантынны дазвол адпаведных органаў Беларусі на ўвоз. Партыя бананаў вагой каля 18 т затрыманая.**

◢ Факты фальсіфікацыі матэрыялаў супрацоўнікамі органаў унутраных спраў пры расследаванні крымінальных спраў, звязаных са злачынствамі ў сферы незаконнага абарачэння наркотыкаў, выяўленыя ў Віцебскай вобласці.

◢ **Нацыянальная авіякампанія «Белавія» пачала продаж авіябілетаў на новыя рэйсы з Мінска ў Стакгольм і Тэгеран, якія будуць выконвацца з 3 жніўня. Палёты ў Стакгольм будуць ажыццяўляцца тройчы на тыдзень па аўторках, серадах і пятніцах на самалёце CRJ-100/200 з прадастаўленнем двух класаў абслугоўвання: бізнэс і эканом. А палёты ў Тэгеран будуць выконвацца двойчы на тыдзень — па серадах і чацвяргах на самалёце Боінг-737/500.**

◢ Новы могільнік плануецца пабудаваць у наваколлях Мінска блізу вёскі Юзуфова да 2013 года.

◢ **ААТ «Дзіпрасувязь» распрацавала стандарт СТБ 1629 «Каналы і тракты гукавога вяшчання. Асноўныя параметры і метады вымярэнняў». Новы стандарт зацверджаны пастановай Дзяржстандарта Беларусі і ўвойдзе ў дзеянне з 1 жніўня 2010 года. Ён у тым ліку вызначае дапушчальныя ўзроўні сігналаў гукавога суправаджэння пры перадачы рэкламнага блока тэлевізійнай праграмы.**

◢ У Гомельскай вобласці з пачатку чэрвеня выяўлена 72 буйныя пасевы дзікарослых канопляў і нязначныя пасевы маку. За 20 дзён супрацоўнікі міліцыі знішчылі больш за 17 тон раслінаў наркасыравіны на плошчы каля 5,6 га. Найбольшыя зараснікі дурман-травы выяўлены на тэрыторыі зоны адсялення ў Брагінскім, Чачэрскім, Веткаўскім і іншых раёнах вобласці.

◢ **На ўскраіне крымскага горада Джанкой невядомы мужчына ўчора забіў пяцігадовага хлопчыка, які гуляў у пясочніцы ля дома. Паўз дзяцей, якія гулялі ля дома, праходзіў мужчына. Чалавек спыніўся і, звярнуўшыся да хлопчыка, прапанаваў яму паглядзець на прыгожую птушачку, якая нібы пралятала ў небе. Калі дзіця падняло галаву, незнаёмец нанёс яму ўдар вострым прадметам у шыю і сышоў. Падазраецца мужчына 1983 года нараджэння, якога затрымалі.**

Поўны абзац

◢ Рух хуткасных цягнікоў паміж Берлінам і Гановерам быў перарваны з-за крадзяжу правадоў. Зладзеі зрэзалі каля 800 метраў паветранай кантактнай сеткі. Правады паветранай кантактнай сеткі хуткасных цягнікоў карыстаюцца папулярнасцю ў зладзеяў з-за вялікага ўтрымання медзі. А за 100 кілаграмаў медзі можна выручыць больш за 500 еўра. У большасці выпадкаў каляровыя металы збываюць гандлярам металаломам, якія часта і не падазраюць, што набываюць крадзенае. Метал, як правіла, прадаецца невялікімі партыямі.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРЭЗІДЭНТА ПОЛЬШЧЫ ВЫБЕРУЦЬ У ДРУГІМ ТУРЫ

Маршал сойма Польшчы Браніславаў Камароўскі і старшыня партыі «Закон і справядлівасць» Яраслаў Качыньскі выйшлі ў другі тур прэзідэнцкіх выбараў. Паводле звестак Нацыянальнай выбарчай камісіі Польшчы, разрыў паміж двума галоўнымі прэтэндэнтамі на пост прэзідэнта склаў 4,5 % на карысць Камароўскага.

Падчас першага тура, які адбыўся 20 чэрвеня, за маршала сойма і выканаўцу абавязкаў прэзідэнта Польшчы Камароўскага прагаласавалі 41,22 % выбаршчыкаў. Яго асноўнага канкурэнта Яраслава Качыньскага падтрымалі 36,74 % жыхароў Польшчы. Трэцяе месца па выніках нядзельнага галасавання заняў кандыдат ад левай апазіцыі Гжэгаж Наперальскі. Яго падтрымалі 13,68 % выбаршчыкаў. За кожнага з астатніх семярых кандыдатаў прагаласавалі не больш за 2,5 %. У суме іх падтрымалі 8,36 % палякаў. Яўка на выбарах склала 54,85 %.

НЕМЦАЎ БУДУЦЬ ПАЗБАЎЛЯЦЬ ПРАВОЎ КІРОЎЦЫ

Улады Германіі маюць намер у будучыні пазбаўляць правоў кіроўцы за такія злачынствы, як крадзеж ці нанясенне цялесных пашкоджанняў.

Як адзначыў у гэтай сувязі міністр юстыцыі Саксоніі Бернд Бухолц, у Германіі налічваецца мноства правапарушальнікаў, для якіх турэмнае зняволенне з'яўляецца занадта цвёрдай, а грашовы штраф, наадварот, занадта мяккай мерай пакарання. Часовае пазбаўленне правоў на кіраванне транспартным сродкам, па словах Буземана, такім чынам, стане адначасова супамерным і вельмі дзейсным пакараннем, паколькі пазбаўленне такой важнай для сучаснага грамадства магчымасці перамяшчацца на ўласным аўтамабілі ў нейкай ступені ідэнтычнае пазбаўленню волі. У нашых правоў кіроўцы ў Германіі пазбаўляюць толькі ў выпадку злоснага парушэння ПДР.

ЧАЛАВЕЦТВУ ЗАСТАЛОСЯ 100 ГАДОЎ?

Праз 100 гадоў — да 2110 года — чалавецтва цалкам знікне з твару зямлі, сцвярджае вядомы аўстралійскі вучоны Франк Фенер. Паводле яго меркаванняў, асноўная пагроза існавання людзей — «нястрымнае спажыванне, рэзкі рост колькасці насельніцтва Зямлі, хуткая змена клімату ў сувязі з глабальным пацяпленнем».

«Старажытныя грамадствы людзей адрозніваліся павышанай стабільнасцю, а сённяшняя глабальная цывілізацыя — не», — прыводзіць пункт гледжання навукоўца лонданская прэса. «Прамысловая рэвалюцыя і індустрыялізацыя спарадзілі эпоху, якая па сваім уздзеянні на планету параўнальная з наступствамі ледавіковага перыяду ці сутыкнення Зямлі з буйной каметай», — заявіў Фенер. У 80-я гады мінулага стагоддзя 95-гадовы Фенер атрымаў сусветную вядомасць за працы ў галіне мікрабіялогіі. Ён быў адным з вучоных, якія спынілі эпідэмію воспы.

Мінэканомікі пагаварыла з прадпрымальнікамі пра рэалізацыю беларускіх тавараў

ДЭПАРТАМЕНТ па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі правёў «круглы стол» наконт таго, як далей стымуляваць суб'екты малога прадпрымальніцтва да рэалізацыі беларускай прадукцыі. Найперш — пра стварэнне дзяржаўным аб'яднаннем «Белрэсурсы» дзелавога гандлёвага цэнтра амаль у цэнтры Мінску, дзе будуць адкрытыя прадстаўніцтвы рэгіянальных беларускіх прадпрыемстваў і дзе прадпрымальнікі змогуць набыць тавары айчыннай вытворчасці.

— Цэнтр у першую чаргу аказваў бы паслугі па прасоўванні тавараў рэгіянальным прадпрыемствам краіны, што не маюць збытавых арганізацый у Мінску, — расказвае **Юры СМАРОДСКІ, намеснік генеральнага дырэктара ДА «Белрэсурсы».** — Такая канцэпцыя знайшла падтрымку ва ўрадзе.

Так, па словах Юрыя Іванавіча, пад дзелавы гандлёвы цэнтр будзе выдзелены першы і другі паверхі будынка па вуліцы Казінца, а таксама складскія памяшканні, якія да яго прымыкаюць:

— Гэта будзе знаходзіцца ў дзелавым цэнтры горада, побач з аэрапортам «Мінск-1», дзе плануюць будаваць дзелавы цэнтр «Мінск-Сіці». Ёсць пад'язныя шляхі, чыгунка, другі паверх агульнай плошчай 1,5 тыс кв. м. фактычна гатовы для размяшчэння прадстаўніцтваў беларускіх прадпрыемстваў, на першым паверсе плануем зрабіць залу прэзентацый, новых узораў прадукцыі, а таксама размясціць лагістычныя, транспартныя і экспедыцыйныя арганізацыі, пункт мытнага афармлення, касава-разліковы цэнтр, абменны пункт.

Калі новы дзелавы цэнтр пачне працаваць, Юры Смародскі пакуль не ведае, бо зараз вырашаюцца пытанні па перадачы ДА «Белрэсурсы» сумежных тэрыторый, аднак ён адзначыў, што ўжо каля 20 заявак на размяшчэнне сваіх прадстаўніцтваў ад беларускіх прадпрыемстваў яны атрымалі: у прыватнасці, зацікаўленасць праявілі лідская «Лакафарба», бабруйская «Белшына», Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод, салігорская «Купалінка» і шэраг прадпрыемстваў мяса-малочнай прамысловасці.

Юры Смародскі выказаў спадзяванне, што стварэнне дзелавога гандлёвага цэнтра будзе паспяховым праектам, бо ўсе паслугі будуць прапаноўвацца больш цывілізавана, чым, напрыклад, на арганізаванай увосень 2009 года гандлёвай пляцоўцы на Мінскім аптовым рынку. Але разам з тым ён папрасіў прадстаўнікоў ад бізнэсу, каб тыя трымалі зваротную сувязь і расказалі, прадстаўніцтвы якіх айчынных прадпрыемстваў яны б хацелі бачыць на плошчах новага дзелавога гандлёвага цэнтра.

Наступным пытаннем для абмеркавання за круглым сталом стала ініцыятыва Мінэканомікі па стварэнні ўмоў для рэалізацыі прадпрымальнікамі беларускіх тавараў у сельскай мясцовасці і санаторна-курортных зонах. Як адзначыў **Аляксандр ЛІХАЧЭЎСКІ, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі,** цікавасць да такога праекта ёсць і ў насельніцтва, і ў прадпрымальнікаў.

Аляксандр КАЛІНІН, старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў, падкрэсліў, што зараз усё гэта ўпіраецца ў складанасць узгаднення на мясцовым узроўні:

— Ахвотнікі гандляваць ёсць, але трэба, каб былі дакладна ўказаныя мясцовымі ўладамі месцы для гандлю без усялякага дадатковага ўзгаднення. Магчыма, нават праведзены аўкцыёны, каб, скажам, было дакладна зразумела, што чалавек на 5 гадоў атрымаў права тут гандляваць і мае нейкія пэўныя перспектывы. Патрэбны нейкі агульны дакумент з дакладнымі нормамі, тады, напэўна, працэс пойдзе.

Што тычыцца экспартнай дзейнасці малога бізнэсу ў дачыненні да беларускіх тавараў, то Аляксандр Ліхачэўскі выказаў пажаданне, каб колькасць выязных выстаў-кірмашоў па продажы беларускіх тавараў за мяжой была большая. Аднак **Генадзь ЧАМЕРКА, начальнік аддзела знешнеэканамічнага супрацоўніцтва Беларускай гандлёва-прамысловай палаты,** лічыць, што бясконца павялічваць колькасць выстаў-кірмашоў складана:

— Вось канкрэтны прыклад са Псковам: у нас ёсць там магчымасць праводзіць болей выстаў, але наткнуліся на перашкоду ў выглядзе адміністрацыйных рэсурсаў з боку адміністрацыі горада Пскова, — кажа Генадзь Чамерка. — Пэўныя праблемы існуюць, і, напэўна, да бясконцасці павялічваць колькасць выстаў-кірмашоў таксама немагчыма.

Разам з тым, самі прадпрымальнікі прызнаюць, што выязныя выставы-кірмашы з'яўляюцца добрым стартам для самастойнай прадпрымальніцкай дзейнасці па экспарце:

— У чым прывабнасць выстаў-кірмашоў? У тым, што гэта найбольш эфектыўны механізм уваходжання новых беларускіх прадпрымальнікаў у тэму эксперту, — лічыць Аляксандр Калінін. — Бо калі прадпрымальнік едзе самастойна, то бываюць розныя выпадкі — вунь у Маскве некалькі палатак спалілі канкурэнты. А калі нявопытным прадпрымальнікам даюць добрыя ўмовы, калі і пляцоўка падрыхтавана, і ахоўваецца, то ў прадпрымальніка з'яўляецца інтарэс і да другой, і да трэцяй паездкі. Таму ў нас ёсць просьба інтэнсіфікаваць пытанне наконт пашырэння геаграфіі выязных кірмашоў.

Згодны з гэтым і **Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў:**

— Наш вопыт кажа пра тое, што 2-3 паездкі — гэта інкубатар: праехаць па рэгіёне, пазнаёміцца з асабівасцямі, паглядзець, чаго не хапае на мясцовым рынку, зазірнуць ва ўнівермагі, завесці партнёрскія сувязі і гэтак далей. І потым ён ужо можа ініцыяваць экспарт іншых тавараў, якія будуць запатрабаваныя на тым рынку.

Аляксандр Ліхачэўскі таксама дадаў, што ў Мінэканомікі, мяркуюць, рэзервы для гэтага ёсць, у прыватнасці, ён папрасіў арганізатараў выстаў-кірмашоў праводзіць такія мерапрыемствы не толькі ў вясенне-летне-асенні перыяд, але і зімой на закрытых пляцоўках.

Уладзімір Карагін таксама засяродзіў увагу прысутных на тым, што трэба ўсё ж дазволіць ІП наймаць працаўнікоў не са сваёй сям'і, каб яны маглі і тут на гандлёвым пункце некага пакінуць, і на экспарт касьці адправіць, а таксама выказаў падтрымку наконт намечанай пралангацыі 477-га Указа Прэзідэнта аб ільготных умовах для ІП-экспарцёраў. Разам з тым Уладзімір Мікалаевіч папрасіў Дэпартамент па прадпрымальніцтве Мінэканомікі разглядзець таксама магчымасць па стварэнні ільготных умоў не толькі для ІП, але і для іншых суб'ектаў малога бізнэсу, што хочуць заняцца экспартам беларускіх тавараў:

— Паколькі існуе вялікая таварная маса, то трэба распаўсюдзіць ільготныя ўмовы і на іншыя суб'екты малога прадпрымальніцтва, я мяркую, яны б змаглі ў большай ступені паўдзельнічаць у экспарце нават і па-за межамі выязных выстаў-кірмашоў. Зараз трэба даць штуршок, магчыма, праз год-два такая неабходнасць адпадзе і можна будзе працаваць па нармальнай схеме, але зараз гэта трэба зрабіць не адкладаючы.

Таксама на «круглым стале» абмеркавалі прасоўванне беларускіх тавараў праз інтэрнэт — у прыватнасці, Аляксандр Ліхачэўскі паведаміў, што зараз пытанні маніторынгу сайтаў прадпрыемстваў-вытворцаў зводзяцца да таго, каб сачыць за актуальнасцю інфармацыі, а раней гаворка ішла наогул пра адсутнасць такіх сайтаў...

Павел БЕРАСНЕЎ.

Выбары ў Польшчы АБЫШЛОСЯ БЕЗ СЮРПРЫЗАЎ

Спікер польскага парламента — Сойма, выканаўца абавязкаў прэзідэнта Польшчы Браніслаў Камароўскі лідзіруе ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў.

Другі вынік у Яраслава Качыньскага, роднага брата прэзідэнта Леха Качыньскага, які 10 красавіка трагічна загінуў у авіякатастрофе пад Смаленскам. На трэцім месцы апынуўся самы малады кандыдат — 36-гадовы кіраўнік Саюза дэмакратычных левых сіл Гжэгаж Наперальскі. Вынікі ўвогуле прагназуемыя і загадзя прадказваліся многімі палітолагамі і аналітыкамі. Астатнія сем кандыдатаў не набралі вартай увагі колькасці галасоў.

Уся цяперашняя (пятая) у найноўшай гісторыі краіны выбарчая прэзідэнцкая кампанія прайшла пад знакам трагедыі. Пасля яе і былі прызначаныя датэрміновыя выбары прэзідэнта ў Польшчы. Многія назіральнікі, як у краіне, так і за яе межамі, рост папулярнасці Яраслава Качыньскага (у іншых абставінах ён не мог нават і разлічваць на больш-менш значны працэнт галасоў) звязваюць з наступствамі трагедыі пад Смаленскам. Значная частка электарату пачала глядзець на Яраслава Качыньскага іншымі вачыма. І відаць, убачыла ў ім прадаўжальніка спраў брата, а таму прагаласавала на яго карысць.

Бяда не прыйшла ў краіну адна. Польшча моцна пацярпела ад удару стыхіі. Шмат рэгіёнаў, у тым ліку і сталіца, панесла велізарныя страты ад вялікай паводкі. Далёка не ўсюды вада сышла. У дзень выбараў для адрэзаных паводкай ад «вялікай зямлі» мясцовых жыхароў улады пастараліся забяспечыць спецыяльным транспартам. Так, у горадзе Сандомеж выбаршчыкі трох вуліц, якія дагэтуль застаюцца пад вадой, на ўчасткі для галасавання дабраліся ў лодках.

Па папярэдніх звестках, прэзідэнцкія выбары ў Польшчы прайшлі ўвогуле спакойна. У 6 гадзін раніцы ва ўсёй краіне адчынілася больш за 25 тысяч выбарчых участкаў, адкуль трывожных сігналаў аб сур'ёзных парушэннях, правакацыях ці яшчэ нейкіх вартых увагі непрыемнасцях не паступала, паведаміла Дзяржаўная выбарчая камісія. Праўда, напярэдадні ў так званы «дзень цішыні» асобныя гарачыя прыхільнікі свайго кандыдата зрывалі плакаты канкурэнтаў, распаўсюджвалі лістоўкі, заклікалі галасаваць выключнага «за яго».

Хутка стануць вядомыя канчатковыя вынікі галасавання. А пакуль па звестках польскіх СМІ, Камароўскі набраў больш галасоў на захадзе краіны і ў Гданьску, а Качыньскі — на ўсходзе. У другім туры, які пройдзе 4 ліпеня, пераможцу вызначыць элементарная арыфметычная большасць адданых за яго галасоў.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

АНГЛІЯ І ІТАЛІЯ МОГУЦЬ ВЫЛЕЦЕЦЬ З ЧЭМПІЯНАТУ

На чэмпіянаце свету ў ПАР зборная Англіі згуляла ўнічыю з камандай Алжыра — 0:0. Такім чынам, зборная Англіі, якая на пачатку турніру з'яўлялася адным з фаварытаў, у двух стартавых матчах набрала ўсяго два ачкі.

Зборная Італіі таксама правяла другі невыразны матч. Дзейныя чэмпіёны свету не справіліся з камандай Новай Зеландыі. Новазеландцы адкрылі лік ужо на сёмай хвіліне сустрэчы, а праз 22 хвіліны зборная Італіі адыгралася дзякуючы спрэчнаму пенальці.

Затое каманда Галандыі атрымала другую перамогу — на гэты раз над зборнай Японіі: адзіны гол на 53-й хвіліне гульні забіў Вэслі Снайдэр. Галандцы выйшлі ў лідары групы Е з 6 ачкамі. А дзякуючы перамозе Даніі над Камерунам (2:1) і ўвогуле забяспечылі сабе месца ў 1/8. Датчане ж пазбавілі камерунцаў шанцаў на выхад у плэй-оф.

Зборная Ганы згуляла ўнічыю з камандай Аўстраліі (1:1) і выйшла на першае месца ў групе D, на другім месцы з трыма ачкамі зборная Германіі. А каманда Парагвая перамагла славакаў з лікам 2:0 і таксама выйшла ў лідары групы F.

Відовішчным і драматычным быў матч паміж камандамі Бразіліі і Кот-д'Івуара. Гледачы ўбачылі чатыры галы і адно выдаленне. Нягледзячы на ўсе намаганні афрыканцаў, і на тое, што напрыканцы матча лацінаамерыканцы засталіся ўдзесяцёх, зборная Бразіліі перамагла з лікам 3:1.

Тым часам галоўны трэнер зборнай Бразіліі Дунга назваў абсалютна несправядлівым выдаленне лідара сваёй каманды Кака. Першую жоўтую картку Кака атрымаў за штуршок Турэ, а другое — на 88-й хвіліне, калі ў гульнявым эпізодзе ўдарыў локцем у грудзі Кейта. Цяпер Кака прапусціць апошні матч групавога турніру з Партугаліяй.

СКАНДАЛЫ ЎЗРУШВАЮЦЬ ЗБОРНУЮ ФРАНЦЫІ

Скандалу, падобнага таму, які ўзняўся на мундыялі, футбольны свет не бачыў даўно. Нікаля Анэлька, які пакуль ніяк не праявіў сябе на палях ПАР-2010, творыць сенсацыі па-за газонам. У перапынку правальнага матча са зборнай Мексікі французскі нападаючы ў адказ на крытыку з боку трэнера «трохкаляровых» Раймона Даменека паказаў сябе з вельмі непрывабнага боку.

Рыхтуючы каманду да другога тайму, Даменек сказаў, што Анэлька грэбуе працай у абароне, за што прыгразіў яму пасадзіць на лаўку запасных. Замест таго, каб прыслухацца да рэкамендацый настаўніка, гулец «Чэлсі» ў прысутнасці ўсёй зборнай выдаў фразу, якая на літаратурную мову не перакладаецца. Анэлька быў выключаны з каманды, паколькі ён адмовіўся папрасіць прабачэння за свае дзеянні.

Сітуацыя атрымала развіццё ў нядзелю, 20 чэрвеня. Зборная Францыі ў знак пратэсту супраць адлічэння Анэлька адмовілася трэніравацца. Не абышлося і без адставак. Спартыўны дырэктар зборнай Францыі Жан-Луі Валентэн заявіў, што пакідае сваю пасаду.

Прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі палічыў патрэбным вырашыць канфлікт, які разгарэўся ў зборнай. Ён звярнуўся ў просьбай да міністра спорту краіны Разелін Башэло, каб той правёў сустрэчу з капітанам каманды Патрысам Эвра, трэнерам Раймонам Даменекам і прэзідэнтам федэрацыі футбола Францыі Жан-П'ерам Эскалетам.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

ДВУМА РАДКАМІ

Учора ўдзень у групе G зборная Партугаліі разграміла каманду КНДР з лікам 7:0, а ў групе Н зборная Чылі адолела каманду Гандураса — 1:0.

«ПАРТЫЗАН» НЕ ПАЗНАЦЬ

На чэмпіянаце Беларусі па футболе сярод камандаў вышэйшай лігі прайшлі матчы 15-га тура. Пасля халоднага душа, якім для БАТЭ стаў матч з «Мінскам», барысаўчане без праблем расправіліся з гродзенскім «Нёманам» — 5:0. Дубль на рахунку Арцёма Канцавога, па разе вызначыліся Віталь Радзівонаў, Арцём Радзькоў і Аляксандр Алумона. Працягнулі пераможную серыю і сталічныя дынамаўцы. З лікам 2:0 у гасцях яны перамаглі навапалацкі «Нафтан». Дубль афарміў Аляксандр Сазанкоў. Не пазнаць у другім крузе сталічны «Партызан» — каманда атрымала друг

Шануй Зямлю

КАБ НЕ ГАРЭЛА ГЛЕБА ПАД НАГАМІ

Эколагі, батанікі і заолагі заклікаюць хутчэй аддаваць даўгі нашай Зямлі-матухне. З гэтай нагоды групе журналістаў з рэспубліканскіх СМІ прадэманстравалі на прыкладзе балота Шчэрбінскі мох у Дубровенскім раёне, як у выніку паўторнага забалочвання выпрацаваных тарфянікаў і бяздумна асушаных і закінутых балот адраджаецца знявечаная прырода.

Насуперак сівым легендам

Тут, на ўскрайку балота Шчэрбінскі мох, чамусьці прыйшла думка: як паступова мяняюцца былыя стэрэатыпы! Стагоддзямі балота лічыліся ў прамым і пераносным сэнсе гіблым, вельмі сумнеўным месцам для жыцця чалавека. Адтуль, лічылася, пастаянна зыходзіла прамая ці схаваная пагроза, часам смяротная. У казках усялякая нечысць чамусьці насяляла балоты. А давайце прыгадаем знакамітыя літаратурныя творы на гэтую тэму. Напрыклад, у слынным дэтэктыве сэра Артура Конан Дойля «Сабака Баскервіляў» жудасныя падзеі разгортваюцца на балотах.

У беларускай літаратуры таксама досыць шмат прыкладаў выкарыстання змрочнага балотнага фону для надання загадкавасці, напружання і трывожнай таямнічасці. У творы Уладзіміра Караткевіча аб жыхарах беларускага Палесся канца XIX стагоддзя «Дзікае паляванне караля Стаха» зламыснікі задумалі звесці ў магілу маладую і знатную прыгажуню, апошнюю прадстаўніцу збяднелага старадаўняга дваранскага роду. Відаць, так і здарылася б, каб не дапамога маладога і таксама прыгожага этнографа, які паралельна з вывучэннем народных былін разгадаў страшную тайну навакольных балот. А ёсць яшчэ «Дрыгва» Якуба Коласа... Ды і ў рускай класічнай літаратуры дасталася балотам, шмат сюжэтаў на тэму чалавечых страсцяў на балотным фоне ў фальклоры, паэзіі і прозе іншых народаў.

Але новыя часы, новыя веды пра экалогію Зямлі амаль кардынальна змянілі погляды на сутнасць і ролю балот у планетарным маштабе. Я разам з калегамі на ўскрайку Шчэрбінскага моху слухаю людзей літаральна ўлюбёных у спецыфічную балотную прыгажосць. Ім бы паэмы пісаць пра балота, так яны натхнёна і ўзнёсла казалі пра іх. Яны (а гэта навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Аркадзь Скуратовіч, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Вячаслаў Раковіч, эксперт па гідраінжынерыі Аляксей Васільеўскі, эколаг-балотазнаўца з Германіі Анет Цьеле, Джэк Фоксэл — прадстаўнік Каралеўскага таварыства аховы птушак з Вялікабрытаніі і іншыя) прыехалі разам з намі на Шчэрбінскі мох і ўзялі на сябе ролю экскурсаводаў і кансультантаў. Так што далейшы наш расказ пра балоты — гэта квінтэсенцыя іх захапляльных аповедаў.

Адзіны паратунак — вада

Нашы суразмоўцы агучылі шмат слушных прычын на карысць вяртання забалочаных балот у першародны стан. Але спынімся на некалькіх, на мой погляд, галоўных. І самая відавочная прычына — так бы мовіць, на ўсе 100 працэнтаў — супрацьпажарная. Час ад часу пэўныя рэгіёны Беларусі, асабліва калі ўсталюецца спякота, пакутуюць ад чорна-вогненнай бяды — тарфяных пажараў. А ратавацца ад гэтай навалы, аказваецца, проста — трэба зноў заліць вадой выпрацаванае тарфяное радовішча. Толькі зрабіць гэта даволі няпроста.

Шчэрбінскі мох — таксама выпрацаванае радовішча. І ў гэтым яго небяспека. Пажары тут здараліся неаднойчы. Часта шматлікія буйныя пажары ў лясах і потым нават населеных пунктах пачынаюцца з узгарання на выпрацаваных тарфянішчах або балотах. Тарфяныя пажары адбываюцца штогод, асабліва ў засушлівыя летнія месяцы. І тады для пажарных пачынаецца сапраўды пякельная работа.

Начальнік Дубровенскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр Юрчанка рознае пабачыў на балотах. Але гарачае лета 2002 года запомнілася яму асабліва. Тады гарэла больш за 1000 гектараў тарфяных масіваў. На ахопленай густым едкім дымам тэрыторыі было ўведзена надзвычайнае становішча, бо ўзнікла пагроза знішчэння шэрагу населеных пунктаў. Фактычна ўжо ішла размова пра тэрміновую эвакуацыю насельніцтва, бо сілаў і сродкаў для тушэння такога вялікага пажару не хапала. Але на дапамогу прыйшлі пажарнікі вобласці і краіны, ваенныя, рабочыя прамысловых прадпрыемстваў. Паступова, праз сем сутак удалося паставіць надзейную заслону полымю. А потым на працягу, звярніце ўвагу, двух месяцаў ішла планамерная ліквідацыя пажару. І толькі дажджы дапамаглі паставіць канчатковую кропку ў гэтай гісторыі.

— Самае страшнае ў тарфяных пажарах — іх здольнасць хавацца ў сярэдзіне радовішча. На паверхні агню не бачна, а тым часам выгараюць вялікія ўчасткі торфу глыбінёй да паўтара метраў. Здаецца, патушылі нарэшце небяспечны ачаг, а полымя раптоўна ўзнікае ў іншым месцы. І ўсё трэба пачынаць зноў, — гаворыць Аляксандр Юрчанка.

Па звестках Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, штогод колькасць тарфяных пажараў у Беларусі складае ад 2,5 да 8 тысяч — у залежнасці ад надвор'я. У сярэднім штогод адбываецца больш за 4200 тарфяных пажараў.

Ён на сабе выпрабаваў усе цяжкасці барацьбы з полымем на асушаных ці, кажучы навукавай мовай, балотах з парушаным гідралагічным рэжымам. Адзіны паратунак ад тарфяных пажараў — вада. І не тая, што ў пажарных машынах, а менавіта балотная вільгаць, якая раней панавала на прасцягах асушаных балот. Інакш кажучы, аднаўленне былога гідралагічнага рэжыму.

Так, правільна кажуць, што часта прычына ўзнікнення тарфяных пажараў — чалавечы фактар: акурак цыгарэты, незатушанае да канца вогнішча, кінутая запалка рыбакоў, збіральнікаў ягад, грыбнікоў. Але нярэдка на асушаных балотах здараюцца самазапальванні, якія выкліканы іншымі факторамі. Бязлітаснае полымя — не адзінае негатыўнае наступства тарфяных пажараў. Ад іх шматразова павялічваецца радыяцыйны фон на забруджаных тэрыторыях. А пра гэтае негатыўнае ўздзеянне тарфяных пажараў ведаюць далёка не ўсе.

Пераборлівы муханос

Амаль дзень блукалі мы па балоце Шчэрбінскі мох, які некалі быў адной з сыравінных баз раней вядомага прадпрыемства «Асінторф». Убачылі розныя стадыі складанай работы па паўторным забалочванні. Працэс гэты патрабуе часу, цярпення і, вядома, грошай. Дарэчы, значныя сумы на аднаўленне балота выдаткавалі ААН і Глабальны экалагічны фонд у рамках міжнароднага праекта па рэнатуралізацыі балот, папярэджанні дэградацыі зямель і захаванню глабальна значнай біяразнастайнасці. А пагроза дэградацыі захоўваецца. Пэўныя ўчасткі былога радовішча нагадвалі натуру да вядомага фільма савецкіх часоў «Сталкер» — так усё вакол было змрочна і неаптымістычна, што хацелася хутчэй адсюль несці ногі. Некалі на балоце быў брыкетны завод. Ад яго засталіся разбураныя і зарослыя хмызнякамі рэшткі вытворчых памяшканняў. Асабліва ўражвалі тыя ўчасткі балота, якія два гады назад выбылі з эксплуатацыі — велізарныя брудныя чорныя плямы.

Аднак акрамя іх мы ўбачылі і прама супрацьлеглыя пейзажы. Сёння цяжка паверыць у тое, што некалі так жахліва выглядалі ўчасткі Шчэрбінскага моху, якія прайшлі рэабілітацыю: ужо зялёныя, поўныя птушынага гоману, слядоў звяроў. Тут нават шырока распаўсюдзіўся муханос альпійскі — расліна, якая занесена ў Чырвоную кнігу. Між іншым, гэты муханос — расліна пераборлівая, расце толькі ў Германіі і Францыі, а цяпер вось пасялілася ў Беларусі. Сваю нішу ў нас знайшоў і такі цікавы від як святаяннік вялікі паўночнаамерыканскі. Рысь еўрапейская, барсук і буры мядзведзь жывуць цяпер на паўторна забалочаных тэрыторыях. Дадайце сюды 7 відаў ахоўных птушак, сярод якіх малы падорлік, вялікі бугай, белая чапля, вялікі ўліт. Таксама жывуць тут 6 відаў ахоўных насякомых. І гэта пры тым, што працэс паўторнага забалочвання яшчэ не завяршыўся канчаткова.

Чаму нашы балоты называюць «лёгкімі Еўропы»?

Тут самы час нагадаць, што ў прыродзе балоты выконваюць разнастайныя і спецыфічныя функцыі. Аказваецца, балоты выконваюць свае біясферныя функцыі яшчэ да з'яўлення чалавека на Зямлі і працягваюць іх выконваць дагэтуль. Яны, як прадукт эвалюцыі біясферы і яе неад'емная частка, аказваюць вялікі ўплыў на шматлікія біясферныя працэсы. Балоты валодаюць уласцівасцю змякчаць ваганні тэмпературы і вільготнасці паветра як на самім балотах, так і на прылеглых тэрыторыях. Дзякуючы гэтаму там менш кароткачасовых засух, вясновых і восеньскіх замаразкаў.

Важная і акумулятыўная функцыя балот. Бо толькі там і нідзе больш утвараецца і назапашваецца торф — карысны беларускі выкапень. Гідралагічная функцыя балот заключаецца ў падтрыманні воднага рэжыму. Асушванне балот, асабліва поймавага залягання, спрыяе паніжэнню ўзроўняў грунтавых водаў на прылеглых тэрыторыях, вядзе да абмялення азёраў і рэк. Геахімічная функцыя дазваляе акумуляваць у балотах розныя хімічныя элементы, якія трапляюць туды з атмасфернымі ападкамі, пылам, паводкавымі і падземнымі водамі. Торф — выдатны сарбент розных металаў, а таксама іонаў амонія. Вядомыя шматлікія радовішчы мергеля, вапнавых туфаў, фасфатаў, жалезных руд, урану і германію, якія сфарміраваліся дзякуючы тарфяным радовішчам. Яны, у сваю чаргу, уяўляюць сабой магутны геахімічны бар'ер на шляху міграцыі элементаў з прыроднымі водамі.

Рэсурса-сыравінная функцыя балот у масавай свядомасці ўспрымаецца пакуль даволі прымітыўна — выключна як запасы для паліва торфу і драўніны, вытворчасці ўгнаенняў. А балоты яшчэ і каштоўная крыніца сыравіны для хімічнай перапрацоўкі, збору лекавых раслін, ягад, грыбоў, нарыхтоўцы лячэбнай тарфяной гразі. Усё часцей балоты становяцца месцамі актыўнага адпачынку людзей: палявання, турызму, экалагічнай адукацыі і навуковых даследаванняў.

Чаму беларускія балоты часта называюць «лёгкімі Еўропы»? Вучоныя тлумачаць гэта здольнасцю балотнай расліннасці шляхам фотасінтэзу выводзіць вуглякіслы газ з атмасферы, звязваць яго ў арганічнае рэчыва, якое пасля адмірання раслін трансфармуецца ў торф. Ён жа ў залежнасці ад геалагічных умоў ператвараецца ў буры і каменны вугаль. Гэта значыць, што балоты здольныя выводзіць з атмасферы вуглякіслы газ і не вяртаць яго назад. Замест вуглякіслага газу ў атмасферу вылучаецца эквівалентная колькасць кісларoду. А вось лес і лугі, аказваецца, вяртаюць вуглякіслы газ у атмасферу цалкам пасля мінералізацыі арганічнага рэчыва адмерлых раслін.

Калі аднаўляецца балота, то адначасова аднаўляецца і рэсурс балотнай экасістэмы. А яшчэ паўторнае забалочванне дазваляе закансерваваць не да канца выкарыстаныя багацці тарфяных радовішчаў, пазбавіць іх ад мінералізацыі — акіслення, распаду на больш простыя элементы. А так пад вадой торф будзе захоўвацца столькі часу, колькі трэба. Разам з торфам у балотах адбываецца назапашванне вады, біягенных элементаў і энергіі.

Зямля наша багатая на балоты, у тым ліку і на тарфяныя, на іншыя тыпы водна-балотных угоддзяў. Але мы доўгі час грэбавалі гэтым багаццем.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Віцебская вобласць.



Памятай сваё!

ПАБАЧ ГРУНВАЛЬД У НАВАГРУДКУ!

26 і 27 чэрвеня адбудзецца святкаванне 600-годдзя Грунвальдскай бітвы і V фестываль сярэднявечнай культуры «Навагрудскі замак-2010» у Навагрудку

Фестываль абяцае быць незабыўным, аднак рыхтуе не толькі забавы і відовішчы, але і «сюрпрызы». На жаль, не вельмі прыемныя для тых, хто своечасова да іх не падрыхтаваўся і не прадугледзеў. Таму, каб некаторыя моманты не сталі нечаканасцю, пра іх трэба ведаць... А таксама пра тое, як вырашаюць арганізатары свята няпростыя пытанні камфорту, і інтрыгі Навагрудка: што замоўчвае Нацыянальны гістарычны музей?

Перагортваючы старонкі гісторыі...

Гістарычная бітва, у якой харугвы ВКЛ і Польскага каралеўства разгромілі Тэўтонскі ордэн, з'яўляецца для нашых краін сімвалам незалежнасці. У гэтай бітве нашы продкі паказалі воінскае майстэрства, мужнасць, адданасць агульнай перамозе. Але перамогу аб'яднанаму войску Вялікага княства Літоўскага і Кароны Польскай прынеслі не толькі доблесць і зброя, але, як лічыў польскі кароль Уладзіслаў Ягайла, і «воля літасцівага Бога», да якога ён звяртаўся з гарачай малітвай падчас бітвы, і па волі якога «праявіў усялякую літасць да пераможаных». Пасля паражэння нямецкія рыцары больш не ўяўлялі ваеннай пагрозы для Літвы, Польшчы і суседніх дзяржаў, і на працягу пяці наступных стагоддзяў нага ўзброенага немца не ступала на беларускія землі.

Свята павінна стаць як дыямент у кароне...

Фестываль «Навагрудскі замак» вось ужо 10 гадоў збірае дзясяткі тысяч гледачоў з усёй Беларусі і з-за яе межаў. Першы фэст адбыўся ў Навагрудку ў чэрвені 2000 года і ладзіцца з таго часу кожныя два гады. Пяты па ліку, юбілейны фэст прысвечаны 600-годдзю Грунвальдскай бітвы — адной з маштабных і эпахальных бітваў Сярэднявечча. Пройдзе ён з адпаведным статусу размахам. Уладзімір Карачэўскі, першы намеснік міністра культуры, адзначыў, што арганізатарамі фэсту выступілі Міністэрства культуры, Гродзенскі аблвыканкам і Навагрудскі райвыканкам. Удзел возьмуць прадстаўнікі гістарычных клубаў Літвы, Латвіі, Польшчы, Украіны, Расіі, Чэхіі, Славакіі, Германіі і іншых. Шэсце, гала-канцэрт, шырокі паказ побыту і жыцця сярэднявечных беларускіх гарадоў, рыцарскія турніры каля сцен Навагрудскага замка — усё гэта гарантавана будзе мець поспех не толькі ў беларусаў, але і ў замежных гасцей, турыстаў і, безумоўна, прыцягне іх увагу. Удзел у фэсце ўжо пацвердзілі прадстаўнікі міністэрстваў культуры Латвіі і Расіі. Чакаецца вялікая колькасць гасцей. «Наша задача як гаспадароў, каб гэта свята стала адным з дыяментаў у вялікай кароне...» — менавіта такія ўзнёсла-рамантычныя словы належаць Аляксандру Лойку, начальніку ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама. Ён падкрэсліў, што асноўная мэта фестывалю — прыцягненне турыстаў, знаёмства іх з Навагрудчынай.

Свята святам...

— Міністэрства культуры нездарма выбрала Навагрудак месцам правядзення фестывалю, — заўважыў начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама Аляксандр Карачан. — У нашага горада ўжо вельмі багаты вопыт правядзення сярэднявечных фестываляў. З 2000 года правялі ўжо чатыры фэсты. І кожны — з нарастаючым поспехам. Першыя праходзілі на энтузіязме клубаў ваенна-гістарычнай рэканструкцыі. За гэты час павялічылася і працягвае няспынна расці доля камерцыялізацыі клубаў. Даводзіцца гэта ўлічваць і фарміраваць расходы. На гэты раз агульны каштарыс складае прыкладна 250 мільёнаў беларускіх рублёў, з якіх 160 мільёнаў бюджэтныя сродкі, выдаткаваныя Міністэрствам культуры і ўпраўленнем культуры аблвыканкама.

Некаторыя мерапрыемствы праводзяцца на платнай аснове. За кошт зароблены сродкаў плануецца аплаціць хоць бы сорак працэнтаў расходаў. Арганізатары плануюць максімальна захаваць ідэю сярэдневяковага свята. Запрашаюцца да ўдзелу ў фэсце сур'ёзныя калектывы, вядучыя клубы ваенна-гістарычнай рэканструкцыі з Літвы і Чэхіі, якія будуць працаваць на платнай пляцоўцы, размешчанай на самім замку. Аднак уваход туды будзе абмежаваны. Справа ў тым, што тэрыторыя замка мае пэўныя межы і вузкі выхад, таму з мэтай бяспекі колькасць гледачоў на адным мерапрыемстве не можа перабольшваць 1200 чалавек. На замку будзе знаходзіцца таксама традыцыйны рыцарскі стан, маляўніча і цікава афармлены. Можна будзе пазнаёміцца з сярэднявечным побытам і кухняй. Асобная частка праграмы — сярэднявечная музыка ад беларускіх і замежных выканаўцаў. Чым не XV стагоддзе? У гэтыя дні каля Дома быту будзе наладжана выстава-продаж прадуктаў усіх прадпрыемстваў горада Навагрудка.

Навагрудак чакае вялікі прыток турыстаў, і арганізатары прапануюць некалькі варыянтаў іх размяшчэння. Гасцініц не так шмат. «З той нагоды, што большасць турыстаў — моладзь, мы прапануем начлег у палатках. Аднак палатак мы маем няшмат, таму раілі б турыстам мець гэта на ўвазе. Маладым людзям прасцей размясціцца, яны як спартанцы. У двух кіламетрах ад горада адведзена адмысловая пляцоўка з месцам для вогнішчаў, з асвятленнем, біятуалетамі, бакамі для смецця. Туды рэгулярна будуць наладжаны рэйсы гарадскога аўтобуса. Адно такое месца абыдзецца госцю ў тры тысячы рублёў. Задзейнічаны і студэнцкія інтэрнаты, колькасць месцаў — каля пяцісот. Падрыхтаваны спіс прыватных кватэр, хат, якія будуць здавацца на час правядзення фэсту», — папярэджвае Аляксандр Карачан. Для таго, каб забраніраваць сабе такое месца, дастаткова зайсці на афіцыйны сайт Навагрудскага райвыканкама http://novogrudok.grodno-region.by/ альбо звярнуцца па тэлефоне 8 015 97 226 96.

Навагрудак — своеасаблівы горад. Тут вельмі шмат аднабаковых дарог, таму могуць узнікнуць цяжкасці з пад'ездам да цэнтра свята. Вырашана, што турысты будуць пакідаць свае аўтамашыны на былым рынку, гэта прыкладна 800-900 метраў да патрэбнага месца.

«Навуковы» адпачынак

Тамара Вяршыцкая, дырэктар Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея адзначыла, што летась праведзена навуковая канферэнцыя ў Навагрудку, прысвечаная месцу і ролі гэтага гістарычнага цэнтра ў гісторыі і культуры Еўропы. Сумесна з Інстытутам гісторыі НАН падрыхтаваны зборнік матэрыялаў канферэнцыі з вялікім дадаткам інфармацыі пра Грунвальд, які можна будзе набыць у кіёску Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея. Падчас фэсту музей ладзіць прэзентацыю «Эпоха Вітаўта і Ягайлы» — каб можна было пазнаёміцца на падставе аўтэнтычных гістарычных матэрыялаў з тым, што такое XV стагоддзе і хто такія ўдзельнікі бітвы, якія атрымалі перамогу ў ёй. Дарэчы, у рамках фестывалю пройдзе «круглы стол», прысвечаны ролі Грунвальдскай бітвы ў беларускай гісторыі.

Вядома, што галоўны мастацкі твор, прысвечаны Грунвальду — карціна Яна Матэйкі «Грунвальдская бітва» — знаходзіцца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве. У Навагрудку будзе дэманстравацца падчас фэсту яе рэпрадукцыя. Ёсць яшчэ шэраг матэрыялаў, якія трапілі з Польшчы на момант правядзення святкавання. У прыватнасці, гэта польскі фільм «Крыжакі» на аснове вядомага рамана Г. Сянкевіча. Ён будзе паказаны 26 чэрвеня ў кінатэатры Навагрудка. Днямі адбылася прэзентацыя кнігі Анатоля Бутэвіча «Каралева не здраджвала каралю». Гэта гісторыя чацвёртага шлюбу Ягайлы з Соф'яй Гальшанскай, які адбыўся ў першай сталіцы ВКЛ Навагрудку. Прэзентацыя таксама будзе праходзіць 26 чэрвеня ў Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

Калі з'явіцца вуліца Грунвальдская?

17 мая ў Нацыянальным гістарычным музеі прайшоў «круглы стол», прысвечаны Грунвальдскай бітве. У яго рабоце прынялі ўдзел навукоўцы Інстытута гісторыі НАН, супрацоўнікі Магілёўскага і Мінскага абласных краязнаўчых музеяў, нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея, а таксама выкладчыкі і студэнты ВНУ Мінска і Віцебска. Прынята вельмі цікавая «рэзалюцыя», якая прапануе мясцовым уладам разгледзець пытанне надання адной з вуліц назвы Грунвальдская.

Вядома, што знайсці і набыць прадмет музейнага значэння часоў ВКЛ складана. Аднак здараецца, што пошукі завяршаюцца поспехам. «Так, сёлета нашы супрацоўнікі знайшлі прадмет, аналага якому няма на тэрыторыі Беларусі», — дзеліцца радасцю А. Ладзісаў, вучоны сакратар Нацыянальнага гістарычнага музея. — Дапаможа набыць гэты прадмет адна з банкаўскіх устаноў, з якой некалькі гадоў супрацоўнічае наш музей. Перадача гэтага ўнікальнага прадмета адбудзецца на пачатку восені. Што гэта за прадмет і якая банкаўская ўстанова выступае ў якасці спонсара — на гэты конт вырашана пакуль трымаць інтрыгу...

Таццяна БОЛТУЦЬ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦУКЕРКАВАЕ СВЯТА Ў ІВЯНЦЫ

А вы ведаеце, што агульнага ў кандытарскага вырабу і старадаўняга беларускага мястэчка? А калі зрабіць удакладненне: што агульнага ў цукеркі і Івянца? Ужо здагадаліся? Так! Менавіта ў мястэчку Івянец прайшоў першы ў Беларусі «Цукеркавы фэст»!

Амаль кожнаму з нас цяжка ўявіць сваё жыццё без цукеркі. Яна можа быць шакаладная, памадная, карамельная, арэхавая, малочная, нарэшце, суфле... Кожны выбірае сваю. Але вы ведаеце, што тэрмін «цукерка» прыйшоў да нас адносна нядаўна — толькі у XVI стагоддзі яго вызначылі французскія аптэкары, называўшы так зацукраную садавіну, якая выкарыстоўвалася ў лекавых мэтах. Страшна падумаць, што было б, калі б французы да гэтага не дадумаліся. Хаця пакінем французаў, каб не яны, цукерка абавязкова з'явілася б у Івянцы!

...Мясцовыя жыхары асабліва не спяшаліся на пачатак мерапрыемства. Жыццёвая праўда «ўсё роўна ў час не пачнецца» наклала свой адбітак, здаецца, на ўсе культурныя мерапрыемствы краіны. Безумоўна, у час і не пачалося. Аднак далей, з кожнай хвілінай касцюмаванага шэсця ад мясцовай плошчы Свабоды да

асноўнай пляцоўкі свята, народ усё падыходзіў і падыходзіў. Разам з сярэднявечнымі рыцарамі, русалкамі, кабылкай з возам натоўп весела пад музыку рухаў да тутэйшага «Панскага дому» — былога княжацкага маёнтка, ад якога цяпер засталіся толькі руіны.

— Сёння мы пачынаем новую традыцыю, і, мне здаецца, яна добра прыжывецца ў нашым старадаўнім мястэчку, дзе шмат майстроў, шмат добрых людзей, якія ўмеюць захоўваць гісторыю. Ударым нашым фэстам па наступствах сусветнага фінансавага крызісу! — аптымістычна распачаў фестываль **першы намеснік генеральнага дырэктара, старшыня назіральнага савету СП «Івкон» ААТ — кампаніі, якая ўсё арганізавала, — Алег ГЛУСКІН**. — Тры месяцы таму ў нашай кампаніі з'явілася знакамітая паэтка і этнограф Антаніна Хатэнка. Яна выказала гэтую ідэю. Гэта настолькі спадабалася, што амаль уся фабрыка «загарэлася» фэстам. Падтрымалі нас і ў івянецкай мэрыі. Тры месяцы падрыхтоўкі праляцелі як адзін дзень. Фэст не насіць камерцыйнага характару, у ім не ставіцца ніякіх рэкламных задач. Нават звесткі пра мерапрыемства не распаўсюджваліся далей Івянца, але ўсе роўна шмат хто даведаўся і прыехаў. Галоўная задача фэста — адпачынак для людзей, радасныя эмоцыі.

Арганізатары з упэўненасцю адзначылі, што сёлетні «Цукеркавы фэст» стане пачаткам добрай традыцыі, калі на слаўнай івянецкай зямлі будуць збірацца прыхільнікі «салодкага» чыну жыцця.

Пасля такога цяжка паверыць, што па статыстыцы ўзровень спажывання кандытарскіх прадуктаў у Беларусі ў два разы меншы за сусветную норму. Не паспявалі госці свята паспытаць адну «салодкую радасць», як хлопчыкі і дзяўчынкі ў прыгожых беларускіх народных строях падносілі чарговую порцыю калорый. Сярэднявечныя танцы пад старадаўнія музычныя інструменты — лепш дыеты не знайсці.

Уся праграма была звязана з сярэднявечнымі беларускімі традыцыямі. Бавілі гледачоў не толькі танцы. У выкананні тэатральных артыстаў можна было пабачыць, як і адкуль узнік Івянец, як тут праводзіўся абрад заручын шмат год таму, якое слова з'яўляецца чароўным і адначасова салодкім і шматшмат іншага. Моцная палова спрабавала свае сілы ў двубоі з сапраўдным рыцарам ды ў рассячэнні цукеркі сякерай. Не абышлося і без першага ўладальніка Івянца — Вялікага князя Вітаўта. Пункт праграмы, у якім пра яго расказвалася, называўся катэгарычна і беспаваротна: «Перамога Вітаўта».

Добры настрой і весялосць стваралі фолк-музыкі. Дуда, скрыпка — традыцыйныя беларускія інструменты, якія спрадвеку суправаджалі ўсе мясцовыя святы, — гучалі над Івянцом роднай, знаёмай і блізкай мелодыяй. Сваімі ўражаннямі з карэспандэнтам «Звязды» падзяліўся ўдзельнік фэсту, вядомы ў краіне **бард і дудар Зміцер СІДАРОВІЧ**:

— Тут адбываецца вельмі класная рэч. Наогул, гэта тое, чаго ў краіне вельмі не хапае. Зараз існуе засілле тэлевізара, а тут жывая, нязмушаная атмасфера, ёсць магчымасць выступіць не толькі поп-зоркам, але і фолк-музыкам. Доўгі час савецкага афіцыёзу людзі былі падзеленыя на тых, хто на сцэне, і тых, хто ў глядацкай зале. Мы парушылі гэтыя правілы: у нас музыкі сярод людзей, а людзі сярод музыкаў. Існуе стэрэатып, што фальклорная музыка для бабулек. Не! Фолк заўсёды быў блізкі да моладзі! Хацелася таксама б запрасіць усіх, хто цікавіцца фолкам, кожны чацвер, пачынаючы з верасня, у парк Горкага а сёмай гадзіне вечара на фальклорныя вечарыны з песнямі і танцамі.

Не сапсаваў настрой прысутным і невялічкі дождж, які праляцеў хвілін за 20, знёсшы з сабою толькі некалькі шарыкаў. Як зазначыла **мясцовая жыхарка Галіна САБАЛЕЎСКАЯ**, «прыемна, што гэтым днём гучаць менавіта нашы беларускія старадаўнія песні, і дождж нікому не перашкодзіў, у людзей добры настрой і радасць у вачах».

Сваімі назіраннямі падзяліўся і **студэнт Арцём БУРДУКОЎ**:

— Спадабалася, што менавіта прыватнае прадпрыемства зладзіла такі фэст. З недахопаў хіба што можна адзначыць толькі тое, што вельмі доўга ўсё было. Але, магчыма, проста так здавалася з-за таго, што людзі звыкліся: ёсць нейкае свята (Дзень горада, Купалле) — трэба гуляць цэлы дзень. А сёння, я думаю, ішлі, «не ведаючы куды». Аднак, калі фэст увойдзе ў традыцыю, упэўнены, ён будзе ўспрымацца як той самы святочны дзень.

Усяго некалькі гадзін на «Цукеркавым фэсце» зацвердзілі ў галаве думку, што цукеркі ўпершыню з'явіліся менавіта ў Івянцы — а дзе інакш? Кожнага, хто хоча таксама ў гэтым пераканацца, мястэчка запрашае праз год на тое ж месца!

Яўген ВАРАКСА, фота Ігара ЛЯВІНСКАГА.

ФАРБЫ ІНДЫІ

У Баранавічах працуе выстава-кірмаш індыйскіх тавараў. Больш за 50 прадпрыемстваў выставілі сваю прадукцыю ў Лядовым палацы. І трэба сказаць, што кірмаш карыстаецца ў насельніцтва вялікай папулярнасцю.

Амаль усю выставачную плошчу займаюць тавары лёгкай прамысловасці, найперш тэкстылю. Для вока еўрапейца нязвыкла бачыць такое багацце фарбаў, ад каляровай насычанасці не ведаеш, на чым затрымаць позірк.

Пакупнікамі былі жанчыны, бо тавараў для мужчын я не знайшоў, калі не лічыць металічную біклагу для гарэлкі, але чамусьці з выгравіраваным на ёй расійскім гербам.

Шалі, хусткі, сумкі, сукенкі... прадаваліся па даступнай цане. Напрыклад, лёгкая шаля каштуе 10 тысяч, а хустку можна купіць і за тры тысячы, калі ж купляеш дзве, то плаціш 5 тысяч. Хусткі былі навалены на сталах і яны прыцягвалі пакупніц, жанчыны перабіралі, прыкладвалі да сябе і куплялі. Стваралася ўражанне распродажу.

Біжутэрыі таксама хапае, але яна ўсё ж усходняя і, на мой погляд, празмерна стракатая і кідкая. У большасці ювелірных вырабаў не хапала вытанчанасці, хоць выбраць можна было. Жонка таптала, перабірала розныя каралі і выбрала нанізаныя на нітку пластацінкі. Сказалі што яны са слановай косці. Магчыма і так, хоць кошт усяго 20 тысяч.

Каля розных куфэркаў ды шкатулак мала хто спыняўся. Невялікая драўляная шкатулка прадавалася за 30-60 тысяч. Можа і не дорага, бо ручная работа, але...

Праходзілі людзі і міма дываноў. Безумоўна, рэчы прыгожыя з натуральнага шоўку, але калі дыван з доўгім ворсам памерам 2х1 м каштуе 470 тысяч, то для большасці — гэта ўжо выставачны экспанат.

Шмат рэчаў з натуральнай сыравіны: бавоўны, шоўку, скуры... і многа ў іх экзотыкі.

З маёй дапамогай жонка набыла і дзве шалі. Даволі сціплыя, аднатонныя, з дробненькім малюнкам — нейкія тутэйшыя.

А пахадзіць, паштурхацца ў натоўпе і паглядзець на нешта для цябе незнаёмае — заўсёды цікава.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

«І той, хто выжыве, успомніць мёртвых...»

Дзённік выпускніка Самахвалавіцкай сярэдняй школы Браніслава ШПАКОЎСКАГА. 1942 год

...6 чэрвеня.

У вайну заўсёды бывае многа дзівосных здарэнняў. Вось і сёння я даведаўся, што добра знаёмыя мне дзве дзяўчыны Оля Г. і Лена Р. прапалі. Дзе, што і як — невядома. Пайшлі 3 чэрвеня на вяселле ў нейкую вёску за 12 кіламетраў і назад не вярнуліся. Ідуць розныя чуткі. Адны гавораць, што яны, мабыць, дзе-небудзь забітыя, другія балакаюць, што пайшлі з нейкімі «ўхажорамі» і г.д. Вядзецца следства.

...12 чэрвеня.

Даведваюся больш дакладна: дзяўчаты пайшлі ў партызаны. Зусім правільна паступілі. Такі доўг сумленнага камсамольца. Гэтым яны паказалі прыклад для астатніх сваіх сяброў, гэтым яны паказалі, што толькі змаганнем можна здабыць сабе шчаслівую будучыню.

... 16 чэрвеня.

Многія нашы хлопцы папаліся ў паліцыю... Быццам бы за тое, што не скончылі ў Мінску работы нейкай.

...23 чэрвеня.

Быў на працы і не думаў, што прыйшоўшы дадому, я буду чым-небудзь усхваляваны ці абрадаваны. І вось: не паспеў зайсці, як мне паведамілі: «Валя прыйшла. ..Тут, у Самахвалавічах...» І сэрца маё затрапятала... Кроў прыйшла ў галаву... Нарэшце!...

...25 чэрвеня.

Меў з Косцем даволі сур'ёзную размову. Надышоў той час, калі трэба канчаткова рашыцца на што-небудзь... Яшчэ раз мы ўверыліся, што так, як мы жывём цяпер, жыць далей немагчыма... Мы павінны выканаць свой абавязак перад Радзімай, перад нашым савецкім народам, які так гераічскі змагаецца з гэтымі фашысцкімі нахабнымі бандамі Гітлера, з гэтай фашысцкай поскуддзю, якая навалілася на наш шчаслівы, радасны край — край сацыялізму.

І так. Рашылі: мы павінны пасвяціць сваё жыццё нашай шчаслівай будучыні, нашаму народу, нашай Радзіме.

...2 ліпеня.

...Заўсёды я ўставаў адразу, як толькі прачнуся. Але сёння я не ўставаў: успомніў сон, які сніў гэтай ноччу. Ніколі ніякія сны не заставаліся ў маёй памяці, але гэты вось застаўся. Вось прыблізна яго змест:

Наша мястэчка не ў парадку. Усюды разарэнне. Мноства народу енчыць з голаду на вуліцах... Мруць усе як мухі... Усюды пажарышчы, руіны... На фоне ўсяго гэтага ярка бачу, як расходжваюць немцы, тоўстыя, здаровыя, з доўгімі гумкамі ў руках. Кагосьці б'юць... Чуваць плач... Сэрца так і сціскаецца ад жалю.

І вось, здаецца, знаходзіцца нейкі невядомы чалавек, збірае вакол сябе ўвесь пакутны народ і штосьці ім гаворыць. Я слоў не чую, але бачу, што ўсе людзі зварухнуліся, зашумелі. Не выцерпеў я: рванецца, здаецца, з калоны наперад і хачу кінуцца з нажом у руках на немцаў, якія ўжо кудысьці збіраюцца, адыходзяць. Але мяне трымаюць за рукі акружаючыя мяне людзі. Яны гавораць: «Пачакай... Не спяшайся, пойдзем усе разам...» І мы ўсе пайшлі... Пайшлі разам на немцаў, на гэтых агідных катаў. Я хваляваўся без канца, ішоў разам з усімі людзьмі, хаця мне не знаёмымі, і любаваўся, як уцякалі немцы...

І тут я прачнуўся. Так мне канца і не прыйшлося пабачыць. Лежачы на ложку, я прадумаў гэты сон з пачатку да канца і прыйшоў да выніку, што сон гэты мог прысніць толькі таму, што я так аб гэтым думаў днём не адзін раз. Можа быць, што гэты сон мой скора ператворыцца ў сапраўднасць. Можа быць, што ўсё гэта я буду бачыць не ў сне, а наяве. І яно так будзе.

3 ліпеня.

Гітлер пачынае канчаткова вар'яцець. Прыходзяць яму апошнія канцы. Праўду кажа народная прыказка: «Хто топіцца, дык той і за брытву хопіцца». Так вось і тут стаіць справа. Гэты агідны фашыст бачыць, што так ці іначай вайна будзе прайграна... І вось ён прыходзіць да крайнасці: даручае свайму паплечніку генеральнаму камісару Беларусі Вільгельму Кубэ, каб апошні ў Беларусі з беларусаў арганізаваў корпус самаахоны, задачай якога будзе барацьба з партызанамі (?).

І хто пасля гэтай выдумкі скажа, што ён не страчвае розуму, што ён не шалее. Дзе і калі гэта было чуваць, каб брат ішоў на роднага брата, ці сын ішоў на бацьку дзеля таго, каб якому-небудзь дохламу немцу лепш жылося, каб ён рабаваў наш народ, каб гэты самы ненавідны Гітлер мог потым знішчыць

Пачатак у папярэднім нумары.

са свету ўсе нацыі.

Не! Не бываць гэтаму ніколі! Калі і знойдуцца адзінкі такіх людзей, якія добраахвотна пойдуць у гэты «корпус самааховы», то гэта будуць не людзі, гэта будуць сабакі, прадажнікі, гітлеравы падхалімы, якімі ёсць цяпер некаторыя паліцэйскія.

...9 ліпеня.

Косця гаварыў учора з Сяргеем В. Сяргей прапаноўвае нам паступіць у паліцыю, адкуль будзе лепш за ўсё мець сувязь з партызанамі. Ніяк не можам рашыцца на тое. Што ж тады скажуць нашы бацькі, нашы таварышы былыя па школе? Што ж тады скажа местачковае жыхарства? Усялякі падумае, што застаўся ў паліцыі толькі для сваёй нажывы, для здзекаў над людзьмі. Хто ж тады мяне залічыць сумленным чалавекам? Кожны скажа: «Раз паліцэйскі, значыць сабака прадажны».

Толькі тыя людзі, якія будуць ведаць праўду, з якою мы засталіся б у паліцыі, маглі б нам сказаць што-небудзь інакшае. Адным словам, яшчэ дакладна не вырашана, як паступіць. А тое, што нам неабходна зараз жа звязацца з партызанамі, што нам трэба выступіць са зброяй у руках супраць інтэрвентаў — гэта мы вельмі разумеем. І гэта мы зробім. Гэта наш абавязак — абавязак камсамольца, абавязак савецкага грамадзяніна. Можа па нашым прыкладзе пойдуць і ўсе нашы таварышы, якія зразумеюць усю існасць гэтай справы.

...21 ліпеня.

Не прыходзілася з раніцы сумаваць. Але днём і к вечару скаліся такія абставіны, што прывялі мяне поўнасцю ў маральны гнёт, у непераносны смутак. Балела з жалю, заходзілася ад злосці сэрца... Хацелася плакаць, здаецца, хацелася штосьці неймаверна тварыць, на кімсьці спагнаць усю маю злосць.

Браніслаў ШПАКОЎСКІ і Міхаіл ВАСІЛЕЦ з аднакласніцамі. 10-ы клас Самахвалавіцкай сярэдняй школы. Май 1941 года. Браніслаў памёр у знешнім лагеры канцлагера «Равенсбрук» у горадзе Барт. Ён не дажыў 40 дзён да таго, як 1 мая 1945 года перадавыя часці 2-га Беларускага фронту лагер вызвалілі. Міхаіл загінуў 27 жніўня 1944 года пры фарсіраванні ракі Нараў.

І ўся справа ў тым, што наш дарожны інжынер, гэты паскудны стары немец-мардабойца накрычаў на нас, што мы стаялі, схаваўшыся ад дажджу. Крычаў, крычаў, а нарэшце яшчэ і ўдарыў Антона... Вось тут закіпела маё сэрца, хацелася кінуцца і задушыць за горла. Я не мог пераносіць таго, што ён так абышоўся з маім таварышам.... Але мы былі не ў сілах нічога зрабіць — з ім былі яшчэ чатыры немцы.

Сашчапіўшы зубы, з яшчэ большай нянавісцю да немцаў, з рашэннем адпомсціць калі-небудзь ім за здзекі над нашым народам, мы з Антонам пакінулі гэтых гіцляў...

...2 жніўня.

...Уся справа, задуманая праз Косцю, прапала дарэмна. Нічога не выйшла. Пецька Ц. адмовіўся амаль, Паўла В. — таксама, ад Сяргея В. нічога не чуваць. Патрэбна ўсё на гэтым з імі пакончыць. Хлопцы думаюць працаваць на «асваболжанай» зямлі — чорт з вамі, працуйце! Але прыйдзе часіна, што зразумеюць усё яны самі...

Ну што ж? Здаецца засталіся пры сваіх поглядах толькі я ды Косця. Зрабілася неяк крыўдна... Хацелася плакаць... Словы засядалі ў горле... Я не мог гаварыць. Косцік таксама хвалявaўся. Выгляд яго твару быў як ніколі: бледны, вочы зажмураныя... Цяжка дыхаў... Ішоў моўчкі... Адну толькі фразу прагаварыў: «Вось табе і камсамольцы...»

...Нечаканая рэч! Ішлі з Антонам Ш. вечарам са Слабады. Гутарка была таксама пра корпус. І вось тут Антон цвёрда сказаў: «Ну яго к чорту, з корпусам... Ці ж не можна знайсці месца і без яго? Я не пайду біць разам з немцамі нашых братоў і таварышаў...»

Я яго падтрымаў. Зразумеў, што ён мне намякнуў аб партызаншчыне. Завялі больш шчырую размову. Аказалася, што ён да гэтага падрыхтаваны больш, чым хто іншы. Гэта мяне ўзрадавала. Нарэшце! Ёсць яшчэ адзін, хто мне спрыяе, хто трымаецца майго погляду. Толькі з ім можна будзе наладзіць усю справу.

3 жніўня.

Наведаў Мінск. Здаў з воласці даведкі для атрымання дакумента. Без нямецкага дакумента цяпер не вытыкай нідзе носу. Нават у сваёй хаце чалавека без дакумента нямецкага могуць прызнаць за партызана і расстраляць.

...9 жніўня.

«Можа апошнюю нядзелю мы гуляем дома», — разважалі сёння ўсе нашы хлопцы. Так. Можа апошні раз мы, усе хлопцы местачковыя, таварышы дзяцінства, школьных гадоў і юнацтва, сустракаемся сёння разам, гаворым за чаркай гарэлкі аб нашым радасным мінулым і гэтакім сумным, нудным, шэрым і бязрадасным сённяшнім...

Можа хто-небудзь з нас загіне ў будучых баях за нашу Радзіму, за наш савецкі гераічскі народ, які ўжо другі год змагаецца за сваё шчасце і долю... А можа хто-небудзь з нас застанецца ў гэтым небывалым у гісторыі чалавецтва супрацьстаянні жывым, выйдзе з гэтага змагання героем-пераможцам і ўбачыць яшчэ тое радаснае і шчаслівае, у што мы, камсамольцы, верым сёння...

І тады той, хто выжыве, успомніць мёртвых, якія падуць, можа, геройскай смерцю за сваю незалежнасць... А гэта ўсё перад намі блізка. Гэтага ўсяго нам не мінуць. Бушуючыя хвалі грознай вайны падхопліваюць і нас, нікога не пакінуць убаку...

І хлопцы, некаторыя са слёзамі на вачах, пілі за нашы справы, за нашу дружбу. Пілі, і ўспаміналі з прыемнасцю аб мінулым, успаміналі наша школьнае жыццё... І многа чаго тады было прыгожага, што мы, бывала, недаацэньвалі...

...20 жніўня.

Мінулая ноч была для мяне бяссонная. Ды і як было спаць, калі над нашым мястэчкам прайшло некалькі дзесяткаў савецкіх самалётаў... Не спаў ад радасці, ад захаплення, што, нарэшце, зноў пачуў гул савецкіх матораў, якія, мабыць, ішлі граміць нямецкія заводы. Маторы гулі без перапынку. У гэтым мілагучным гудзенні стальных савецкіх птушак чулася штосьці радаснае, пераможнае. Я не спаў...

Хаця ноччу нельга выходзіць на двор (такі загад нямецкіх уладаў), але паціху выйшаў за хату і доўга глядзеў, як праляталі адзін за адным самалёты. Дарэмныя былі стрэлы зенітных пушак. Самалёты як бы і не заўважалі, што па іх страляюць. Яшчэ і яшчэ раз я мог уверыцца ў хлусні нямецкіх газет, дзе яны пішуць пра «вялікія страты савецкай авіяцыі».

...30 жніўня.

Пры спатканні з Косцікам у нас заўсёды ўзнікае гутарка пра вайну, пра цяперашнее становішча на фронце і інш. І абодва мы жывём надзеяй на перамогу Савецкага Саюза... І сёння мы гаварылі пра гэта больш чым калі, таму што мы гаварылі душэўна, гаварылі за выпіўкай... Ён гатоў быў хоць цяпер пайсці ў партызаны і з вінтоўкай у руках біць, граміць, гнаць з нашай зямлі гэту фашысцкую пошасць.

Але ж пакуль што немагчыма. Як ён, таксама і я, маем сем'і. А адкрыта пайсці ў партызаны, значыць загубіць сваю сям'ю. Немцы — гэта не людзі, гэта нахабныя звяры, якія бачаць блізка свой канец... Тут патрэбна знайсці другое выйсце. І над гэтым мы цяпер думаем.

31 жніўня.

Канец жніўня... Уборка праходзіць добра. Надвор'ем усе задаволеныя, але вось зямлёй людзі ўжо пачынаюць быць незадаволеныя. Немцы сваё паказалі. Усклалі такія нарыхтоўкі, што для сябе нічога не застанецца. Цяпер многа хто з сялян пачынае разумець, хто такія немцы і што яны нам «далі». Цяпер многія зразумелі, што такое нямецкі «Аграрны парадак землекарыстання». Адным словам, запомніць беларускі народ нямецкую акупацыю на многа гадоў, пазнае, па чым фунт ліха.

І ўжо не адзін, а дзясяткі знаходзяцца коласаўскіх дзедаў Талашоў, якія з вінтоўкаю ў руках пачынаюць змаганне супраць акупантаў.

...22 верасня.

...Аж бяжыць па скуры мароз, калі пачую, як дзяўчаты гнуць матам... Вось тут табе і навука, і культура... Вельмі цяжка мне быць у асяроддзі такой моладзі. Але што зрабіць? Лепшай няма. Вайна... Усюды распуста... П'янкі, гульня, карцёж, розныя любоўныя гісторыі... Гэтаму многія з моладзі пасвяцілі цяпер сваё жыццё. Яны ўжо не вераць у лепшае... Зусім быць адарванаму ад гэтай моладзі немагчыма, а таму і мне прыходзіцца ў некаторых выпадках (толькі ў некаторых выпадках!) падражаць ім. ...Але прыйдзе час, калі ўсё гэта спыніцца, калі я з гэтага асяроддзя змагу выйсці...

...7 кастрычніка.

Гаварылі з Косцікам аб цяперашнім крытычным для нас моманце (мабілізацыя ў корпус самааховы. — **«Зв.»**) Прыйшлі да выніку, што пойдзем, калі возьмуць, але пры першым выпадку — кулю немцам у спіну, а самі да сваіх...

Расказаў Косця, што чытаў савецкую газету «Звязда», якая выходзіць тут на Беларусі падпольна. Многа чаго цяпер нам стала яшчэ вядома, што творыцца на свеце.

...8 кастрычніка.

Прыйшоў час расстацца з маім таварышам Косцем Урублеўскім. Бяруць таксама і яго ў «Корпус самааховы». Сёння позва, сёння і з'явіцца. Нічога не зробіш. Трэба ісці. Прыйшоў са мною развітацца. Шкада, вельмі шкада мне стала яго. І яшчэ больш шкада, што мы не зможам разам дзейнічаць. Яго ўжо ўзялі, а мяне хутка возьмуць. І хто ведае, ці спаткаемся мы яшчэ. У яго апошнім позірку я прачытаў: «Памятай добра пра нашы размовы, пра тое, што глыбока засела ў сэрцах...»

...24 кастрычніка.

...Прыйшоў на выхадны дадому Косця У. Настрой яго быў вясёлы, але вельмі ўсхваляваны. Завёў з ім размову. І тут даведаўся ўсё... Пры першым магчымым моманце ён зматаецца... Вядома, дасць аб гэтым ведаць мне. Калі адыходзіў, ён сказаў: «Калі мне ўдасца, аб табе таксама не забудуся...».

...31 кастрычніка.

Радасная, хвалюючая навіна: мінулай ноччу партызаны забралі ў Дзергаёх (7 км ад Самахвалавічаў) усіх маладых хлопцаў. Каго забралі, а хто і сам пайшоў. Але няхай будзе «забралі», каб сям'я кожнага была абароненая ад расправы немцаў. Справа добра задуманая.

Савецкія самалёты зноў наведалі Мінск. Здорава нагналі на немцаў страху.

...12 лістапада.

Партызаншчына расце з кожным днём. Адусюль даходзяць чуткі аб дзейнасці партызан.

3 снежня.

Быў Косця. Свайго дабіваюцца. Напісалі партызанам заяву, каб прынялі іх (усю самаахову) у партызаны. Чакаюць адказу. Мяне і маіх таварышаў гэта цікавіць таксама. Наша справа ўся звязана з імі... З нецярпеннем чакаем...

...8 снежня.

Вечарам стала вядома, што хлапцоў усіх (усю самаахову і паліцыю ў Самалове) забралі партызаны. Так, трэба гаварыць «забралі», каб не было падазрэння. А то бацькі могуць пацярпець. Немцы цяпер азвярэлыя як ніколі. Мае таварышы ўжо там. Засталося за мною. Абавязак мой — арганізаваць яшчэ больш хлапцоў і туды таксама. Дзейнічаю...

...16 снежня.

Як цяжка жыць цяпер, а яшчэ цяжэй падпольна працаваць. Але сякія-такія вынікі маёй работы ёсць. Ужо многа моладзі я згуртаваў вакол сябе, якая гатова хоць сёння стаць на абарону Радзімы. Праўда, мне многа каштавала гэта працы, а яшчэ больш — здароўя. Перажыць прыходзіцца за кожнага чалавека. А ўсё асцярожнасць, страх...

Запісаць пару слоў у дзённік і то патрэбна асцярожнасць. Вы-



Апошняя старонка дзённіка.

падкова вобыск — і я прапаў. Прачытаюць пару радкоў, і стане ясна ім, нямецкім прыхвасням, чым дыхаю я і мае таварышы. Прыходзіцца ўсё хаваць. Маскіраваць.

18 снежня.

Шпіёны нямецкія данеслі аб нашай справе ў паліцыю. Пагражала небяспека... Але мінулая ноч нас выратавала. Выратавалі нашы браты-байцы, якія ўжо са зброяй у руках змагаюцца за Радзіму. Прыйшлі партызаны і ўсю паліцыю разагналі. Палову ўзялі ў палон. Прапаў і данос аб нашай тайне. Цяпер яшчэ энергічней за працу.

19 снежня.

Бачыўся з начальнікам партызанскага атрада. Дамовіліся на заўтра. Прывядзе свой атрад у Самахвалавічы. Мэта: разбіць камендатуру, узарваць мост і забраць моладзь нашу. Чакаю... Крыху хвалююся...

20 снежня.

Ноч была як ніколі. Партызанскі налёт адбыўся, але не зусім удала. Першы раз я і мае хлопцы ўдзельнічалі ў баі. Як гаворыцца, атрымалі баявое хрышчэнне. Мост не ўдалося ўзарваць. Камендатуру разбілі. Наш хлопец адзін ранены (Антон Ш.) Усе мы пакуль што засталіся. Трэба дзейнічаць болей. Так загадаў начальнік.

22 снежня.

Пайшлі розныя чуткі. Нам зноў пагражае арышт і смерць. Усе напагатове. Што-небудзь, дык дадзім усе ходу хто куды. Прыязджала жандармерыя. Вядзецца следства. Ці ўцалеем, ці не?

25 снежня.

Крыху супакоілася ўсё. Можа нічога не будзе. Толькі бяда, што прыслалі да нас у мястэчка паліцыю. Гэтыя сабакі горшыя за немцаў.

26 снежня.

Пачаўся ў мястэчку хаос. Паліцыя і самахова паказалі сябе з першага дня. Страляніна, п'янства і буянства. Страшна днём выйсці на вуліцу. Сапраўдныя чарнасоценцы.

Справу нашу працягваем. Завербаваў сюды яшчэ Антона Шарэйку. Хлопец надзейны.

28 снежня.

Паліцыя прыдзіраецца к нашым хлопцам. Арыштаваны дваёх. Астатнія яшчэ дзяржаліся.

31 снежня.

Дзейнічаем і дзейнічаем, хаця і пагражае небяспека. Хутка можа мы сваё тут зробім і тады пойдзем разам з таварышамі ў лес. Яшчэ крыху цярпення. Але перамога будзе за намі!

Мемарыял, які за ўласны кошт і па ўласным эскізе ўсталяваў на магіле сваіх дзядулі і бабулі Уладзімір ШПАКОЎСКІ.

ПОМНІК БРОНІКУ

Так здарылася, што я, калі чытала дзённікі Броніка, нічога не ведала пра яго далейшы лёс. Загадчыца музея Алена Гусельнікава хварэла, і не было магчымасці яе распытаць. Я чытала і перажывала за Броніка. Калі чытала запісы за 22 чэрвеня 1941 года, яшчэ не ведала, ці трапіць ён на фронт. Потым разам з ім перажывала расчараванне, страх, дэпрэсію ад таго, што ён, Браніслаў Шпакоўскі, не можа адкрыта змагацца з акупантамі, вымушаны чакаць... Нарэшце, надзея, першыя чуткі пра партызан, сувязь, рэальныя справы. Зноў хваляванні і страх, але ўжо іншыя, ужо адчуецца акрыленасць верай у тое, што робіш нешта годнае, вартае жыцця. Ён вёў дзённікі роўна тры гады. Апошні запіс — 31 снежня 1942 года.

Ён так і не паспеў сысці ў лес. У сакавіку 1943-га яго арыштавалі на вачах у бацькоў, ва ўласным доме пры аблаве. Цяпер няма ў каго распытаць падрабязнасці. У Самахвалавіцкім школьным музеі захоўваецца даведка за подпісам былога дырэктара школы, у якой вучыўся Бронік, а ў гады акупацыі сакратара Мінскага сельскага падпольнага камітэта ВКП(б)Б Мікалая Міронавіча Альхімовіча, датаваная 22 жніўня 1944 года: «Даведка дадзена гр. м. Самахвалавічы Мінскага раёна Шпакоўскаму Фаме Ігнатавічу ў тым, што ягоныя сыны Канстанцін Фаміч і Браніслаў Фаміч і дачка Разалія Фамінічна былі арыштаваныя ў сакавіку—лістападзе 1943 года і вывезеныя ў гестапаўскую турму в. Падгай Мінскага раёна. Пасля чаго лёс іх невядомы. Уся сям'я гр. Шпакоўскага была арыштаваная за сувязь з партызанамі і выкананне ад іх заданняў на карысць Радзімы».

З чатырох дзяцей у Шпакоўскіх на канец вайны застаўся толькі другі сын Зіновій. Канстанцін да лістапада 1943-га працаваў млынаром у Самахвалавічах, і калі немцы не паспявалі ўдзень змалоць сабе ўсё прывезенае збожжа, ноччу яно аказвалася ў партызан. Партызаны давалі Канстанціну распіску, што забралі збожжа, і некаторы час гэта сыходзіла млынару з рук. Акрамя таго, ён расказваў начным гасцям усё, што чуў удзень ад немцаў праз перакладчыка, і нярэдка гэтыя весткі былі вельмі каштоўныя. Партызаны своечасова папярэдзілі Канстанціна пра тое, што яго павінны арыштаваць і прапанавалі яму сысці ў лес. Але ў гэты самы час памерла ад дыфтэрыі пяцігадовая дачка млынара, вось-вось жонка павінна была нарадзіць другое дзіця. Жонка Анэля і не дазволіла Канстанціну сысці ў лес, паставіла ўльтыматум: «Ты з дому, я ў камендатуру!» . Хутка іх арыштавалі усіх: Разалію, Косцю з жонкай, бацькоў і нават дзяўчыну, якая выпадкова засталася ў іх начаваць.

Бацькі чулі, як білі і катавалі Канстанціна, па гуках здагадаліся, што ад яго нічога не дабіліся і, падобна на тое, расстралялі. Зіновію ўдалося выкупіць бацькоў. Анэля нарадзіла ў турме дзіця. Дзіця прынеслі ў дом старых, а Анэля засталася ў турме. Дзяўчынка пражыла 4 месяцы і памерла.

Пра тое, што Роза жывая, бацькі даведаліся акурат 9 мая 1945 года — атрымалі ад яе першую вестку. Яна пісала з горада Котбус, куды была сасланая на прымусовыя работы.

Пазней Шпакоўскія атрымалі яшчэ адзін ліст, з якога даведаліся пра Броніка. Прывяду яго цалкам:

«Уважаемые граждане Шпаковские! К великому сожалению не могу пока побывать у вас лично, т.к. лежу в госпитале в Германии после освобождения от фашисткого рабства из концлагеря. Красная Армия разметала в пух и прах фашистов и мы в полумертвом состоянии были подобраны нашими бойцами и командирами. К великому Вашему горю Ваш сын не дождался этого счастья. Его молодой, слабый, не привыкший к невзгодам организм не выдержал. Я дал слово ему сообщить Вам в случае его смерти: Борис Шпаковский умер от воспаления лёгких 21/III — 45 г. в концлагере Барт (Германия). Я, Семенов Андрей Прохорович, из г. Саратова, Радищевский 17, кв. 8 находился в концлагере как партизан-коммунист, мой отряд действовал в Белоруссии с. М.Белевичи около г. Могилёва. Командир отряда Белоусов, бригада № 6, отряд №113. По возвращению на родину (если буду жив) приеду в Минск и буду у Вас. Будьте здоровы. Вечная память замечательному молодому патриоту. Андрей Семенов. 19 мая 1945 года».

Усе гэтыя дакументы, самі дзённікі, а таксама напісаную алеем карціну Броніка, школьныя і сямейныя фатаграфіі, некаторыя рэчы з дома бацькоў, Самахвалавіцкаму школьнаму музею перадаў Уладзімір Зіноўевіч Шпакоўскі, пляменнік Браніслава. На магіле бабулі і дзядулі ён паставіў помнік, на якім змясціў фатаграфіі ўсіх дзяцей Шпакоўскіх і звесткі пра іх. Дзякуючы яго намаганням у Самахвалавічах пра Броніка памятаюць. У кнізе «Памяць. Мінскі раён» ёсць звесткі, што Браніслаў Шпакоўскі з'яўляўся партызанскім сувязным, на мемарыяле ў пасёлку выбіта яго імя.

— Цяпер дабіваюся, каб і імя Канстанціна таксама з'явілася на мемарыяле, — расказаў журналісту «Звязды» Уладзімір Зіноўевіч. — На жаль, многія людзі ставяцца абыякава да памяці продкаў. Фатаграфіі, дакументы, асабістыя запісы тых, хто памёр, як правіла, выкідаюць. А гэта ж не толькі цікава, гэта бясцэннае для нас. Без усяго гэтага нам не зразумець, чаму нашы дзяды і бацькі зрабілі той або іншы выбар, чым яны жылі, пра што марылі, чым мы ім абавязаныя...

Уладзімір Зіноўевіч расказаў, як дзённікі былі знойдзеныя. Бронік завярнуў кожны сшытак у толь і замураваў у ляжак коміна на гарышчы. Калі яго маці і сястра ў 1970 годзе дом прадалі, новыя гаспадары сталі хату разбіраць і знайшлі сшыткі, перадалі іх Разаліі Фамінічне, якая працавала на той час у Самахвалавічах. Ад яе дзённікі трапілі да Уладзіміра. Бацька Броніка на той час ужо памёр, а яго маці іх так і не рашыліся паказаць...

Сябра Броніка Канстанцін Урублеўскі вайну перажыў. Да ліпеня 1944 года ён ваяваў у атрадзе імя Калініна (Мінская зона), спачатку камандзірам аддзялення, а потым памочнікам камандзіра спецгрупы. Пасля вызвалення Беларусі ён служыў у радах Чырвонай Арміі, быў ранены, кантужаны. Потым з чырвоным дыпломам скончыў філфак БДУ і ўсё жыццё працаваў у БелТА рэдактарам. Ажаніўся, выхаваў дзвюх дачок. Памёр у 2003 годзе.

Пра тое, што Канстанцін Андрэевіч увесь час помніў і думаў пра Броніка, сведчыць яго рукапіс, які так і застаўся неапублікаваным. Гэта аповесць, прысвечаная «Незабыўнаму сябру школьных гадоў — Браніславу Шпакоўскаму». Галоўны герой — Стась Пашкоўскі, малады таленавіты мастак, чалавек з залатым сэрцам, патрыёт, гіне ў нямецкім канцлагеры. Рукапіс датаваны 1971 годам...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *23 июля 2010 г.* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5	Лот 6	Лот 7	Лот 8	Лот 9
1	Адрес земельного участка	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода	Горанский с/с, д. Звенячи	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Новашино	Петришковский с/с, д. Щеки
2	Кадастровый номер	623688006601000405	623688006601000406	623688006601000409	623681306601000078	623685707101000135	623685707101000173	623685707101000141	623685707101000161	623685710101000003
3	Площадь земельного участка	0,1505 га	0,1503 га	0,1500 га	0,1501 га	0,1709 га	0,2425 га	0,1635 га	0,1741 га	0,2004 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	511 340	511 340	511 340	1 114 520	70 000	70 000	70 000	70 000	70 000
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	100 000 000	100 000 000	100 000 000	11 000 000	17 000 000	24 000 000	16 060 000	17 101 000	18 050 000
7	Задаток (рублей)	9 900 000	9 900 000	9 900 000	1 000 000	1 600 000	2 300 000	1 600 000	1 700 000	1 800 000

		Лот 10	Лот 11	Лот 12	Лот 13	Лот 14	Лот 15	Лот 16	Лот 17
1	Адрес земельного участка	Петришковский с/с, д. Недреска	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 186	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 180	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 59	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 60	Сеницкий с/с, д. Атолино, участок № 163	Михановичский с/с, п. Михановичи	Михановичский с/с, п. Михановичи, ул. Парковая
2	Кадастровый номер	623685706601000020	623686600601000519	623686600601000517	623686600601000521	623686600601000520	623686600601000518	623684204601001287	623684204601001305
3	Площадь земельного участка	0,1822 га	0,1454 га	0,1453 га	0,1513 га	0,1482 га	0,1373 га	0,1397 га	0,1179 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	70 000	1 415 020	1 489 540	1 489 540	1 562 520	1 481 540	600 670	1 394 300
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	16 431 000	18 000 000	18 000 000	19 000 000	18 000 000	18 000 000	35 000 000	23 000 000
7	Задаток (рублей)	1 600 000	1 700 000	1 700 000	1 700 000	1 700 000	1 700 000	3 400 000	2 200 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 23.07.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 19.07.2010 г. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток на участие в аукционе на Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет Щомыслицкого сельисполкома № 3600621180202 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600537220, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лот 4 – на расчетный счет Горанского сельисполкома № 3604621020052 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600537220, код платежа – 04901.

На Лоты 5–10 – на расчетный счет Петришковского сельисполкома № 3600621130151 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 520, УНН 600052386.

На Лоты 11–15 – на расчетный счет Сеницкого сельисполкома № 3600621160189 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520 УНП 600052409, ОКПО 04432966, код платежа – 04901.

На Лоты 16–17 – на расчетный счет Михановичского сельисполкома № 3604621090138 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНН 600303747, код платежа 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае, местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в а

Ад заробкаў і да водпускаў

Адразу тры онлайн-канферэнцыі правядзе бліжэйшым часам Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

У прыватнасці, як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Варвара Александровіч, 24 чэрвеня з 11.00 да 12.30 будзе праходзіць інтэрактыўная канферэнцыя на тэму «Практычнае прымяненне заканадаўства аб аплаце працы ў камерцыйных арганізацыях», 28 чэрвеня з 14.00 да 15.30 супрацоўнікі міністэрства могуць распавесці пра ўсё, што датычыцца правоў пацярпелых ці асобаў, якія прадстаўляюць іх інтарэсы, падчас няшчасных выпадкаў на вытворчасці. Нарэшце, 30 чэрвеня з 11.00 да 12.30 ёсць магчымасць задаць пытанні наконт працоўных і сацыяльных водпускаў, датэрміновага адклікання з адпачынку і кампенсацыі за нявыкарыстаны адпачынак.

Дарэчы, падкрэсліла Варвара Александровіч, свае пытанні супрацоўнікам міністэрства любыя грамадзяне нашай краіны і прадстаўнікі любых арганізацый (праз сайт www.mintrud.gov.by, раздзел «Інтэрактыўныя прэс-канферэнцыі») могуць задаць як непасрэдна ў вызначаны час, так і папярэдне (e-mail: press@mintrud.gov.by, факс (8 017) 306 38 84). Пры гэтым адказы будуць змешчаныя ў адкрытым доступе — на старонцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў інтэрнэце.

Сяргей ГРЫБ.

87-ГАДОВУЮ БАБУЛЮ АБАКРАЛІ «МЕДЫЧКІ»

Праз тры дні пасля візіту невядомых жанчын пенсіянерка выявіла, што з кватэры зніклі яе зберажэнні і каштоўнасці.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, пацярпелая звярнулася па дапамогу ў міліцыю ў мінулую суботу і паскардзілася, што дзве невядомыя жанчыны, якіх яна прыняла ў сябе ў кватэры ў сераду, выкралі ў яе 10 мільёнаў рублёў, больш за тысячу долараў ЗША, два залатыя гадзіннікі і каронкі. Дзейнічалі ж прайдзісветкі па «накатанай» схеме, пра якую неаднойчы ўжо папярэджвалі старых людзей і праваахоўнікі, і сродкі масавай інфармацыі: у дзверы кватэры пацярпелай, якая жыве ў адным з дамоў па праспекце Ракасоўскага, пазванілі невядомыя жанчыны і назваліся медыцынскімі работнікамі. Гаспадыня жылля паверыла ім на слова і ўпусціла ў кватэру. Такая неабачлівасць дорага ёй каштавала: махляркі, адцягнуўшы ўвагу бабулі, без усялякага сораму завалодалі чужымі накапленнямі. Пошукам нахабніц цяпер займаецца міліцыя.

Ігар ГРЫШЫН.

Бывай, таварыш Маўзер

Жыхар Кобрына, відаць, стаміўся захоўваць рарытэтную зброю і здаў яе ананімна. Чалавек патэлефанаваў у міліцыю, сказаў, што хоча здаць зброю і патлумачыў, дзе яе можна забраць. Ва ўмоўленым месцы міліцыянеры сапраўды знайшлі нямецкую вінтоўку ўзору 1898 года. Як засведчыла экспертыза, «Маўзер» знаходзіцца ў тэхнічна спраўным стане. Спецыялісты таксама выказалі меркаванне, што зброя выкарыстоўвалася як у Першую, так і ў Другую сусветныя войны.

Яна СВЕТАВА.

Гэта ж мы, Госпадзі

Селі выпіць каля крамы...

Ноччу каля крамы «Фартуна» 22-гадовы жыхар Брэста выпіў з беспрацоўнай, якая на 10 гадоў старэйшая.

Выпіўка закончылася сваркай, і хлопец пачаў біць жанчыну.

З пераломамі касцей чэрапа і траўмай мазгоў пацярпелую ў алкагольнай коме даставілі ў бальніцу.

Сабутэльніка затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Прамая лінія

ДАВЕДКА ЎРАЧА. А ЗАТЫМ — САЦЫЯЛЬНЫ РАБОТНІК

Не сакрэт, што ў цяжкай сітуацыі можа апынуцца кожны, таму тэма сацыяльнай падтрымкі застаецца актуальнай заўсёды. І яшчэ раз пераканацца ў гэтым давялося падчас нашай «прамой лініі» з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. На якія льготы можа разлічваць сям'я з дзіцем-інвалідам, у якіх выпадках аказваецца адрасная сацыяльная дапамога і даецца бясплатнае харчаванне малым дзецям, каму павінны былі рабіцца выплаты з нагоды юбілею Перамогі і што ўключаецца ў заробак пры разліку індывідуальнага каэфіцыента для прызначэння пенсій? Такім чынам, на гэтыя і іншыя пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Іван Пятровіч НАГІБІН, намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Рыта Валянцінаўна СУШКО, кансультант аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Яніна Станіславаўна ЛАДЫШАВА і галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Ірына Анатольеўна ДЗЯГА.

☎— Патлумачце, на якія льготы і выплаты можа разлічваць сям'я, што мае дзіця-інваліда 8 гадоў з другой ступенню страты здароўя?

Валянціна Мікалаеўна, *Бабруйскі раён.*

— Паводле заканадаўства, сем'і, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, могуць разлічваць на некалькі відаў выплат. Па-першае, гаворка пра сацыяльную пенсію на дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Падобная пенсія прызначаецца і выплачваецца штомесяц у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў памеры 60 працэнтаў бюджэту пражыткоўага мінімуму пры першай, у памеры 65 працэнтаў БПМ — пры другой, 75 працэнтаў БПМ — пры трэцяй і 85 працэнтаў БПМ — пры чацвёртай ступені страты здароўя. У прыватнасці, з 1 мая памеры гэтых пенсій складаюць адпаведна 146 140, 158 320, 182 680 і 207 030 рублёў.

Па-другое, у пэўных варунках такія сем'і атрымліваюць права на дапамогу па доглядзе дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у памеры 65 працэнтаў бюджэту пражыткоўага мінімуму (з 1 мая — 158 320 рублёў). Такая дапамога прызначаецца і выплачваецца штомесяц у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароны маці, бацьку, апекуну, папячыцелю ці іншай асобе, якая фактычна здзяйсняе догляд дзіця-інваліда і пры гэтым не працуе і не атрымлівае пенсіі.

Па-трэцяе, нялішне заўважыць, што сем'ям, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, дапамога на дзіця ва ўзросце больш за 3 гады выплачваецца з 40-працэнтнай надбаўкай. Падобная дапамога прызначаецца па месцы працы ці навучання маці (а калі маці не працуе і не вучыцца, то па месцы працы бацькі) незалежна ад ступені страты здароўя і атрымання іншых сацыяльных выплат, тых жа пенсіі па інваліднасці ці дапамогі па догляду дзіця-інваліда. Прычым варта звярнуць увагу: дапамога на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады тут прызначаецца на ўсіх дзяцей у сям'і без уліку сукупнага даходу за мінулы год пры ўмове занятасці бацькі ў поўнай або адзінага з бацькоў у няпоўнай сям'і. Іншымі словамі, дапамога на дзяцей ва ўзросце звыш 3 гадоў не прызначаецца, калі бацька ў поўнай або адзіны з працаздольных бацькоў у няпоўнай сям'і не працуе ў момант звароту і не працаваў больш за 6 месяцаў (атрымліваў дапамогу па беспрацоўі менш за 26 каляндарных тыдняў) у папярэднім перад зваротам годзе.

Далей. Бацькі, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, атрымліваюць стандартны падатковы вылік — у памеры 150 тысяч рублёў у месяц на кожнае дзіця. Пэўныя гарантыі вызначае і працоўнае заканадаўства. Так, паводле 265-га артыкула Працоўнага кодэкса, маці ці бацьку, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, на падставе заявы штомесяц даецца адзін дадатковы свабодны ад працы дзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Таксама маці (бацьку), якая выхоўвае дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, даецца адзін свабодны ад працы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Саветам Міністраў.

З бацькоў, якія маюць дзяцей-інвалідаў, не бярэцца плата за харчаванне, дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў павінны атрымліваць бясплатныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі.

Дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў маюць права на бясплатнае забеспячэнне лекамі, што выдаюцца на падставе рэцэптаў урача ў межах пераліку асноўных лекавых сродкаў у парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў.

Дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў маюць права на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне (пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў) або на аздараўленне (пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў). Пры гэтым асобы, што суправаджаюць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў у санаторна-курортныя ці аздараўленчыя арганізацыі, забяспечваюцца пуцёўкамі (без лячэння) бясплатна — пры ўмове, што неабходнасць такога суправаджэння пацвярджаецца заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

І нарэшце, таксама важны момант. Дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама асоба, якая іх суправаджае, маюць права на бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту (апроч таксі) незалежна ад месца жыхарства, а ў выпадку пражывання ў сельскай мясцовасці — таксама на аўтатранспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносінаў у межах свайго адміністрацыйнага раёна.

☎— Адкажыце, калі ласка, ці маем мы права на бясплатнае харчаванне дзіцяці ва ўзросце да двух гадоў? Муж пасля заканчэння ВНУ працуе па размеркаванні — з заробкам каля 400 тысяч рублёў. Я знаходжуся ў «дэкрэтным» і атрымліваю толькі дапамогу на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў.

Вікторыя Алегаўна, *г. Гомель.*

— Права на бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця маюць сем'і, у якіх сярэднедушавы даход у месяц не перавышае аднакі бюджэту пражыткоўага мінімуму. Прычым зноў жа з 1 мая БПМ адпавядае 266 230 рублям.

Узровень сярэднедушавога даходу разлічваецца за 6 месяцаў, якія папярэднічаюць звароту. Пры гэтым заява на бясплатнае харчаванне падаецца адным з бацькоў у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

☎— Ці ўваходзіць у абавязкі сацыяльнага работніка дапамога па апрацоўцы прысядзібнага ўчастка для жыхароў «прыватнага сектара» ў горадзе? І пра якую колькасць сотак зямлі тут можа ісці размова?

Антаніна Фёдараўна, *г. Мінск.*

— Пералікам бясплатных і агульнадаступных паслуг апрацоўка прысядзібных участкаў не прадугледжваецца. Інакш кажучы, чалавек, які знаходзіцца на надомным абслугоўванні, патрабаваць ад сацыяльнага работніка працаваць на сваім агародзе не можа. Разам з тым, тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва некаторых рэгіёнаў апрацоўкай прысядзібных участкаў сапраўды займаюцца — на ўмовах дадатковай аплаты.

☎— Мой ужо дарослы сын пасля хваробы застаўся інвалідам. Летась сын змог атрымаць пуцёўку ў санаторый, аднак сёлета тут узніклі праблемы. Чаму? Па-другое: ці можа хто-небудзь аказаць дапамогу нашай сям'і? І па-трэцяе. Як афарміць сына ў дом-інтэрнат, калі са мной што-небудзь здарыцца?

Ніна Пятроўна, *Валожынскі раён.*

— Паводле заканадаўства, пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў да санаторна-курортнага лячэння бясплатная пуцёўка інвалідам I і II групы варта выдавацца не больш чым раз у два гады. Такім чынам, калі бясплатная пуцёўка выдавалася летась, то сёлета наведаць санаторый можна толькі за ўласныя грошы. Дарэчы, можна заўважыць: продажам пуцёвак займаюцца непасрэдна здраўніцы.

Што да матэрыяльнай падтрымкі. Калі па ўзроўні даходаў прэтэндаваць на адрасную сацыяльную дапамогу нельга, то застаецца другі шлях — дапамога са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Пры наяўнасці па-сапраўднаму цяжкай сітуацыі дапамога са сродкаў сацыяльнага страхавання можа выплачвацца адзін раз на працягу года.

І наконт трэцяга пытання. Калі сын застанецца адзін, то ў дом-інтэрнат яго афармяць. Ніякіх праблем тут узнікнуць не павінна.

☎— Мая маці жыве адна, з'яўляецца інвалідам III групы і атрымлівае невялікую пенсію — крыху больш чым 300 тысяч рублёў. Ці можна ў такім выпадку разлічваць на адрасную сацыяльную дапамогу?

Зоя Аляксандраўна, *Слонімскі раён.*

— Штомесячная адрасная сацыяльная дапамога прызначаецца ў выпадку, калі даход чалавека ў месяц не перавышае аднакі бюджэту пражыткоўага мінімуму, які складае на сёння 266 230 рублёў. З улікам таго, што пенсія вашай маці ўсё ж вышэйшая, разлічваць на штомесячную адрасную падтрымку яна не можа.

Разам з тым, калі маці апынулася ў па-сапраўднаму цяжкім матэрыяльным становішчы, яна можа звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і напісаць заяву на аднаразовую адрасную сацыяльную дапамогу. Аднаразовую дапамогу можна атрымаць пры даходзе менш за 150 працэнтаў бюджэту пражыткоўага мінімуму (на сёння — менш за 399 345 рублёў у месяц), прычым сам памер аднаразовай дапамогі, у залежнасці ад сітуацыі, можа складаць да 500 працэнтаў БПМ.

Апроч таго, у выпадку цяжкага матэрыяльнага становішча ці неабходнасці значных выдаткаў (скажам, на набыццё паліва да зімы, набыццё дарагіх лекаў і г.д.) у тое ж упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароны маці зноў жа можа падаць заяву на атрыманне дапамогі са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

☎— Ці можа разлічваць на адрасную сацыяльную дапамогу сям'я, ва ўласнасці якой, апроч гарадской кватэры, ёсць стары дом у вёсцы, што дастаўся ў спадчыну ад бацькоў?

Святлана Казіміраўна, *г. Гродна.*

— Сям'я, якая мае ва ўласнасці больш чым адно жылое памяшканне, разлічваць на атрыманне штомесячнай адраснай сацыяльнай дапамогі не можа. Прычым незалежна ад таго, дзе знаходзіцца другое жылое памяшканне, які яго «ўзрост» і стан.

У той жа час пры наяўнасці ва ўласнасці больш чым аднаго жылога памяшкання ёсць магчымасць звярнуцца па аднаразовую адрасную сацыяльную дапамогу. Пры нізкім даходзе (менш чым 399 345 рублёў на чалавека ў месяц) і ўзнікненні па-сапраўднаму цяжкай сітуацыі такую дапамогу могуць прызначыць.

☎— Наша старэйшая дачка навучаецца ў Мінску, мае там часовую «прапіску». Ці ўлічваецца дачка ў складзе сям'і пры прызначэнні адраснай дапамогі?

Таццяна Сцяпанаўна, *Слуцкі раён.*

— Пры ўмове навучання на дзённай форме дачка ў складзе вашай сям'і ўлічвацца будзе. За выключэннем выпадку, калі дачка ўжо стварыла сваю сям'ю.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.
Фота аўтара.

(Заканчэнне будзе.)

А не шкодзь!

«Адзначыліся» машыніст з памочнікам

За некалькі дзён работнікі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі на вадаёме «Падгорнае» затрымалі за здабычу вузкапалых ракаў забароненым спосабам у перыяд забароны на іх лоўлю (яна дзейнічае да 15 ліпеня) некалькіх браканьераў, якія, калі глядзіш на лічбы, нібы арганізавалі спаборніцтвы: хто больш?

Два непрацуючых грамадзяніны здабылі 35 ракаў. Кіроўца ІП «Шаўчэнка» «ўпаляваў» 28. Качагар Фаніпальскай ЖКГ незаконна здабыў столькі ж. А «лідарамі» сталі машыніст і памочнік машыніста лакаматыўнага дэпо г. Баранавічы: 158 асобінаў вузкапалага рака. Вынік гэтага своеасаблівага «спаборніцтва» амаль падведзены: супраць двух непрацуючых грамадзян крымінальная справа ўжо заведзена, па астатніх фігурантах справы гэтае пытанне разглядаецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Невадам з меліярацыйнага канала...

У меліярацыйным канале каля в. Федзюкі (Ляхавіцкі раён) супрацоўнікі міжрайінспекцыі затрымалі трох работнікаў «Баранавіцкай птушкафабрыкі», якія лавілі рыбу невадам. Браканьеры злавілі 162 рыбіны, і цяпер іх чакае вялікі штраф.

А на возеры Альшанскае ў Столінскім раёне вадзіцель фермерскай гаспадаркі «Альшанская Слабада» і двое беспрацоўных вудзілі рыбу з дапамогай электратоку.

Давядзецца адказваць і іншынеру Іванаўскага райпа, які з напарнікам браканьерыў у кар'ерах «Разліві» каля в. Опаль. Яны сеткамі, якія мелі даўжыню 400 метраў, выцягнулі 50 кг рыбы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

А не лаві самоў падчас забароны!

Забарона на лоўлю звычайнага сама ў рыбалоўных угоддзях краіны ўступіла ў сілу нядаўна — з 1 чэрвеня. Аднак гэта не спыняе браканьераў.

Так, вадзіцель Старадарожскага сыркамбіната і кантралёр ПС-750 «Беларускае» былі затрыманыя на вадасховішчы «Любанскае» за здабычу рыбы сеткамі. У парушальнікаў былі канфіскаваныя дзве сеткі агульнай даўжынёй 180 метраў і 106 асобінаў розных відаў рыб. У тым ліку чатыры самы, лавіць якіх зараз нельга.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Анатоля Клешчука

Сенакосны эскорт

Жыхар вёскі Бабінавічы Лёзненскага раёна Яўген Багдановіч вяртаецца з першага сенакосу.

ЗАБАРОНУ НА КУПАННЕ ЛЕПШ НЕ ІГНАРАВАЦЬ

Летняе надвор'е паступова выпраўляецца, і на гэтым тыдні слупок тэрмометра зноў «завісне» каля 30-градуснай адзнакі. Таму можна не сумнявацца, што многія беларусы накіруюцца ў бліжэйшыя дні да вадаёмаў. Аднак колькасць месцаў, бяспечных для купання, ужо пачала скарачацца.

З-за неадпаведнасці пробаў вады мікрабіялагічным паказчыкам купанне забаронена ў Брэсцкай вобласці на пляжы ракі Лясная ў Камянцы і ў зоне адпачынку возера Катэра, што ў Камянецкім раёне. У Віцебскай вобласці небяспечнымі для купання з'яўляюцца зоны адпачынку азёраў Янава, Шчаты, возера Гомель і возера Суя — усе гэтыя вадаёмы размешчаны на тэрыторыі Полацкага раёна. У Гомельскай вобласці забаронена купанне ў вадаёмах у населеных пунктах Камунар, Дуравічы, Крыўск, Кашалёва, Чырвоны Сцяг і Патапаўка. Усе яны знаходзяцца ў Буда-Кашалёўскім раёне. У Калінкавічах — у зоне адпачынку гарадскога парка «Перамога».

У Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцях і ў Мінску для купання пакуль адкрыты ўсе месцы. Асноўная прычына забароны на выкарыстанне вадаёмаў для купання і заняткаў воднымі відамі спорту — перавышэнне дапушчальнага ўтрымання ў вадзе лактозных кішэчных палачак. Пры выпадковым заглытванні такой вады ў купальшчыкаў могуць развіцца кішэчныя расстройствы, таму спецыялісты раяць забарону на купанне не ігнараваць.

У купальны сезон бактэрыялагічныя паказчыкі вады даследуюцца прыкладна раз у тыдзень.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Хваробы стагоддзя

Дзікі вірус поліяміэліту мяжу Беларусі пакуль не перайшоў

Усвеце зноў успомнілі пра поліяміэліт, успышка якога адбылася ў Таджыкістане ў пачатку гэтага года, калі захварэла некалькі соцень дзяцей, а ўжо ў маі былі пацверджаны выпадкі яго завозу ў Расію, прычым захварэла ўжо і маленькая расіянка, у якой не было прышчэпкі. На сёння праблема па-ранейшаму застаецца актуальнай. Хвароба сапраўды небяспечная і можа скончыцца паралічам, а ў асобных выпадках магчымы ляталь-ны зыход. Больш падрабязна пра гэту грозную інфекцыю нам расказаў загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт, заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь Анатоль АСТАПАЎ.

— Поліяміэліт — гэта інфекцыйнае захворванне, якое выклікаецца вірусам. Ён пашкоджвае нервовую сістэму, а потым можа выклікаць параліч цягліц. Вірус трапляе ў арганізм праз рот і размнажаецца ў кішэчніку. Пераважна гэта захворванне дзіцячага і падлеткавага ўзросту.

Каварства хваробы ў тым, што яна спачатку працякае пад маскай іншых распаўсюджаных хвароб. Таму, на жаль, дыягностыка поліяміэліту амаль заўсёды, калі ўзнікаюць паралічы, бывае позняй. Выдзяляюць наступныя перыяды цячэння захворвання: прэпаралітычны, паралітычны, аднаўленчы і астаткавых з'яў. У прэпаралітычны перыяд няма сімптомаў, якія паказвалі б на гэту цяжкую інфекцыю. Могуць быць толькі лёгкія катаральныя з'явы: пакашліванне, закладзенасць носа, пяршэнне ў горле, невялікая дысфункцыя кішэчніка, павышэнне тэмпературы. А парэз і потым параліч узнікаюць раптоўна. Як мы звычайна гаворым «праз ноч»: ноч чалавек пераспаў, а раніцай устаць ужо не можа.

Наступствы поліяміэліту вельмі цяжкія па той прычыне, што пры паралітычных формах хваробы лятальнасць будзе ў 10 % хворых дзяцей, нават пры сучасных метадах лячэння, а ў 40 % захварэлых бываюць астаткавыя з'явы ў выглядзе інвалідызацыі. Поліяміэліт можа прывесці да паралічу рукі, нагі, а потым укарачэння канечнасцяў.

— Як можна засцерагчыся ад гэтай хваробы?

— Толькі пры дапамозе вакцынацыі. Звернемся да гісторыі пытання. У 1954 годзе ў СССР пачалася эпідэмічная распаўсюджванасць поліяміэліту. У сярэдзіне 50-х рэгістравалася ад 10 да 13,5 тысячы выпадкаў захворванняў гэтай інфекцыяй. А да 1958 года захваральнасць на поліяміэліт дасягнула 10,7 выпадка на 100 тысяч насельніцтва. А калі ўлічыць, што ў асноўным хварэюць дзеці, то сярод іх захваральнасць была ў дзясяткі разоў большай. Тады ж пачалася масавая вакцынацыя. Для яе выкарыстоўвалася жывая аслабленая вакцына, г.зн. тая, якая не выклікае захворвання на поліяміэліт, а выпрацоўвае добры абарончы імунітэт. Аднак па меры выкарыстання вакцыны высветлілася, што ў дзяцей з імунадэфіцытам гэты вакцынны штам можа выклікаць поліяміэліт. І хоць такія выпадкі былі адзінкавымі, усё ж вырашылі выкарыстоўваць інактыўную поліяміэлітную вакцыну, якая абараняе чалавека індывідуальна. Яна прымяняецца і цяпер.

Дзякуючы вакцынацыі поліяміэліт поўнасцю ліквідаваны ў Беларусі. 21 чэрвеня 2002 года мы атрымалі сертыфікат Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, які сведчыць, што наша тэрыторыя свабодная ад цыркуляцыі дзікага віруса поліяміэліту. Таму ў Беларусі не можа быць мясцовага распаўсюджвання хваробы. Але ёсць рэальныя шанцы завозу поліяміэліту да нас. Асабліва, улічваючы сітуацыю, якая склалася ў Таджыкістане, а міграцыя з гэтай краіны даволі вялікая. І хоць пакуль выпадкаў завозу інфекцыі няма, эпідэміёлагі, інфекцыяністы, санітарныя ўрачы ўсё адно застаюцца напагатове.

— Якія захады робяцца для таго, каб не дапусціць завозу і распаўсюджвання інфекцыі на тэрыторыі нашай краіны?

— У нас ёсць Нацыянальны цэнтр па сачэнні за вострымі і вялымі паралічамі. У ім абследуюцца дзеці з падазрэннем на поліяміэліт, каб своечасова выявіць і не прапусціць ніводнага выпадку завозу дзікага віруса.

Праводзіцца сучасная вакцынацыя супраць поліяміэліту асобаў, якія выязджаюць у рэгіёны, дзе рэгіструюцца выпадкі інфекцыі. Арганізавана аднаразовая вакцынацыя аральной поліяміэлітнай вакцынай дзяцей да 15 гадоў, якія прыехалі з Таджыкістана, незалежна ад іх вакцынальнага статусу.

Арганізавана абследаванне дзяцей да 15 гадоў, якія прыехалі з Таджыкістана, на наяўнасць поліявіруса з дастаўкай матэрыялу ў Нацыянальны рэферэнсцэнтр па поліяміэліце для даследавання. Праведзены інструктажы з супрацоўнікамі памежных, мытных, чыгуначных службаў, экіпажамі паветраных суднаў наконт іх дзеянняў у выпадку выяўлення асобаў з прыкметамі інфекцыі.

Важна таксама і самім грамадзянам ведаць і прытрымлівацца пэўных мераў гігіены: захоўваць чысціню, мыць рукі, не есці брудную садавіну, не купацца ў вадаёмах, дзе вада сумнеўнай чысціні. Узбуджальнік можа жыць па 2—4 месяцы ў прадуктах, вадзе, не баіцца высушвання і замарозкі. Але хутка гіне пры награванні. Таму сухафрукты, арэхі, зяленіва варта абліваць кіпенем.

Аднак самай надзейнай мерай супраць поліяміэліту ўсё ж застаецца вакцынацыя. Вакцынаванаму чалавеку хвароба не страшная. І бацькам не варта адмаўляцца ад прышчэпак, калі яны не хочуць рызыкаваць жыццём сваіх дзяцей.

Каляндар прафілактычных прышчэпак супраць поліяміэліту выглядае так: першая робіцца інактыўнай поліяміэлітнай вакцынай у тры месяцы, потым у 4 і 5. У 18 месяцаў уводзіцца аральная поліяміэлітная вакцына, яна ж робіцца ў 24 месяцы і апошні раз у 7 гадоў.

— Цяпер ідзе час водпускаў. Многія людзі едуць адпачываць за межы Беларусі. У сувязі з тэмай нашай размовы скажыце, у якіх яшчэ краінах, акрамя Таджыкістана, неспрыяльнае становішча па поліяміэліце?

— Эндэмічнымі краінамі, дзе пастаянна сустракаецца поліяміэліт, выкліканы дзікім вірусам, з'яўляюцца Індыя, Пакістан, Афганістан, Нігерыя. За 4 месяцы 2010 года зарэгістраваны выпадкі хваробы яшчэ і ў 8 іншых краінах: натуральна Таджыкістане, Сенегале, Ліберыі, Малі, Сьера-Леоне, Маўрытаніі, Непале і Чадзе.

Гутарыла Вольга ШАЎКО.

КАКАВА — ЛЕПШЫ СЯБРА СПАРТСМЕНАЎ

Амерыканскія навукоўцы ўстанавілі, што халодная какава (шакаладнае малако) аднаўляе мышцы пасля фізічных практыкаванняў хутчэй, чым спецыяльныя напоі, прызначаныя для спартсменаў. Навукоўцы правялі чатыры даследаванні, у ходзе якіх параўноўвалася хуткасць аднаўлення мышцаў пасля працяглых фізічных нагрузак пры спажыванні розных напояў. Аналізуючы атрыманыя звесткі, даследчыкі прыйшлі да высновы, што лепшым напоем з'яўляецца менавіта какава.

Як сцвярджаюць аўтары даследавання, какава ўтрымлівае неабходную для аднаўлення мышцаў колькасць бялкоў, а таксама вугляводы, якія папаўняюць энергетычны запас мышачных тканак. Акрамя таго спажыванне шакаладнага малака аднаўляе запас вады, а таксама калію, кальцыю і магнію, якія выдзяляюцца потавымі залозамі пры фізічных нагрузках. Раней аўстралійскія навукоўцы высветлілі, што добра спрыяе аднаўленню мышцаў таксама спажыванне салодкай кавы. Кафеін дапамагае мышцам засвойваць глюкозу і значна павялічвае хуткасць аднаўлення запасаў глікагену ў мышцах пасля цяжкіх фізічных нагрузак.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | перааддрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрапрас, кухонны камбайн, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **6 ліпеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 ліпеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 22.05.10 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 22.05.10 па 30.09.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1694 ад 13.05.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

9 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____

(аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2010 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____

(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ЛЕГЕНДАРНЫ АРКЕСТР... ДЛЯ АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ

ТАК КАЖА пра Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі расійскі дырыжор Яўген Бушкоў, які не так даўно ўзначаліў калектыў. Аркестр, які ўжо меў вопыт працы з запрошанымі замежнымі дырыжорамі. Зрэшты, у сусветнай практыцы гэта распаўсюджаная з'ява. Але ёсць адзін момант: гэтага дырыжора не столькі прызначылі, колькі яго абраў сам беларускі калектыў. І не толькі таму, што бачыў у ім зорку — славутага скрыпача, лаўрэата прэстыжных міжнародных конкурсаў. Бо адчуваў асобу, якая мела вопыт працы ў якасці дырыжора з рознымі калектывамі. Чаго варты адзін толькі радок у яго біяграфіі: другі дырыжор і партнёр Юрыя Башмета ў аркестры «Новая Расія». Аднак у нас, у Беларусі, разам з прыходам новага дырыжора чакаюць уздыму калектыву, лёс якога цяпер у яго руках.

— Мне прыемна, што ініцыятыва запрасіць мяне сыходзіла ад калектыву, ад музыкантаў, — тлумачыць **заслужаны артыст Расіі Яўген БУШКОЎ**. — У нас была невялікая, але бурная перадгісторыя ўзаемаадносінаў, калі мы сыгралі некалькі праграм на працягу двух гадоў. З'явіліся ўмовы для таго, каб далейшая сумесная творчасць давала добры вынік. Для мяне пры прыняцці станоўчага рашэння галоўным быў адзіны рэзон — творчы.

— Магчыма, музыканты вас палюбілі як калегу-скрыпача?

— Не бяруся меркаваць дакладна, напэўна, дзейнічае комплекс абставінаў, узаемная сімпатыя. Напэўна, ёсць і такі нюанс: гэта як размаўляць з чалавекам на адной мове, бо калі з музыкантамі камернага аркестра працуе струннік, у калектыву і кіраўніка больш кропак сутыкнення. Таму што дырыжор мае ўяўленне пра тое, як ідзе праца, у дэталях.

— Вы былі вядомы як музыкант, але вырашылі змяніць прафесію на дырыжорскую. У вас былі для гэтага асабістыя матывы?

— Былі некаторыя прычыны, у выніку якіх я павінен быў адмовіцца ад далейшай скрыпічнай дзейнасці і заняцца выключна дырыжыраваннем. Гэта дало пэўны вынік. Мой першы прафесар па дырыжыраванні Дзмітрый Кітаенка, калі я наведваў яго ў Швейцарыі, дзе ён быў галоўным дырыжорам у Берне, казаў: «Трэба вызначыцца, ці вы хочаце быць дырыжорам і сур'ёзна займацца гэтай прафесіяй, ці вы хочаце як большасць — і нашым і вашым. Але тады нам не па дарозе...» І я дапускаю, што вынік, якога я дасягнуў за апошнія дзесяць гадоў, займаючыся толькі дырыжыраваннем, больш значны, чым калі б я працягваў іграць на скрыпцы.

— Вы прыйшлі ў аркестр, які доўгі час знаходзіўся ў пошуку, у тым ліку кіраўніка. Як лічыце, ці паўплывала гэта на ўзровень аркестра?

— Тут было б правільна казаць вось пра што: кожны калектыў, які існуе ў любой краіне, перажывае (хоча ён таго ці не) пасіянарныя перыяды. Калісь быў створаны аркестр Рудольфа Баршая, які не меў роўных у Савецкім Саюзе ў 60-я гады. Аркестр перажыў магутны ўзлёт, а потым адбыўся спад пасіянарнага вітка, таму што гэта непазбежна. І ў 79-м годзе з'явіўся аркестр «Віртуозы Масквы». Ідэя Співакова была абсалютна падобная на ідэю Баршая, аркестр якога да таго моманту здаў. Частка музыкантаў, якія гарэлі душой, перайшлі да Співакова. Я як музыкант ніколі не працаваў у калектывах, але адзінае выключэнне, якое ў мяне было на працягу некалькіх месяцаў — калі я дапамагаў, замяняючы музыканта «Віртуозаў Масквы». Незабыўныя некалькі месяцаў пражыў, таму што ў калектыву Співакова гэта быў зорны час, які доўжыўся 12 гадоў. Далейшая іх творчасць ужо не тая, хоць аркестр застаўся на вельмі высокім узроўні, разросся, прыйшлі маладыя музыканты...

У Мінскага камернага аркестра быў свой зорны перыяд. Зараз калектыў укамплектаваны, магчыма, не самым лепшым складам музыкантаў — у параўнанні з тым, які быў у 70-я — пачатку 80-х, калі з ім супрацоўнічаў Святаслаў Рыхтэр. Мне трапіўся запіс выступлення аркестра з дырыжорам Юрыем Цыруком у Вялікай зале кансерваторыі — гэта той канцэрт, на якім я быў як слухач у яшчэ юным узросце. Я памятаю той аркестр, мне нават даводзілася выступаць, іграць на скрыпцы разам з аркестрам, калі ім дырыжыраваў Цырук. Я быў пад глыбокім уражаннем ад знаёмства з гэтым музыкантам і лічу, што менавіта ён давёў аркестр да пэўнай вышэйшай пазіцыі ў сваім развіцці.

Сёння аркестру 42 гады, у ім змянілася некалькі пакаленняў. Але зараз яшчэ ў яго складзе ёсць людзі, якія памятаюць мяне як скрыпача ва ўзросце 15—16 гадоў... Мы цяпер маем тое, што маем. Нельга сказаць, што нейкі перыяд трэба выкрасліць з жыцця.

— Ці маеце вы магчымасць уплываць на кадравы склад аркестра?

— Я яшчэ вельмі мала працую, каб гэтае пытанне ўзняць. Але я так уяўляю, што ў абавязкі мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора ўваходзіць клопат пра тое, каб кадравы склад быў аптымізаваны. Аднак мы паглядзім: ці можна нічога не мяняючы дасягнуць нейкіх вынікаў? Бо кадравыя перастаноўкі даволі балючыя для такога невялікага калектыву, як наш. Тут склалася супольнасць, людзі даўно сябруюць...

— Вы вырашаеце, што іграць на канцэртах?

— Пакуль што так. Што мы збіраемся зрабіць на будучы сезон — арганізаваць абанементныя серыі. Таму што спроба праду гледзець некаторыя рэчы і запланаваць іх адкрывае магчымасць для прыцягнення добрых музыкантаў да супрацоўніцтва. І яшчэ: квіткі, якія трапляюць у продаж загадзя, — крыніца гарантаванага даходу, эканамічна абгрунтаваная рэч.

Адным з першых пачаткаў, якія здзівілі мясцовую аўдыторыю, было тое, што я ўзяўся дырыжыраваць першым канцэртам з абанемента «Іграем з аркестрам». Я на працягу апошніх 7 гадоў вельмі апантана займаюся дзіцячымі праграмамі ў Маскве, у мяне быў свой абанемент — дзіцячы, які адрозніваўся ад іншых. І ў Мінску планую пачаць з наступнага сезона. Дзіцячыя абанементы ў ідэале існуюць для дзяцей, але гавораць пра рэчы, якія цікавыя іх бацькам. Абанементы прадугледжваюць не толькі выкананне музыкі дзецьмі, яны важныя дзеля прыцягнення маленькай публікі, якая праз некалькі гадоў папоўніць шэрагі дарослых слухачоў. Калі даць пазітыўныя эмоцыі, то дзеці потым будуць хадзіць на канцэрты. Я памятаю, што ў маім дзяцінстве, хоць я займаўся прафесійна музыкай, я наведваў вялікую колькасць канцэртаў, пасля якіх у мяне не было ніякага жадання хадзіць ні ў оперу, ні на дзіцячыя канцэрты ў філармонію.

Зразумела, ільвіная доля прынятых рашэнняў у калектыве выпадае на мяне, таму што мне самому даводзіцца весці перамовы з тымі людзьмі, якіх, я лічу, мэтазгодна запрасіць — і дзеля музыкі, і дзеля публікі. Як правіла, гэтым займаецца галоўны дырыжор. Што тычыцца рэпертуарнай палітыкі, то маюць права сказаць сваё слова і музыканты, у якіх ёсць свае ярка выражаныя зацікаўленасці, нейкія любімыя творы, мары. На мастацкай радзе выказваюцца пажаданні, нехта прыносіць ноты. Я адкрыты і страшна люблю ініцыятыву, як музычную, так і выканальніцкую. Бо зразумела, што музыканты хочуць граць сола. Таму ў наступным сезоне, магчыма, 75 працэнтаў музыкі выбрана з маіх прапаноў, а 25 прыходзіцца на долю музыкантаў. Безумоўна, абанементы будуць складзеныя з улікам і розных кашалькоў, і розных густаў слухачоў. У кожным з абанементаў будуць прывабныя імёны для аўдыторыі — дырыжоры, салісты. Мы будзем іграць і музыку новую, і музыку папулярную.

— Ці ёсць у вас жаданне даносіць новую беларускую музыку беларускаму слухачу?

— Я думаю, што не зусім правільна — выносіць у асобную графу выкананне новай музыкі ці толькі беларускай, ці толькі замежнай. Пры складанні абанементных праграм, якія звязаныя з прэм'ерай, будзем старацца, каб былі творы, якія прыцягваюць слухача. Як у савецкія часы быў гандаль у нагрузку: вы хацелі набыць шпроты, а вам падсоўвалі бычкі ў тамаце. Лепшай прапаганды сучаснай музыкі — не толькі беларускай, але і сусветнай — гісторыя не ведае. Мы не будзем ставіць у галаву, каб абавязкова была беларуская музыка — яна найперш павінна быць цікавай. Аднак літаральна з першых дзён, калі мяне прызначылі на гэтую пасаду, я атакаваны кампазітарамі, прапановамі, творамі. Акрамя таго, я цікаўлюся тым, што выконваецца вакол, прыкмячаю для сябе імёны, якія мне здаюцца цікавымі. Калі я ў Мінску і рэпецірую з калектывам, то вечарамі, як правіла, я хаджу на канцэрты. Мне цікава: хачу пазнаёміцца з маладымі выканаўцамі. Было цікава паглядзець канцэрт з фіналістаў «Еўрабачання», каб было зразумела, чым краіна ганарыцца, каго яна пасылае на конкурсы, як гэта адбываецца...

— Вы не жывяце ў Беларусі ўвесь час. Ці ёсць у вас у аркестры намеснік?

— Намесніка няма. Наш эканамічны стан не можа гэтага дазволіць. У нас ёсць кампетэнтны канцэртмайстар аркестра, які ў стане весці падрыхтоўчую працу, робіць гэта прафесійна і па сумяшчальніцтве з'яўляецца другім дырыжорам. У нас пакуль што няма магчымасці і неабходнасці заводзіць мне дубліёра. Таму што гэты аркестр — механізм вельмі патрабавальны. Паставіць маладога чалавека, каб ён набіваў сабе руку на гэтым калектыве, на жаль, немагчыма. Бо першае, што адчуваюць музыканты — розніцу ў вопыце. У нас рэпетыцыі ідуць такім чынам, што разам са мной фарміруюцца мастацкія напрамкі ў авалоданні матэрыялам. Потым ідзе тэхнічнае авалоданне гэтымі творамі, шліфоўка. Вынікі могуць быць і без маёй штодзённай прысутнасці.

— Як мяркуеце арганізоўваць гастролі — дзякуючы клопату філармоніі, ці ўласным кантактам?

— Філармонія — гэта арганізацыя, якая дае калектывам дах у літаральным сэнсе, яна не займаецца арганізацыяй творчай дзейнасці. Усе калектывы самі імкнуцца знайсці кантакты. Гэта была адна з першых прадмоў, якую я сказаў, прыйшоўшы на працу. Насычанае гастрольнае жыццё — гэта праца не аднаго года. Я жыў доўга за мяжой, сам вёў актыўную гастрольную дзейнасць, у мяне быў генеральны менеджмент у Аўстрыі. Ведаю, што гэтая машына працуе па прынцыпе махавіка: доўга трэба раскручваць, але потым яна сама добра круціцца. У нашым аркестры зараз гэтая машына не працуе, нягледзячы на асобныя выезды на гастролі. І цяжка сказаць, наколькі паспяховымі будуць нашы спробы выйсці зноў на міжнародны рынак. Патэнцыял у нас ёсць, хоць, можа, зараз не самы зручны час, каб выскокваць за мяжу: там вельмі высокі ўзровень канкурэнцыі. Першая замежная паездка ў нас запланавана ў Маскву напрыканцы года, у зручны час для наведвання канцэртаў. Я думаю, усё павінна супасці — з'яўленне піку формы і цікавасць для заходніх імпрэсарыа. З некаторымі з іх у мяне ёсць нядрэнныя кантакты. Вы ведаеце, што эканамічны крызіс ударыў па культуры і мастацтве. Натуральна, што людзі, якія былі ў бізнэсе, даволі асцярожна ставяцца да таго, каб вывозіць некуды нейкія калектывы. Хоць у беларускіх калектываў ёсць перавагі: яны выязджаюць на ўмовах, якія найбольш спрыяльныя для арганізатараў з пункту гледжання эканомікі.

— Музычны калектыў — брэнд краіны. Ці адчуваеце вы зацікаўленасць краіны ў прасоўванні гэтага брэнда?

— Я яшчэ юнак у ролі мастацкага кіраўніка, не маю досведу ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі структурамі. Аднак я з вялікім пафасам стаўлюся да ролі такога калектыву як Беларускі дзяржаўны камерны аркестр. Я лічу, што аркестр падобнага класа, які існуе ў краіне на працягу 42 гадоў — гэта прадмет для нацыянальнага гонару. Гэта адзін з самых каштоўных экспартных прадуктаў, якія стварыла Беларусь. Нягледзячы на алімпійскі медаль у фрыстайле. Калі б былі алімпійскія гульні для музычных калектываў, я ўпэўнены, што гэты аркестр пазмагаўся б за медалі, прычым, у разрадзе найстарэйшых еўрапейскіх аркестраў. Такіх аркестраў няшмат. Таму я лічу, што менавіта такога роду калектывы, якія ўяўляюць сабой па вялікім рахунку годны сусветны ўзровень, павінны лічыцца нацыянальным здабыткам краіны. Безумоўна, павінны мець ільготы, звязаныя з падтрымкай іх гастрольнай дзейнасці. Наколькі я зразумеў, гэтым аркестрам ганарацца ў Беларусі, бо ён меў шэраг важных канцэртаў у краіне і за яе межамі. Спадзяюся, што дойдзе час да таго, калі аркестр атрымае званне «Заслужанага калектыву» рэспублікі. Гісторыя ў яго багатая — можна нават больш нічога не дапісваць...

Ларыса ЦІМОШЫК.

«Мефіста» на службе ў беларускіх кампазітараў

Балет Уладзіміра Кандрусевіча адкрые дарогу ў музычны тэатр беларускім аўтарам

Пастаноўкі на музыку беларускіх кампазітараў — рэдкая з'ява сёння ў рэпертуары Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Балет «Мефіста» (прэм'ера якога адбудзецца 26 і 30 чэрвеня) мусіць стаць бадай рэвалюцыйнай падзеяй — з яе, абяцае новае кіраўніцтва тэатра, пачнецца актыўнае супрацоўніцтва тэатра з беларускімі кампазітарамі.

«Мефіста» Уладзіміра Кандрусевіча ў пастаноўцы Уладзіміра Іванова — гэта новая сцэнічная версія балета, які быў пастаўлены ўпершыню ў 2002 годзе. Сёлетняя пастаноўка абяцае захаваць усё найлепшае з папярэдняй, але і дадаць новага гучання ў музыку, новага прачытання ў пластыку.

— Музыка знаёмая, але змянілася канцэпцыя. Змянілася харэаграфія, асабліва масавых сцэн, — распавядае Віталь Краснаглазаў, выканаўца ролі Мефіста. — Наогул, калі першая пастаноўка — гэта неакласіка, то другая — гэта практычна сучасны балет.

Вярнуцца да балета «Мефіста» вырашыла кіраўніцтва тэатра. З прапановай да Уладзіміра Іванова звярнуўся галоўны балетмайстар Дзмітры Якубовіч.

— Калі гэты балет упершыню пабачыў Елізар'еў, — узгадвае балетмайстар-пастаноўшчык Уладзімір Іваноў, — ён сказаў, што гэта падзея для рэспублікі. А новая пастаноўка, мне здаецца, атрымаецца яшчэ больш цікавай за папярэднюю.

Ад музыкі Уладзіміра Кандрусевіча, які крыху змяніў па просьбе Іванова кампазіцыю, характар гуку, чакаюць меладычнай эксперыментальнасці і душэўнасці. Сам кампазітар гаворыць, што з Уладзімірам Івановым яны знаёмыя амаль сорак гадоў. І дадае: «Знайсці калегу, аднадумца — гэта пяцьдзясят працэнтаў поспеху творчай працы». У музыцы Кандрусевіча да балета на «вечную» тэму змагання дабра са злом разам з класічнымі гукамі суіснуюць гукі сінтэтычныя. Кампазітар актыўна скарыстоўвае ў практыцы так званыя новыя музычныя тэхнікі.

— Калі тэатр толькі пачынаў сваю творчую дзейнасць, у яго рэпертуары было вельмі шмат праграм беларускіх кампазітараў, — кажа Вольга Мікалаеўская, загадчык літаратурнай часткі. — Новае кіраўніцтва тэатра збіраецца адрадзіць гэтую вартую традыцыю.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

«Твайму лету — крылатая песня...»

Чэрвень ва ўніверсітэцкім жыцці на журфаку вылучаецца інтэлектуальнай напружанасцю: выкладчыкі пасля прачытаных лекцый заклапочаныя напісаннем рэцэнзій на дыпломныя працы, падвядзеннем вынікаў у складана-турботнай рэйтынгавай сістэме; студэнты становяцца мітуслівымі і надзвычай ветлівымі. У гэты час журфак нагадвае рой, дзе замест планамернага запаўнення аўдыторый, што звяраецца нават па хвілінах, назіраецца, на першы погляд, хаатычнае «хаджэнне па муках». Аднак, калі прыгледзецца, то кожны мае свой крок: ці «здаваць» веды, ці «прымаць» іх. У бурлівым віры нараджаюцца лёсы людзей — будучых тэлезорак, галоўных рэдактараў, рэвалюцыянераў у медыйным інтэрнэце, мэтраў журналістыкі. Гэта пакуль яны першакурснікі, другакурснікі...

У чэрвеньскі час можна быць і незаўважаным, настолькі ён напоўнены энергіяй, якая, здаецца, б'е праз край. Аднак адно чэрвеньскае свята для кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання асабліва важнае, бо напоўнена вялікай павагай, любоўю і ахоўнай сілай. Імя кафедральнаму святу, а сёння і ўніверсітэцкаму, — дзень нараджэння дацэнта Ангеліны Аляксандраўны Рудэнкі. Учытаемся ў віншавальныя словы:

*Р**ужовая ружа уранку*
*У** небе світальным плыла.*
*Д**зень ціха спяваў калыханку,*
*Э**поха табой прарасла...*
*Н**а свет нараджалася песня,*
*К**аціўся дарожны клубок,*
*А**рліў у святым паднябессі*
*А**нёльскі — твой першы дзянёк.*
*Н**ібыта грацыя-таполя,*
*Г**армонія ўсіх дзіўных чар —*
*Е**жэ-есі! — па Божай волі*
*Л**юляеш сонечны абшар!*
*І**мкнуць удалеч дні, гады,*
*Н**язведаных дарожак многа...*
*А**нгельск, век твой малады,*
Малітвай нашаю да Бога:
Жыццё у велічнай красе
Пад сонцам велічна красуе,
Хай ружа ў Небесі плыве,
Хай божы свет Цябе мілуе!..

Так пісаў легендарны для журфака Мікола Рыгоравіч Каваленка. Яго акраверш умясціў уласцівую яму летуценнасць і невычэрпныя сяброўскія пачуцці, услаўленне выкладчыцкага таленту, замацаваў, «выбіў» у слове імя і прозвішча сваёй любай калегі.

Калі б сабраць юбілейныя словы ўдзячнасці ад вучняў на адрас Ангеліны Аляксандраўны, то яны загучалі б мілагучнымі званіцамі ў кожнай рэдакцыі радыё і тэлебачання, зазіхацелі б чыстай росіцай у кожным газетным радку. Аўтарытэт, кампетэнтнасць, высокі прафесіяналізм, прыцягальная сіла майстэрства ствараць тэкст і пры гэтым захоўваць адмысловую культуру яго арганізацыі — тое, што перш за ўсё прыцягвае студэнтаў у асобе свайго настаўніка.

Амаль пяцьдзясят гадоў аддадзена працы са студэнтамі. Рабілася гэта і робіцца цяпер з вялікім пачуццём годнасці. Ангеліна Аляксандраўна для сваіх маладзейшых калег з'яўляецца ўзорам прызвання і выканання свайго грамадзянскага абавязку. За яе чатырнаццацігадовы час працы намеснікам дэкана была закладзена новая метадычная база падрыхтоўкі журналістаў, створана новае пакаленне адукацыйных стандартаў, адкрыты новыя спецыяльнасці. Яна гартавала поспех кожнага дэкана, намесніцай якога была. Навукова-метадычная дзейнасць Ангеліны Аляксандраўны стала трывалым падмуркам паспяховага развіцця сучаснага Інстытута журналістыкі.

Уласны метадычны багаж А.А. Рудэнкі за апошнія гады папоўніўся комплексам вучэбных дапаможнікаў па сучаснай рускай мове для студэнтаў-журналістаў, які складаецца з трох кніг і мае вялікае навукова-метадычнае значэнне для журналісцкай адукацыі краіны. Ангеліна Аляксандраўна карпатліва працуе над новай кнігай...

У кабінеце Ангеліны Аляксандраўны за час яе намесніцтва перабывала сотні людзей. Ад масцітых прафесараў, якія раіліся з ёй, як трэба прыступіць сваіх выхаванцаў, каб хадзілі на заняткі; бацькоў, абыякавых да вучобы студэнтаў, і саміх студэнтаў з часам выдуманымі гісторыямі (каб толькі дапусціла да сесіі) да рознага рангу правяральшчыкаў. Кожнаму з іх яна знаходзіла сваё асаблівае слова, у якім былі паразуменне і няўлоўная сіла яе вытанчанага псіхалагізму. Пад добразычлівым і ў той жа час пранізлівым позіркам рассейваліся выдуманыя гісторыі, прасвятляліся галовы бацькоў, знаходзіліся адказы на складаныя і вельмі складаныя пытанні. Мудрасць Ангеліны Аляксандраўны і сёння мацуе нас...

Дарагая Ангеліна Аляксандраўна, няхай сёння сагрэюць Вас віншаванні, пажаданні, прызнанні калег і вучняў!

Загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, доктар філалагічных навук, прафесар Віктар ІЎЧАНКАЎ.

Звяздоўцы далучаюцца да самых цёплых віншаванняў. Дзякуй Вам за ўсё, шаноўная Ангеліна Аляксандраўна! Здароўя і заўсёднага творчага плёну!

ШКОЛА ТРОХ МУЗЕЯЎ

— Якраз гэткімі днямі, толькі ў 1933 годзе, у нашых мясцінах быў Янка Купала, — кажа настаўніца беларускай мовы і літаратуры, завуч Камунараўскай сярэдняй школы Любанскага раёна Людміла Варабей. — Таму наш літаратурны музей адлюстроўвае найперш гэты перыяд жыцця слыннага паэта, ягоную працу над паэмай «Над ракой Арэсай».

Дарэчы, гэтая школа адна з трох у краіне, якім прысвоена імя Янкі Купалы, а літаратурнаму музею ўжо амаль трыццаць гадоў.

Яшчэ школа ў Камуне можа пахваліцца сваім этнаграфічным музеем. Пасля рэканструкцыі ў памяшканні старога школьнага будынка з'явілася некалькі вольных класаў, куды і пасяліліся музеі. У тым ліку і музей гісторыі школы. А ўзрост гэтай альма-матар — ужо 80 гадоў. Атрымаўся сапраўдны музейны комплекс. Першыя памочнікі ў Людмілы Варабей — школьніцы восьмых і дзявятых класаў, яны самастойна праводзяць экскурсіі, дапамагаюць у пошукавай працы і абнаўленні экспазіцый.

Вёска Камуна — ці не самая музейная ў нашай краіне. Тут знаходзіцца яшчэ і музей меліярацыі, пакуль што адзіны ў Беларусі.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 13 (99)

Фестывалі

ТРЫ Ў АДНЫМ І ТОЛЬКІ Ў НОЧ МУЗЫКІ

Музыканты дакажуць, што на скрыпцы можна іграць лежачы. Харэограф пакажа, што ўмее маляваць. Для актрысы знойдзецца містэр «Х»...

Вечаровая эпатажнасць

Актрыса — Святлана Зелянкоўская, якая будзе весці першы ў гісторыі Беларусі «трыа-фэст». Ёй будзе дапамагаць у ролі вядучага... Не скажу хто — хай будзе сюрпрыз. Але чалавек у нашай культуры невыпадковы. І гэта падтрымала Міністэрства культуры! Начальнік Упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Беларусі Міхаіл Казловіч не выключыў, што такі арыгінальны фэст можа стаць штогадовым і выйсці за межы адной установы, якая ўсё гэта ладзіць.

Купальскія кароткія ночы поўныя нечаканасцяў, а цяпер іх можна шукаць не толькі ў лесе, але і ў філармоніі 23—24 чэрвеня, прычым у рэжыме нон-стоп. Таму што музыкі шмат не бывае. Бывае, што бракуе часу ее слухаць. Цяпер няма праблем: у «Белдзяржфілармоніі» прапануюць рабіць гэта... уначы.

Чаму ж не, калі стала магчыма хадзіць уначы ў музеі, то чаму не правесці прыемна час у канцэртнай залі? Так падумала Ларыса Сімаковіч, якая прапанавала ўжо не адну гучную і непадобную ні на што музычную імпрэзу. Але гэтая можа пабіць усе айчынныя рэкорды арыгінальнасці і не толькі таму, што музыкі (і іншай творчасці) будзе шмат. Не толькі беларускай. Самыя эпатажныя і неардынарныя кампазітары сучаснасці, такія як Арво Пярт, Алан Хаванес, Джон Кейдж, Піліп Глас будуць прысутнічаць на гэтым фэсце. Праўда — праз сваю музыку, якая будзе гучаць у Мінску. Выступяць музыканты з Польшчы, Расіі, Італіі, ЗША. Цікава, чым жа іх прывабіў беларускі начны фэст?! Напэўна, скрыпачка і альтыстка Крысціна Фонг ці кларнетыст Міхаэль Карнацкі адкажуць на гэтае пытанне праз сваё майстэрства.

За два дні нам абяцаюць «трыа-фэст» на вялікай сцэне філармоніі — таму што да музыкі далучацца харэаграфія і жывапіс. Фае філармоніі збіраюцца ператварыць у выставачную залу — каб нават інтэр'ер на самым пачатку ўжо настройваў на пэўны лад, ды і ў антрактах час не праходзіў дарэмна. Вядома, кожны будзе мець права на кубак кавы і пачастункі. Але пры ўсёй іх незвычайнасці (у незвычайных абставінах), пагадзіцеся, гэта толькі дзеля таго, каб ноч пратрымацца. Аднак, падсілкаваўшыся, лепш ўсё-такі займацца тым, дзеля чаго прыйшлі.

Разам з творамі беларускіх мастакоў у фае зойдуць месца акварэльныя працы... сусветнавядомага танцоўшчыка і харэографа Уладзімір Васільева! Народны артыст Расіі іх ужо паказаў у шмат якіх краінах. Але вядома, што калі ёсць Васільеў, то чакаць трэба балета. Сапраўды, танцаваць будзе салістка Вялікага тэатра Расіі Дар'я Хахлова. І калі ведаць, каму прысвечана гэтая харэаграфічная праца самога Васільева, то становіцца зразумела, што гэта танец кахання. І можна толькі ўяўляць, як бы магла танцаваць яго жонка Кацярына Максімава, якая пайшла з жыцця. Танец кахання — пад музыку Першай балады Фрыдэрыка Шапэна.



Начная элегічнасць

І яшчэ без літаратуры тут не атрымаецца. Праўда, не літаральна. Пра яе ўзгадаеш праз гукі музыкі Шапэна, якая пэўны час ішла поруч з літаратурай Жорж Санд. Гэта будзе музыка Фрыдэрыка Шапэна, які неверагодна папулярны сёлета. І каб быў нейкі рэйтынг кампазітараў, якіх найбольш любяць слухаць у Беларусі, то імя Шапэна трывала трымалася б на першай пазіцыі.

Гэтая імпрэза яе яшчэ падмацавала б. Зрэшты, Шапэнам яна натхнёная і яму прысвечана. І вельмі дарэчы, што летні музычны фестываль звяртаецца да Шапэна. Яго прыгожая рамантычная музыка асацыюецца з каханнем. У мінскіх закаханых пар стала на адзін варыянт больш, як правесці рамантычны вечар.

Рамантыкі хопіць. Бо імя вялікага польскага кампазітара звязана з імем пісьменніцы Жорж Санд. Адзін са знакамітых і гучных раманаў дзвюх вялікіх асобаў дагэтуль вярэдзіць сэрцы. Ну як жа, калі заканчэнне адносінаў, магчыма, паскорыла смерць Шапэна. Дык чаму ж і што паміж імі адбылося?

Пакуль невядома, ці адкажа на гэтыя пытанні ноч, прысвечаная Шапэну. Але Ларыса Сімаковіч, напэўна, паспрабуе прыадкрыць таямніцы загадкавай душы творцаў у музычна-харэаграфічным спектаклі, які сама прыдумала: «Жорж Санд, Мазурка і Шапэн». Адметна, што сярод дзеючых асобаў не толькі Ён і Яна. Ёсць яшчэ яго Мазурка (ці не муза ў нейкім сэнсе?). Ёсць яшчэ яе Кансуэла. Ролі размеркаваліся так, што Шапэна будзе іграць заслужаны артыст Расіі Яўген Бушкоў, які стаў галоўным дырыжорам камернага аркестра Беларусі. Жорж Санд — Марыя Сазонава. Задачы Мазуркі найлепш разумее сама Ларыса Сімаковіч. А Кансуэла — Святлана Зелянкоўская.

Што такое мазурка і чаму яна жывая, можна будзе паразважаць яшчэ і падчас выступу польскага гурта «»Zespol Polski». Музыканты выконваюць польскую музыку на аўтэнтычных народных інструментах. І, магчыма, тыя ж польскія мазуркі некалі ў такім варыянце слухаў сам кампазітар, так імі натхніўся, што потым сам стаў пісаць. Гурт іграе шмат рознай народнай музыкі. Гэта музыка той краіны, дзе сэрца паэта сніць вечныя сны.

Але апоўначы жарсці сціхнуць. Самы час для калыханкі. Апоўначы з 23 на 24-е чэрвеня прагучыць «Калыхынка да Шапэна», фактычна сумесны твор, да якога прычыніліся восем беларускіх кампазітараў: Сяргей Картэс, Віктар Капыцько, Вячаслаў Кузняцоў, Сяргей Бельцюкоў, Аляксандр Літвіноўскі, Ларыса Сімаковіч, Дзмітрый Лыбін, Кастусь Яськоў. Па сутнасці, гэта восем новых калыханак, якія аб'яднаныя адной думкай — прысвячэнне Шапэну. Выканае супольны твор Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі. Цікава, як будуць пачувацца музыканты, якія будуць іграць калыханкі апоўначы? А з якім пачуццём сустрэнуць світанак гледачы?!

Святлана ЛАБАЦЭВІЧ, Ларыса ЦІМОШЫК.

АНТЫКРЫЗІСНЫ «БУСЕЛ»

VII Рэспубліканскі фестываль беларускіх фільмаў праходзіць з 20 па 24 чэрвеня ў Брэсце

З 1997 года ў Брэсце раз у два гады праходзіць рэспубліканскі агляд беларускіх фільмаў. Летась фестываль не адбыўся, бо яго арганізатары не знайшлі сродкаў на правядзенне з-за фінансавага крызісу. Сёлета становішча вырашана выправіць, вярнуць фестываль на яго гістарычную радзіму. І вось названыя дні, калі на суд гледача і журы будуць прапанаваны 23 дакументальныя стужкі і па 12 мастацкіх і анімацыйных фільмаў.

Адкрые фестывальную праграму карціна Аляксандра Колбышава «Ваўкі». Гэта чаканая прэм'ера. А выпускнік майстэрні Міхаіла Пташука Дзмітрый Лось яшчэ некалькі гадоў таму прымусіў пра сябе гаварыць пасля фестывальнага паказу каротказметражнай стужкі «Вайна». Сёлета ён вязе на фэст двухсерыйную меладраму «Трамвай у Парыж».

Цікавым абяцае стаць праграма анімацыйных фільмаў. Нашы мультыплікатары ствараюць якасны прадукт, які не раз адзначаўся на прэстыжных фестывалях. У Брэсце гэтым разам пакажуць некалькі работ Міхаіла Тумелі, а таксама працяг «Несцеркі» Ігара Волчака.

Галоўны прыз фестывалю «Крыштальны бусел» традыцыйна прысуджаюць за лепшы фільм, за лепшыя мужчынскую і жаночую ролі, за лепшую рэжысуру, за лепшы сцэнарый і іншыя. Заснавана таксама некалькі спецыяльных прызоў, сярод іх і Спецыяльны прыз Брэсцкага гарвыканкама «Лепшы фільм Рэспубліканскага кінафестывалю ў Брэсце».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II ПАЎГОДДЗЕ 2010 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
ЖЫРАНДОЛЯ
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	12 400 рублёў на месяц 74 400 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	11 600 рублёў на месяц 69 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	19 900 рублёў на месяц 119 400 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	18 000 рублёў на месяц 108 000 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	9 700—11 180 рублёў на месяц 58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8 940—10 430 рублёў на месяц 53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13 134—14 080 рублёў на месяц 78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12 230—13 170 рублёў на месяц 73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе

* Залежыць ад рэгіёна

ПАЛЁТ ПРАЗ ВОБЛАКІ

Самалёт ідзе праз воблакі і над воблакамі. Лячу з Мінска ў Маскву, а душа мая сядзіць далёка ўнізе, у мсціслаўскім касцёле, на хорах. Зазвычай, яна ўцякае ў менскі чырвоны касцёл і ўладкоўваецца пад вітражнай ружаю. Гэтым разам душа адляцела ў Мсціслаўе, што стаіць на самай мяжы Беларусі з Расеяю. Душа сядзіць на хорах, а я спакойна сплю ў самалёце. Сусед захроп. Ён так нечакана і гучна захроп, што я прахапіўся яшчэ абяздушаны і ўбачыў, як вяртаецца мая душа. Яна вярнулася, і наш надваблачны і празваблачны шлях працягваецца.

КАВЯРНЯ VOGUE І ВАДА

Замовіў каву і ваду. Добраліслівыя афіцыянткі, адна, а праз хвіліну і другая, высвятлялі, якую я буду піць ваду... Газаваную ці не газаваную. Цёплую ці ледзяную? Потым прынеслі вялізную шклянку, можна нават сказаць сурвэтніцу, поўную да краёў пустой цеплаватай вадзічкі. Яна была не з-пад крана, бо Масква не Рым, у Маскве з-пад крана вады не пап'еш. Зрэшты, так ты цяпер не пап'еш трубнай вады ці не ва ўсім сучасным зурбанізаваным свеце.

БУЛГАКАЎСКІ ДОМ

Чытаў вершы ў Булгакаўскім доме. Слухаў пераклады сваіх вершаў на рускую мову. Піў ваду на Патрыяршых стаўка́х, у той час, як усе пілі гарэлку «Маруся» і сухое чырвонае. Адзін паэт піў партвейн. Я ледзь не пачаў яму зайздросціць, але загрузіўся ў машыну да Светы, і быў адвезены на вуліцу Будаўнікоў. Еў салату і сняданак па-камчацку. У гадзіну ночы Вольга прыгатавала сняданак: свежазваранае яйцо з чырвонай ікрою. З'еў і заснуў на канапе, каля стала. Вольга, Света і Алена развалелі пра сопкі на Камчатцы, а я спаў... Чэрці мне не сніліся... Нічога не снілася... Пасярод ночы жанчыны выклікалі таксоўку, і я з жонкаю паехаў да другой Вольгі, на Цвярскую, дзе мы спыніліся ў доме нумар шэсць. На Цвярской своеасаблівы шум машын нават пасярод ночы. Пад гэты шум мне добра спіцца, нават цвярозаму.

ЧЫРВОНАЯ ПЛОШЧА

Пошукі пазітыўнасці ў грамадстве часам заходзяць так далёка, што станоўчыя эмоцыі і станоўчыя ўражанні людзі пачынаюць шукаць на пахаваннях і могілках... З-за міліцыянскіх кардонаў гляджу, як калона пад чырвонымі сцягамі ідзе-сунецца па Чырвонай плошчы да маўзалея з мёртвым целам Леніна. Гляджу і пераконваюся, што каля труны з трупам свайго павадыра камуністы не знойдуць пазітыўнасці.

КЛУБ «ФАБРЫ́К»

У клубе «Фабры́к» запісаў некалькі слоў для тэлекампаніі «Мір». На фоне міжнароднага конкурсу маладых дызайнераў па касцюмах. Конкурс называецца «Крамлёўскія зоркі». Арганізатар конкурсу спадарыня Петухова. Дзяўчат і жанчын у клубе было ў разоў дзесяць, а мо і дваццаць болей, чым асобаў умоўна-мужчынскага полу... Жанчын было столькі, што мужчынскасць мая знарочыстая і агрэсіўная выглядала недарэчна.

ЛОНДАН І МАСКВА

Георг Ліхтэнберг называе Лондан пеклам. Ні больш ні менш. «Дарогі робяцца шырэйшыя і прыгажэйшыя, калі ты пад'язджаеш да гэтага пекла (Лондана)», — так напісаў нямецкі літаратар. Ці можна тое самае сказаць пра Маскву? Набліжаючыся да Масквы, дарогі і сапраўды шырэюць, але наўрад ці яны прыгажэюць. Дый дождж у Маскве сягоння такі моцны, што я засумняваўся, што ў пекле могуць ісці такія шчыльныя дажджы. Дарэчы, і ў Лондане спорныя дажджы — з'ява звычайная. Так што дарэмна Ліхтэнберг назваў Лондан пеклам.

АСТ І ТЭНДЭНЦЫІ

Сустрэўся з кіраўнікамі кнігагандлёвай сеткі АСТ. Яны сказалі, што пачалі адмаўляцца ў нашай кнігавыдавецкай справе ад кепскай паперы. Там, дзе была газетная папера, будзе афсет, а дзе быў афсет, з'явіцца крэйдаваная папера. Людзі зноўку пажадалі бачыць у кнізе не толькі тэкст, але і матэрыял. Такая сітуацыя крыху бадзёрыць і нават абнадзейвае, бо апошнімі часамі навіны ў кніжным свеце з'яўляліся адно кепскія.

ЛІРЫКА Ў КНІГАРНЯХ

У маскоўскіх кнігарнях зборнікі вершаў цяпер пахаваліся ў цёмныя куткі. Раней яны стаялі на паважных і шаноўных светлых паліцах, а сёння паэты загнаныя ў кут. Такое адкрыццё мяне не абурыла, бо я ніколі не верыў, што рускі народ любіць Лермантава і Пушкіна. Калі іх творы перастварыць у прымітыўнае кіно ці лубачны мультфільм, тады ёсць невялікі спадзеў, што народныя масы паэзію прымуць. Паэзія не прадаецца, таму і стаяць кнігі лірыкі ў змрочным душным закутку, і правільна стаяць. А можа і не? Бо ў паэтычным закутку да мяне падышоў мужчына і сказаў: «Пара ўжо выкінуць рускую паэзію! Выкінуць яе зусім! Усім трэба абрэзацца і пачаць складаць вершы на ідышы! Правільна я кажу?» Можна было і прамаўчаць, але я не змоўчаў: «Паэзія ёсць!» — «Ну якая тут, скажы ты мне, паэзія?» — «Лермантаў з Цютчавым ёсць, калі яны ёсць, руская паэзія тут ёсць!» — «Ты аптыміст, сынок! Ты няправільна разважаеш, зусім няправільна, але мне падабаецца, як ты сказаў... Лермантаў з Цютчавым ёсць! Зусім без злосці сказаў. Лёгка...»

РУБЛЁЎ У ТРАЦЦЯКОЎСКАЙ ГАЛЕРЭІ

Ад наведвання залаў з абразамі Андрэя Рублёва ў памяці застаюцца чорныя, чырвоныя і срэбныя крыжы.

МАСКВА І ЛЮБОЎ

Ёсць людзі, што любяць Маскву, і такіх шмат. А ёсць людзі, якіх любіць Масква, іх мала, іх зусім мала, і я сярод іх.

Адам ГЛОБУС.

Тры зубраняці ў падарунак

Магілёўскі заасад святкуе свой першы юбілей. Пяць гадоў таму ў пасёлку Буйнічы паблізу абласнога цэнтра з'явіўся ўнікальны рэабілітацыйны цэнтр для дзікіх жывёл. Менавіта сюды трапляюць лясныя жыхары, якім патрабуецца дапамога.

Заасад будаваўся як база Магілёўскага агралесатэхнічнага каледжа, для практыкі спецыялістаў лясной гаспадаркі. Аднак **дырэктар каледжа Георгій МАЛІНОЎСКІ** пераўтварыў звычайны праект у рэгіянальную славутасць.

Сёння ў Магілёўскім заасадзе жыве болей за 200 жывёл. Многіх з іх магілёўцы ведаюць па мянушках. Усурыйскага тыгра Арцёма, якога калісьці літаральна выратавалі з сумніўных умоў жыцця ў перасоўным расійскім звярынцы, сёлета шанавалі як сімвал года. Сімпатычнага мядзведзя Федзьку, падарунак прэм'ер-міністра Карэліі, дзеці насупер усім патрабаванням заасада ўсё роўна кормяць ласункамі.

— Я люблю ўсіх сваіх жывёл, але мой улюбёнец — высакародны алень Грынька, — прызнаецца Георгій Маліноўскі. — Яго прывезлі да нас з вёскі Чорны Бор Быхаўскага раёна. Маленькі і хударлявы, ён прыходзіў на падворак мясцовага пенсіянера, які падкормліваў галодную жывёліну і прыручыў. Сёння Грынька — упрыгажэнне нашага заасада, і сам таксама цягнецца да прыгажосці. Калі да нас завіталі ўдзельніцы конкурсу «Міс Інтэркантыненталь», ён падняў на рогі брамку і пайшоў за афрыканскай дзяўчынай. Спачатку спужаліся, а потым не маглі спыніць смех!

Безумоўная гордасць Магілёўскага заасада — гэта статак зуброў, у якім цяпер 17 асобін. Нібыта падарунак да юбілею, у маі з'явіліся на свет 3 зубраняці. Статак зуброў можна пабачыць у часе «сафары» на турыстычным цягніку па тэрыторыі, дзе вольна жывуць жывёлы. Цяпер заасаду паступіла прапанова прадаць пару зуброў у Расію. Кошт прыстойны — 100 тысяч еўра, але Георгій Маліноўскі падкрэслівае: «Прададзім для развядзення гэтых цудоўных жывёл, а не на мяса ці забавы!»

Затое забавы чакаюць наведвальнікаў заасада 26 чэрвеня. Пасля ўрачыстай часткі будуць карнавальнае шэсце, спаборніцтвы, канцэрт і яшчэ шмат радасці для дзяцей і дарослых, якія прыйдуць у Магілёўскі заасад.

Ілона ІВАНОВА.

Ушануюць «дзядзьку Васю»

У Віцебску адкрыюць мемарыяльную дошку памяці легендарнага дэсантніка № 1 Маргелава Васіля Піліпавіча. Нездарма дэсантныя войскі з павагай называюць «войскі дзядзькі Васі».

Як паведаміў «Звяздзе» **намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ**, дошка ўпрыгожыць дом №1 у раёне новабудоўлі па вуліцы генерала Маргелава.

На цырымонію адкрыцця (25 чэрвеня) запрасілі сыноў і сваякоў легендарнага генерала. У Віцебск на святочнае мерапрыемства запрасілі таксама камандаванне ВДВ Расіі і адпаведных беларускіх ваенных мабільных сілаў.

Фактычна стваральніка дэсантных войскаў многае звязвае з нашай краінай. Васіль Піліпавіч нарадзіўся ў сям'і выхадцаў з Беларусі (у 1908 годзе, памёр у 1990-м). Ён скончыў аб'яднаную Беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР, служыў у нас...

Віцебск вядомы тым, што дэсантнікі адсюль першымі адправіліся на вайну ў Афганістан. І цяпер у горадзе дыслакуюцца заваёўнікі нябёсаў і салдаты, якія выконваюць самыя складаныя заданні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«СКАЖЫ, ДЗЕ ГАНДЛЮЮЦЬ СМЕРЦЮ!»

Пад такім заклікам 24 чэрвеня пройдзе акцыя, якую ініцыявала МУС пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя і ЦК БРСМ. Яна накіраваная на тое, каб засцерагчы людзей ад небяспекі быць уцягнутымі ў наркабізнэс.

Як удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, у гэты дзень з 8.00 да 18.00 ва ўсіх абласных цэнтрах краіны будуць працаваць «гарачыя лініі», па якіх можна будзе паведаміць, у тым ліку і ананімна, інфармацыю аб наркагандлярах, а таксама аб месцах распаўсюджвання, захоўвання ці спажывання наркатычных і псіхатропных рэчываў. Так, у Брэсцкай вобласці можна патэлефанаваць на «гарачую лінію» па нумарах (0162) 275683 ці 233142, у Віцебскай — (0212) 246207 ці 364237, у Гомельскай — (0232) 704214 ці 577780, ў Гродзенскай — (0152) 797331 ці 722359, ў Мінскай — (017) 2046200 ці 2270818, у Магілёўскай — (0222) 223048 ці 226813, у Мінску — (017) 2294641, 2187806 ці 2848554.

Акрамя таго, на «гарачай лініі» па тэлефоне (017) 2226545 урачы-нарколагі адкажуць на пытанні, звязаныя з праблемамі спажывання наркотыкаў, параяць, якія крокі прыняць, каб справіцца з наркатычнай залежнасцю. Між іншым, за пяць месяцаў гэтага года ў краіне канфіскавана каля 60 кілаграмаў наркатычных сродкаў, а таксама каля 30 кілаграмаў псіхатропных рэчываў.

Ігар ГРЫШЫН.

СВЯТЫЯ ПОБАЧ

У Магілёве — выстава «Святло хрысціянскіх вобразаў»

Музей этнаграфіі прадэманструе магілёўскай публіцы скульптуры і беларускія абразы. Каштоўныя экспанаты ахопліваюць тры стагоддзі — ад канца XVII да XIX стагоддзя.

Цудам захаваліся праз стагоддзі дзве драўляныя скульптуры — Божай Маці і Марыі Магдалены. Невялікія, ніжэй за чалавечы рост, са спакойнымі тварамі і ўсмешкамі. Малітоўна складзеныя вытанчаныя рукі, у Марыі Магдалены непакрытая галава. У XVII стагоддзі гэтыя скульптуры ўпрыгожвалі адзін з уніяцкіх храмаў Магілёва.

Абразы, многія з якіх упершыню выстаўляюцца, дэманструюць Магілёўскую школу іканапісу. Каталіцкі абраз Маці Божай з дзяржавай напісаны ў XVIII стагоддзі для каталіцкага храма. Божая маці ў залатых бліках выглядае маладой сімпатычнай жанчынай.

Загадчыца музея этнаграфіі Святлана Рыбакова трымае ў руках каталіцкі абраз Божай Маці XVIII стагоддзя.

— Беларускія мастакі адыходзілі ад строгіх іканаграфічных схемаў і прыўносілі ў абразы нешта сваё, — каментуе **загадчыца філіяла Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея Святлана РЫБАКОВА**. — Яны пісалі святых не плоскімі, а цялеснымі. Вольна абыходзіліся з колерамі. Магілёўскія мастакі арыентаваліся на заходнееўрапейскае мастацтва, шматканфесійнасць давала магчымасць пазнаёміцца з яго ўзорамі. Майстры працавалі для католікаў і праваслаўных, былі талерантнымі і цярпімымі. Так і ў нашай выставе пабач будуць вобразы святых, створаных для розных канфесій.

Яркімі фарбамі і выразнымі тварамі святых ураўнаважваюць складаны абраз. У цэнтры — Мікола Цудатворца, па баках — архангелы Міхаіл і Гаўрыіл. Спецыялісты адносяць стыль складанага абраза да народнага прымітыву. Такія абразы пісалі для невялікіх драўляных цэркваў. Звычайна яны бралі ўдзел у вясковых абрадах свечкі. Унізе магілёўскага складанага абраза якраз ёсць скрыначка, дзе захоўваецца свечка.

Народны мастак пісаў святых з простых людзей, якія жылі побач. Але і Мікола Цудатворца з яснымі вачыма, і круглатварыя архангелы напоўнены добрымі эмоцыямі, якія ахопліваюць кожнага, хто адкрые створкі абраза. А вось паходжанне яго невядомае.

Старажытны праваслаўны складаны абраз: народны мастак уклаў шмат добрых эмоцый у вобразы святых.

— На складаным абразе стаіць нумар НВ — гэта навукова-дапаможны фонд, — разглядае Святлана Рыбакова. — За савецкім часам абразы ў асноўным музейны фонд часта не траплялі. Стаўленне тых часоў да рэлігіі і прадметаў культу вядомае. Напрыклад, у 1970-я гады супрацоўнікі музея забіралі абразы з Нікольскай царквы ў Магілёве, дзе з іх раскладвалі вогнішча. Забралі, што паспелі, і захавалі да тых часоў, пакуль Нікольская царква зноў не адчынілася. Туды ў свой час музей перадаў болей за сотню адзінак захоўвання.

Святлана Рыбакова расказала, што ёсць праблемы з рэстаўрацыяй старажытных беларускіх абразоў. Рэстаўрацыйныя работы каштуюць дорага, а ў музея на гэта нестае грошай. Супрацоўнікі музея хочуць, каб абразы святых не проста захаваліся для нашчадкаў, але з дапамогай спецыялістаў абнавіліся і ўражвалі гледачоў вобразамі і фарбамі.

Ілона ІВАНОВА. Фота Ірыны САВОСІНАЙ.



Дарагую дачушку **КАЛКОЎСКУЮ Святлану** з в. Шашкі віншуем **з днём нараджэння**. Жадаем здароўя, шчасця, дабра і радасці, поспехаў у працы, здзяйснення творчых задумак.

Мама, тата і ўсе родныя.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7/7



Белыя: a5, e7, f6, g1, g5, h6 (6). **Чорныя**: a3, d2, d4, d8, e3, e5, f2, h4 (8). Выйгрыш.

АЎТАРСКІ-12

Пачынаем гэты конкурс рашэнняў кампазіцыі нацыянальнага майстра спорту Пятра Шклудава (Наваполацк) на яго прызы. Акрамя таго, гэты конкурс — класіфікацыйны з нормай першага спартыўнага разраду па шашках-64. У ім усяго будзе не меней 16 заданняў. Вось першае з іх:



Белыя: a7, b2, b6, c7, f2, h6 (6). **Чорныя**: b4, b8, d4, d6, d8, e3, e5, f6 (8). Перамога белых, як і ў варыяцыях В. Шульгі і М. Грушэўскага («Звязда», 4 мая).

Бліц-54/6

Яго завяршае Леанід Вітошкін (Гомель) сваім новым эцюдам:

Белыя: дамкі 34, 40 (2). **Чорныя**: 31, 33, 36 (3). Перавага белых.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскі-10/16 (В. Шульга): b8, c5, dc7, b2, e5, d2, e1, e7, a7x.

Мемарыяльны: А. Лук'янаў — **№ 8**. H6, f4 (ab6AB) c3 (a5CD) h8 (b4E) g5, d8x. A(c5) d8 (d4) f6 (e3) d2 (g3) d4 (h2) g1 (b6) a7, de3x. B(g3) h2 (e5) d8 (d4) f6 (e3) c3 (f2F) g3, c1 (b6) f2 (a5) e1x. C(bc5) h8 (b6) g5, a5x. D(dc5) h8 (b4) g5, a5x. E(c5) g5, d8x. F(b6) g3 (c5) a5 (d4) b4x; П. Шклудаў — **№ 9**. 1, 20, 3x, **№ 10**. 39-34, 32, 5 (50A) 37, 26x. A(37) 41 (50) 37, 37x, **№ 11**. 29, 42, 2 (39) 10, 5x і **№ 12**. 30, 21 (45) 5 (50) 28, 39, 39x.

Бліц-54/2 (Д. Слясарчык): 31, 38, 38, 33, 34, 24, 44, 34, 11, 10, 3x. Як заўважыў майстар Аляксандр Ляхоўскі (Жодзіна), пазіцыя ўзята з кнігі А. Каўрыжкіна «300 камбінацый на 100-клеточной доске», дыяграма 270. Заслуга Д. Слясарчыка ў тым, што ён прывёў да яе 12 уступных хадоў.

РАЗБІЛІ ШКЛО І...

У краме «ВВС імпекс сэрвіс», што ў Баранавічах, нехта выбіў шыбу і выкраў праз акно два ноўтбукі і два партатыўныя камп'ютары.

А ў Пінску абакралі індывідуальнага прадпрымальніка: у офісе па вул. Леніна разбілі шкло ў дзвярах і вынеслі 9 ноўтбукаў і манітор. Украдзенае пацягнула амаль на 16 млн. рублёў. Злодзеяў шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СХАПІЎ ВЫРУЧКУ НА БЯГУ

Непрацуючы 21-гадовы брастаўчанін раздабыць грошай вырашыў вельмі проста. Выйшаў на вуліцу і абрабаваў першы, што трапіўся на вочы, гандлёвы пункт — павільён па продажы квасу. Зламыснік выхапіў з касы 40 000 рублёў і паспрабаваў схавацца, але далёка не ўцёк, быў затрыманы нарадам міліцыі.

Яна СВЕТАВА.

Дыскусійная трыбуна

«Вучыце ў нядзельных школах, а не ў дзяржаўных...»

ЗДАВАЛАСЯ б, толькі пачалася дыскусія наконт выкладання рэлігійнай культуры ў школе, а ўжо зразумела, што ў людзей зусім розныя погляды на гэтую ідэю...

Вось у нашу газету даслала ліст Наталля М. з г. Свіслач. Аўтарка піша, што яна прававерд, ды і па пісьму бачна, што чалавек адукаваны і мае сваю пазіцыю.

«Адноўчы я ўбачыла кнігу «Закон Божы», прачытала «для пашырэння кругагляду», і знайшла адказы на свае пытанні, вывучаючы рэлігійную літаратуру, якая існуе на працягу 2000 гадоў,» — піша жанчына.

Рэлігійная літаратура, як і «законы божыя», існуе на працягу многіх тысячагоддзяў. Хіба ў Старажытным Егіпце не было «божага закона», у якім таксама павучалі не забіваць, не падманваць, не красці, а затым з'явілася Тора з дзесяццю запаветамі Бога, а ўжо потым прыйшло хрысціянства са сваім Законам.

«Вось для таго, каб мае дзеці і ўнукі ведалі гэты сусветны Закон і маглі зрабіць выбар, я хачу, каб яны вывучалі яго ў школе на ўзроўні іншых прадметаў», — працягвае аўтарка.

Жанчына настойвае, каб у бацькоў і вучняў у школе была свабода выбару. «Мне не спатрэбіліся веды аб песціках і тычынках», — піша наша чытачка. — ...Я добрасумленна вывучала біялогію і хімію, хоць і прымусова».

У нас існуе абавязковая школьная адукацыя, і дзеці абавязаны ведаць пра песцікі і тычынкі, бо на іх трымаецца не толькі флора, але і ўсё жывое. Неабходна вывучаць біялогію і хімію, бо без іх няма медыцыны, аграноміі, сучаснай навукі... Назад, у пячоры, чалавецтва не загнаць.

«Аднак жыццё з гэтай верай *(у ленінскі камунізм)* амаль 50 гадоў прынесла мне расчараванне. Не знаходзіла я адказы на пытанні: чаму людзі працягваюць забіваць, дзеля чаго жыве чалавек...» — піша Наталля М.

Вернемся на стагоддзі назад, калі за «Закон Божы» нічога вышэй не было. Забівалі, сціскаючы Біблію ў руках і з імем Хрыста на вуснах. А для чаго жывём? То гэта спрадвечнае пытанне. Праўда, пры ўсіх сумненнях і пытаннях, чалавек ідзе шляхам усіх жывых істот — нарадзіць сабе падобных, выгадаваць іх (не заўсёды гэта робіцца) і адысці ў нябыт.

Гэта мой погляд, а нехта збіраецца трапіць у Царства Божае ды жыць вечна і ніхто яму не перашкаджае, але пры чым тут школа?

А вось кароткае інтэрв'ю з дырэктарам самай вялікай у Івацэвічах сярэдняй школы № 4 Таццянай Касавец.

— Таццяна Міхайлаўна, што вы думаеце наконт увядзення ў школе прадмета «рэлігійная культура»?

— Мне здаецца, што рабіць гэтага не трэба. У нашым горадзе тры канфесіі: праваслаўныя, пратэстанты і католікі. Могуць узнікнуць непаразуменні, калі тэолаг адной канфесіі будзе выкладаць той прадмет. Бацькі ўспрымуць гэта насцярожана. А можа за лепшае было б вярнуць у школу Сусветную мастацкую культуру,там быў раздзел, прысвечаны рэлігіі? Дарэчы, з расшырэннем штату педагогаў не ўсё проста. У нас ёсць праблема з уладкаваннем на працу настаўнікаў, напрыклад, выкладчыкаў нямецкай мовы.

— У вашай школе займаецца 1020 вучняў. Скажыце, іх бацькі ўзнімалі пытанне пра ўвядзенне рэлігійнага прадмета ў школе?

— Ніхто такога пытання не ставіў, а вось што са сценаў школы вывелі профільныя класы і тым самым пазбавілі вучняў права выбару, то гэта бацькоў турбуе.

І на якой падставе Біблія ўчора трактавалася так, а сёння падаецца гэтак? А што, толькі ў тэолагаў права на яе тлумачэнне?

Мысліцелі мінулага ішлі вобмацкам, абапіраліся на здагадкі, будавалі гіпотэзы, і пры напісанні Біблії выкарыстоўвалі напрацоўкі свайго часу.

Свет адышоў ад біблейскіх часоў вельмі далёка, і сёння царква нічога даказаць не можа — яна абараняе толькі сябе. Прыярыцэт у навукі (у шырокім сэнсе).

Хто пярэчыць, што рэлігійная тэматыка ў сусветнай мастацкай культуры займае важкае месца. І гэтаму ёсць тлумачэнне. Царква стагоддзямі даводзіла грамадству сваё, імкнулася праз мастацтва ўмацаваць свой уплыў на чалавека. Рэлігія панавала, і царква была самай багатай структурай, яна плаціла творцам за свае заказы. Вунь і за савецкім часам самыя высокія ганарары мастакі атрымлівалі за карціны з гістарычна-рэвалюцыйнай тэматыкай, і творцы стараліся ствараць палотны маштабныя — пад заказчыка.

У галодныя дзевяностыя я і сам намаляваў некалькі абразоў. Для некага яны лічацца святымі, а для мяне — звычайная праца, за якую заплацілі.

Праблема не ў рэлігійнай тэматыцы мастацтва, а ў тым, як рэлігійная культура будзе тэолагамі падавацца вучням. Безумоўна, з багаслоўскіх пазіцый — схаластыкі. Так, магчыма, будзе напачатку, а затым усё звядзецца да канфесійных інтарэсаў. І месца там для беларускасці не знойдзецца. А калі так, то што з тых урокаў?

Мой апанент папракае, што я быццам бы навязваю свае атэістычныя погляды. Глупства. Мая сям'я, як і многія нашы знаёмыя, стаіць на матэрыялістычных пазіцыях і не рвецца ў школы, нічога нікому не навязвае — мы адстойваем толькі свае правы і правы сваіх дзяцей і ўнукаў. Не чапайце нас — найперш разбярыцеся са сваімі сем'мі. Крыжамі агарадзілі вёскі і гарады, падчас ў бібліятэку ўжо не трапіць, бо багасловы і святары вядуць там свае чытанні, а цяпер вам патрэбны школы? А хіба не існуе Закон РБ (ад 17.12.1992 г. №2054-XII), у якім сказана: «Рэлігійныя арганізацыі, зарэгістраваныя ў парадку, устаноўленым гэтым Законам, маюць права ў адпаведнасці са сваімі статутамі **ствараць для рэлігійнай адукацыі дзяцей** і дарослых вучэбныя групы і нядзельныя рэлігійныя школы, выкарыстоўваючы для гэтага памяшканні, якія належаць і (ці) прадстаўленыя ім у карыстанне, **акрамя памяшканняў, якія належаць дзяржаўным установам адукацыі**».

Усё тут раскладзена па паліцах, чаго яшчэ не хапае?

Дзейнасць рэлігійных арганізацый неабходна трымаць пад кантролем, вядома ж не забараняць іх. Хачу паведаміць цікавы факт. У адзін райвыканкам прыйшлі паломнікі з абразамі ды крыжамі. Мода такая — хадзіць з раёна ў раён. Зайшлі ў кабінет кіраўніка раёна і нешта там ім прыйшлося не даспадобы: можа, не так сустрэлі, як хацелася.

— А я бачу, што тут нячыстая сіла завялася, — успыхнула адна з актывістак і пачала з абразом кідацца ў розныя куты кабінета — выганяць нячысціка. Старшыня райвыканкама ледзь не абамлеў. А чаму б не ўцікаміць клікушу?

Адны людзі настойваюць на ўвядзенні рэлігійнай культуры ў школах, другія — супраць, а многім — усё роўна. І гэта нармальна. А вось тое, што ў грамадстве сфарміравалася сур'ёзная цікавасць да рэлігіі, то тут можна паспрачацца. Каб была «сур'ёзная цікавасць», то дзяцей багасловы ў школах не шукалі б, а вялі тоўпіліся б у храмах.

Мой апанент лічыць, што *«факт наяўнасці і дзейнасці вахабізму ў Расіі ў значнай ступені абумоўлены тым, што цікавасць да мусульманства ў пачатку 90-х гадоў у гэтай краіне ў значнай ступені задавальнялася не дзяржаўнымі і афіцыйнымі мусульманскімі рэлігійнымі арганізацыямі, а рознага кшталту экстрэмістамі...»* Наіўная думка. Святары і багасловы — звычайныя людзі, і калі на Каўказ хлынулі з арабскіх краін грошы, то аказалася, што ўсё прадаецца. Багасловы ў медрэсе якраз вахабізм і прапаведвалі, а былыя сакратары райкамаў, абкамаў і ЦК КПСС адпраўляліся ў Меку на хадж. Якія афіцыйныя структуры маглі нешта задаволіць? Вунь сёння расійскія мільярды на Каўказе знікаюць, як у прадонні, і канцоў нельга знайсці.

У Савецкім Саюзе пра вахабізм мы многа чулі? Тады кожны, у тым ліку і работнік культу, ведаў сваё седала, хоць у гэтым нічога добрага не было.

«Вы ўпэўнены, сп. С. Свістуновіч, што праблема фанатызму і экстрэмізму, у рознай ступені актуальная для краін усяго свету, не патрабуе прафілактыкі ў Беларусі?» — пытаецца мой апанент і разважае, што традыцыйныя рэлігіі маюць прышчэпку ад розных канфліктаў, варожасці...

У нашай краіне спакойна, але калі за прафілактыку возьмецца нейкая адна канфесія, то...

Беды, якія прынесла чалавецтву рэлігійная нецярпімасць, не магчыма пералічыць. Ганенне яўрэяў у краінах Еўропы было звычайнай справай, і Расійская імперыя тут не была выключэннем. Пагромы і мяжу аселасці чым можна апраўдаць? Ды ў хрысціян ніколі не было адзінства. Каталікі ваявалі з пратэстантамі, царква праследавала старавераў... «Ведзьмаў» на вогнішчы адпраўлялі тысячамі...

У імя чаго ўсё гэта тварылася?

А нецярпімасць на бытавым узроўні яшчэ тая. Вось жыву я, і мне ўсё роўна, якая ў другога чалавека жыццёвая ўстаноўка і чым ён займаецца. А некаторыя вернікі абураюцца: «Чаму ты да Спаса ясі яблыкі? Гэта грэх. Чаму працуеш на свята? Чаму...» Ды таму, што я свабодны чалавек, і вечнае жыццё мяне не цікавіць.

Беларусь — спакойная краіна, і не патрэбна нам ніякая рэлігійная прафілактыка за кошт дзяржавы.

Быў Савецкі Саюз, у якім абяцалі народу камунізм — рай на зямлі. Саюз распаўся, і з ім знікла камуністычная ўтопія.

Думалася: вось нарэшце вызваліліся ад ідэалагічнага ўціску! Але тут жа з'явіліся новыя ідэолагі і абяцаюць вечны рай, але на тым свеце — калі ўваскрэснем...

Камуністы хоць бралі на сябе нейкія абавязкі — трэба было той рай будаваць.

Можа абыдземся без чарговай утопіі? Будзем працаваць, не красці, не піць гарэлку, жыць інтарэсамі сваёй краіны... і ўсё ў нас будзе добра.

Напрыканцы свайго артыкула мой апанент піша: *«вучань павінен быць вольны САМ выбіраць, з чым яму знаёміцца — з рэлігійнай культурай якой-небудзь з традыцыйных для рэспублікі канфесій, або са свецкай дыялектычна-матэрыялістычнай этыкай»*.

Згодны. Вучыце ў нядзельных школах, храмах... Працуйце, але не ва ўстановах дзяржаўнай адукацыі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

УПРАВЛЯЮЩИЙ ПО ДЕЛУ О БАНКРОТСТВЕ
№ 208-9Б/2008 Драницкий И.Г.

РЕАЛИЗУЕТ ЧАСТЯМИ С ОТКРЫТЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ИМУЩЕСТВО, ПРИНАДЛЕЖАЩЕЕ ДОЛЖНИКУ СП «БЕЛТЕКСТ» ООО.

В состав имущества входят: компьютерная и офисная техника, транспорт, ткацкое оборудование, смесовые ткани.

Каждая единица выставляемого на аукционные торги имущества реализуется отдельным лотом.

Задаток на участие в аукционных торгах 10 % от суммы приобретаемого имущества.

Шаг аукционных торгов: 10 %.

Цена в белорусских рублях определяется на день проведения расчетов по курсу Национального Банка Республики Беларусь к доллару США с учетом НДС.

Торги состоятся 22.07.2010 г. в 12.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 7, к. 68.

Подробно с перечнем реализуемого имущества и его ценой можно ознакомиться на сайте Министерства экономики Республики Беларусь www.ekonomy.gov.by.

Для участия в аукционных торгах необходимо предоставить копии учредительных документов организации, заверенные в установленном порядке.

Победитель аукциона определяется в соответствии с максимально предложенной ценой.

Заявки на участие в торгах принимаются до **21.07.2010 г.** на почтовый адрес: 225410, Республика Беларусь, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7—67.

Контактный тел. (Velcom) 8 029 652 15 65.

УНП 200166488

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 14 (639)
адрэс рэкламы 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Новыя колы 260-508 альбо мяняю на заднія Т-25. Задні мост ГАЗ-53.
Тэл. 8 017 233 93 13.

❒ Дом 36 кв. м, дзярж. акт на зямлю, 20 сотак, сад, агарод, пабудовы, ёсць рэчка, 5 км ад Смалявічаў.
Мінская вобл., Смалявіцкі р-ён, п/а Пліса, а/с 18.

❒ Воз на гумавым хаду, новы, 250 у.а.
Тэл. 8 029 774 87 49.

❒ 2-пакаёвая кватэра, 3 пав. 5-павярховага дома, 35 км ад Мінска, Станькава Дзяржынскага р-на, пл. 47 кв. м.
Тэл. МТС 854 00 99.

❒ Запчасткі да аўтамабіля ГАЗ-69.
Тэл. 8 02131 4-24-44

КУПЛЮ

❒ Экскаватар ЮМЗ у любым стане.
Тэл. 964 79 99 (Velkom).

❒ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 044 473 68 90.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

У **суд Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява ад Грышковай А.М. аб прызнанні памерлым **Лапіцкага Дзмітрыя Віктаравіча**. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Лапіцкага Дзмітрыя Віктаравіча, 26 верасня 1970 года нараджэння, ураджэнца г. Рагачова Гомельскай вобласці, вул. Сцяпанава 80/31 паведаміць на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Караленкі Уладзіміра Аляксеевіча**, 18 ліпеня 1978 года нараджэння, ураджэнца в. Перасвятое Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства якога Перасвятое, вул. Цэнтральная, д. 86 Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

POST factum

ЧАРАПАХА ЗНАЙШЛА Ў МОРЫ СТРАЧАНУЮ ВІДЭАКАМЕРУ

Сяржант Дацкага каралеўскага флоту Дзік дэ Бруін згубіў сваю відэакамеру, займаючыся дайвінгам у Карыбскім моры. Праз 7 месяцаў камеру знайшлі ля берагоў амерыканскага штата Фларыда і вярнулі ўладальніку. Было падлічана, што камера зрабіла шлях у 1770 км.

Супрацоўнік берагавой аховы горада Маямі Пол Шульц знайшоў камеру чырвонага колеру каля прычала для яхт. Паколькі відэаапаратура была пакладзена ў непранікальны пластыкавы корпус, марская вада не пашкодзіла яе, і П. Шульц змог прагледзець усе адзнятыя фатаграфіі і відэаролікі.

Камера сфатаграфавала двух мужчын, якія рыхтуюцца да скуба-дайвінгу, сям'ю, што сядзіць на канапе, водныя пырскі і прадмет, падобны на плаўнік. Пасля высветлілася, што на відэа трапіла марская чарапаха, якая памылкова прыняла прыбор за ежу і неспадзявана ўключыла камеру. Гэты ролік быў загружаны на YouTube, і яго паглядзелі ўжо больш за 700 тысяч карыстальнікаў. Відэа было датавана студзенем 2010 года. Сустрэча з чарапахай адбылася праз два месяцы пасля таго, як камера была згублена.

П. Шульц змясціў фатаграфіі і відэаматэрыялы са знойдзенай камеры на сайтах для дайвераў і турыстаў. Карыстальнікі паведамілі супрацоўніку берагавой аховы ЗША, што на здымках адлюстраваны востраў Аруба, які належыць Даніі. Неўзабаве быў знойдзены і ўладальнік камеры Дзік дэ Бруін. Відэа з марской чарапахай пацвярджае той факт, што камера прарабіла шлях ад дацкага вострава да берагоў ЗША.

КАВА АБАРАНЯЕ АД ХВАРОБЫ ПАРКІНСОНА

Ужыванне двух-трох кубкаў кавы ў дзень змяншае рызыку ўзнікнення хваробы Паркінсона. Да такой высновы прыйшлі партугальскія вучоныя з універсітэта горада Порту.

Рэгулярнае ўжыванне гэтага напою змяншае рызыку развіцця небяспечнай хваробы на 25 працэнтаў у мужчын. У жанчын рызыка ўзнікнення паркінсанізмаў змяншаецца на 15 працэнтаў.

Паводле меркавання Кейрана Брына, дырэктара дабрачыннага фонду па вывучэнні хваробы Паркінсона ў Вялікабрытаніі, людзям не варта пачынаць спажываць каву ў надзеі прадухіліць развіццё захворвання. Разам з тым даследаванні, якія праводзяцца ў дадзеным кірунку, дазваляюць навукоўцам зрабіць здагадку, што кава ці прэпарат, падобны кафеіну, могуць абараніць ад гэтай хваробы.

КУРСАНТ-МІЛІЦЫЯНЕР ЗАБІЎ МУЖА ПАЛЮБОЎНІЦЫ НА ДУЭЛІ

Міліцыя Новасібірскай вобласці затрымала курсанта ваеннага інстытута МУС, які расправіўся з мужам сваёй палюбоўніцы. Малады чалавек патрабаваў ад суперніка саступіць яму жанчыну пасля нараджэння дзіцяці. Мужчыны «ўладжвалі» справу з дапамогай дуэлі прама на дачы.

За забойства затрыманы 24-гадовы навучэнец трэцяга курса Новасібірскага ваеннага інстытута ўнутраных войск МУС, паведамляе сайт «Сибкрай.ru» са спасылкай на следчы аддзел пры абласной пракуратуры. Маладога чалавека падазраюць у забойстве 49-гадовага жыхара Новасібірска.

Паводле даных расследавання, труп мужчыны з агнястрэльнымі раненнямі галавы знайшлі дачнікі аднаго з садовых таварыстваў. А пасля таго, як вартавыя парадку затрымалі меркаванага забойцу, сталі ясныя і яго матывы.

У курсанта быў двухгадовы любоўны раман з жонкай пацярпелага. Урэшце замужняя дама нарадзіла ад яго дзіця, пасля чаго малады бацька вырашыў, што мае права прэтэндаваць не толькі на дачку, але і на даму сэрца. Будучы міліцыянер прыйшоў да законнага мужа сваёй выбранніцы і заявіў пра свае намеры. Паміж супернікамі пачалася сварка, якую апаненты сабраліся вырашыць на дуэлі: на дачы як раз былі дзве дробнакаліберныя стрэльбы.

Спачатку дуэль вялася па ўсіх правілах. Першы стрэл зрабіў падмануты муж — аднак куля толькі злёгку зачапіла суперніка. Курсант у даўгу не застаўся і таксама стрэліў, прыцэліўшыся ў галаву. Яго стрэл быў больш трапным. Аднак далейшы ўчынак курсанта ўжо відавочна супярэчыў законам дуэлі. Малады чалавек схапіў рыдлёўку і нанёс удар па галаве пацярпелага. Затым «дуэлянт» зрабіў яшчэ два кантрольныя стрэлы ў галаву ахвяры.

Тым часам на дуэль прыйшлі паглядзець некалькі самых цікаўных дачнікаў. Курсант заўважыў разявак і стрэліў у бок няпрошаных «секундантаў». Гэтым разам «ваеннае шчасце» здрадзіла яму: усе назіральнікі засталіся цэлымі.

У ЭСТОНІІ ЛАВІЛІ КАМАРОЎ...

У мінулую пятніцу на тэрыторыі комплексу для адпачынку «Ківі» (усяго 10 км ад Тарту) прайшоў першы ў Эстоніі чэмпіянат па лоўлі камароў.

Ідэя спаборніцтва — родам з Фінляндыі, дзе сусветныя першынствы па лоўлі камароў праводзяцца ўжо шмат гадоў. Сёлетняе дажджлівае лета, радуюцца арганізатары мерапрыемства, стварае цудоўныя ўмовы для арганізацыі такога спаборніцтва. Дарэчы, спаборнічаць ва ўменні змагацца з крывасмокамі можна было як у індывідуальным, так і ў камандным заліку.

Цікава, што ў свой час Эстонія пераняла ў фінаў спаборніцтвы па нашэнні жанчын па перасечанай трасе і кіданні тэлефонаў. А вось водныя гонкі ў бочках, якія спачатку сталі папулярнымі ў Эстоніі, зараз паспяхова праводзяцца ў Фінляндыі.

Паводле слоў арганізатара чэмпіянату па лоўлі камароў Акселя Ківі, такое спаборніцтва — гэта вясёлы і кампанейскі занятак, які не мае абмежаванняў «па ўзроставай, палавой ці нацыянальнай прыкмеце».

Кожны ўдзельнік атрымаў у сваё распараджэнне кавалак зямлі, абмежаваны нацягнутай вяроўкай, за межы якога нельга выходзіць. Час лоўлі — 10 хвілін. Хто больш камароў зловіць — той і выйграў, растлумачыў сп. Ківі. Пералік прызоў пераможцам даволі шырокі — ад катання на яхце па Чудскім возеры і да магчымасці пастраляць з лука.

САМАЕ ВЯЛІКАЕ ВЯСЕЛЛЕ, АЛЕ БЕЗ ЖАНІХОЎ!

У Мінску прайшоў Парад нявест-2010

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У нядзелю, 20 чэрвеня, на вуліцах Мінска жыхары і госці сталіцы змаглі палюбавацца 6 новымі камандамі Парада нявестаў. Разам з «Нявестамі-ўндзінамі» (дарэчы, падчас іх выступлення прайшоў добры дождж) можна было адчуць пах марскога брызу і пачуць шум хваляў. Побач з «Галівудскімі дзівамі» можна было апынуцца на чырвонай дарожцы, «Нявесты-трапіканкі» зачароўвалі сваімі ўсмешкамі, «Нявесты-арыстакраткі» ўразілі сваёй вытанчанасцю і добрымі манерамі, а «Нявесты-імператрыцы» — сваёй велічнасцю. Упершыню сёлета ў праекце прыняла ўдзел каманда «New-весты», якая складалася выключна з прадстаўніц СМІ.

Сёлета была пададзена рэкордная колькасць заявак — 950, сярод якіх было адабрана сорак дзве прыгажуні-ўдзельніцы.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (15 чэрвеня). Па гарызанталі: Дарафеева. Рамка. Бра. Дацан. Уфа. Гюнэш. Пола. Ануча. Ікар. Агрэсія. Рапуха. Аса. Наскок. «Барыня». Апак. Кіт. Сапа. Цырата. Аклад. Фру. Руб. Трак. Здоба. Ява. Талака. Ілот. Лена. Збыт. Маракен. **Па вертыкалі:** Саладуха. Нэма. Аід. Абрыс. Аск. Капал. Сто. Апарат. Ромб. Какаду. Ная. Бялілы. Радэн. Валет. Ашуг. Флакон. Моц. Атам. Век. Апарт. Цуд. Акно. Нары. Ліпа. Рот. Акустыка. Аха. Нітка. Сера. Мята. Калдун.

Сканворд + лабірынт (16 чэрвеня). Па гарызанталі: Малако. Хамяк. Эстэт. Акр. Тынк. «Пежо». Апад. Трап. Ірга. Рэйс. Ліграін. Крос. Карп. Пуаро. Лекар. Руно. Атоса. Ураган. Галац. Сіп. Статак. **Па вертыкалі:** Шкіпер. Спрут. Арал. Отс. Круг. Кронас. Оні. Отэртрал. Пірс. Папас. Лаг. Каір. Кета. Мята. Пратакол. Крагі. Раса. Каюр. Дан. Працяжнік. **У лабірынце:** 1. Каштарыс. 2. Ліснік. 3. Пасведчанне. 4. Разынкі. 5. Выхаванец. 6. Струмень. 7. Ядваб. 8. Хаўруснік. 9. Цырульнік. 10. Цяжарнасць 11. Чаравікі. 12. Шкоднік. 13. Шруба. 14. Штука. 15. Шчупак. 16. Рамеснік.

Сканворд (17 чэрвеня). Па гарызанталі: Яравіт. Пярун. Рунь. Палас. Біта. Жако. Працяг. Пул. Кенгуру. Апока. Быхаў. Зара. Дэсант. Канава. Гітара. Вол. Тур. Палец. Зарын. Лаг. Торба. Салата. Манах. Кіно. Ікар. Нявеста. Стапель. **Па вертыкалі:** Галубок. Дог. Ідал. Тэніс. Апатыт. Буян. Руно. Віза. Твар. Падуб. Блакіт. «Тартак». Ніка. Лопух. Рана. Пінта. Хорс. Сплаў. Пас. Лада. Абоз. Каравела. Якар. Воцат. Сварог. Апал. Гантэль.

Муз-news

НІНА БАГДАНАВА ЎСІХ ПЕРАСПЯВАЛА

Праўда, здарылася гэта не на якім-небудзь прэстыжным конкурсе вакалістаў, а на чэмпіянаце па караоке, але перамога — рэч усё адно прыемная. Тым больш што спаборнічала Ніна ўсё ж не з аматарамі, а са сваімі калегамі — беларускімі артыстамі. На 8-м чэмпіянаце, што праходзіў у караоке-клубе «Зялёная паляна», менавіта Багданава заваявала тытул «Залаты чэмпіён» і падарункавы сертыфікат на 1 мільён рублёў.

— Я не тое што разлічвала на перамогу, а спачатку ўвогуле вагалася: ісці — не ісці, — узгадвае артыстка. — Бо напярэдадні быў выязны канцэрт, стамілася, не выспалася, дый звязкі пасадзіла... Але ўсё ж вырашыла пайсці, бо ведаю тутэйшую добрую і цёплую атмасферу, якая падарыць калі не першае месца, то дакладна добры настрой на ўвесь вечар.

Дарэчы, па выніках леўчага спаборніцтва двое ўдзельнікаў набралі аднолькавую колькасць балаў, але журы, падсумаваўшы ўражанні, усё ж прысудзіла першынство Ніне Багданавай. Цяпер яна зможа не толькі пахваліцца новым званнем, але і з прыемнасцю патраціць выйгрыш, скарыстаўшыся паслугамі партнёраў мерапрыемства — культурна-забаўляльнымі або гастранамічнымі, на выбар.

«БЕЗ БІЛЕТА» ЗРАБІЛІ ФУТБОЛЬНЫ РЭМІКС

У перапрацоўку дыджэяў трапіла самая летняя песня гурта «Афрыка», а ўслед за музычным рэміксам падаспела і новае відэа, прымеркаванае, зразумела ж, да чэмпіянату свету па футболе ў ПАР.

Візуалізацыя, паводле меркавання рэжысёра Максіма Сірага, атрымалася жартоўнай, аднак цалкам спартыўнай. Кліп, дарэчы, увойдзе ў пілотны выпуск праграмы «У гасцях у Ктулху», запуск якой неўзабаве плануецца на музычным тэлеканале A-One, а музыканты гурта «БЕЗ БІЛЕТА» будуць яе першымі гасцямі і раскажуць пра ўражанні ад супрацоўніцтва з дыджэямі. «Падобнае творчае сутыкненне — выдатны вопыт, — лічыць лідар гурта Віталь Артыст, — асабліва калі маеш справу з нармалёвымі хлопцамі, як у нашым выпадку. Радуе таксама, што паспелі з рэміксам і кліпам да чэмпіянату. Пакуль што не атрымліваецца ўбачыць у фінале Беларусь—Бразілія 5:0, але нічога, мы іх кліпамі «прыкладзем»!

«ДЗЕЦІДЗЯЦЕЙ» СЫШЛІ Ў ВОДПУСК

Прычым адпачынак, які пачаўся гэтым летам, характарызуецца як «бестэрміновы». Але пра канчатковы развал улюбёнага многімі — як тэатраламі, так і меламанамі — калектыву пакуль што ніхто не гаворыць і прагнозаў на будучыню не дае.

Удзельнікі гурта, звярнуўшыся да сваіх прыхільнікаў праз афіцыйны сайт www.detidetey.com, папрасілі зразумець і прыняць іх рашэнне. «Ведаючы, як вы нас любіце і верыце ў нас, адчуваючы да вас гэткія ж цёплыя і светлыя пачуцці, мы просім аб разуменні і цярпенні. Вам (як і нам) пакуль што складана гэта ўявіць, але паверце, гэта сапраўды неабходна. Дзякуй і... усё будзе добра!» — ці то абяцаюць, ці то самі спадзяюцца «Дзецідзяцей» у звароце.

Нагадаем, гурт уварваўся на беларускую сцэну ў чэрвені 2006 года — шумна і заўважна. З таго часу яго ўдзельнікі — у асноўным акцёры-«купалаўцы» — паспелі запісаць і прадставіць слухачам тры альбомы — «Канверты для сноў», «ОтЛично» і беларускамоўны «Рух», які быў выдадзены літаральна гэтай вясной.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Месяц

Першая квадра 19 чэрвеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.38	21.45	17.07
Віцебск —	4.19	21.43	17.24
Магілёў —	4.28	21.35	17.07
Гомель —	4.34	21.22	16.48
Гродна —	4.54	21.59	17.05
Брэст —	5.05	21.50	16.45

Імяніны

Пр. *Марфы, Марыі, Фёклы, Аляксандра, Аляксея, Кірылы.*

К. *Паўліны, Інакенція, Тамаша, Яна.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

22 чэрвеня

Дзве даты

Сёння — Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

1881 год — у Мінску адкрылася падпольная друкарня рэвалюцыйнай арганізацыі «Чорны перадзел». У Пецярбургу друкарня правалілася, і новую вырашылі стварыць далей ад сталіцы. Выбар паў на Мінск. У арганізацыі мінскай друкарні актыўны ўдзел прыняў Г. Пляханаў. Часопіс «Чорны перадзел», газета для працоўных «Зерно» і пракламацыі, якія выпускаліся ў Мінску, распаўсюджваліся па ўсёй Расіі.

1910 год — адкрыта першая ў Еўропе паветраная пасажырская лінія Фрыдрыхсхафен—Дзюсельдорф, па якой курсіраваў дырыжабль.

Цытата дня:

«Хто даведаўся ўсю паўнату жыцця, той не ведае страху смерці. Страх перад смерцю — толькі вынік неажыццёўленых мараў і спадзяванняў».

Франц Кафка (1883—1924), аўстрыйскі пісьменнік.

ХТО ПЕРШЫ?..

Свет і людзі Чалавека

У цыкле земляробчых спраў адказным лічыўся пачатак ворыва і сяўбы. Былі перакананы — хто першы пачынае араць, той першым будзе ва ўсіх работах на полі. Ідучы першы раз араць, гаспадар старанна ўмываўся і апранаўся чыста, каб збажына была чыстая ад зелля. Збіраючыся першы раз на ворыва, гаспадар запрагаў валоў у саху, абыходзіў іх кругом тры разы з поўным вядром вады, абліваў іх той вадою, каб у іх хапіла моцы на ўсе веснавыя работы.

● Высокім статусам надзялялася міфалагема «першы» ў юраўскай абраднасці. У дзень першага выгану жывёлы ў поле пад парог хлява клалі навойчык ад кроснаў, і калі карова пераступіць яго, то ўжо не адаб'ецца ад чарады, дзе б ні згубілася ў лесе — абавязкова прыйдзе дадому.

● На Віцебшчыне перад першым выганам жывёлы на пашу ля парога хлява кладуць замок, нож, кажух поўсцю навыварат, хлеб і яйка, каб: а) скаціна была гладкая, як яйка; б) каб у непрыяцеля замкнуліся рукі, а ў звера пашча; в) каб скаціне была простая дарога дадому; г) каб яе напладзілася столькі, колькі ў кажуху шарсцінак.

● Каб статак не расходзіўся, каб ніводную карову не загрызлі ваўкі, у першы дзень пастух абыходзіць чараду кругом тры разы.

● Вялікая колькасць распачынанняў земляробчых і сельскагаспадарчых работ звязана з першай чвэрцю Месяца — «маладзіком». Станоўчым лічыцца ўплыў маладзіка і на долю чалавека, яго здароўе, магчымасць стварэння сям'і. Чалавек, які нарадзіўся на маладзік, будзе даўгавечны, рухавы, лёгкі на пад'ём. Менавіта да гэтага часу прымяркоўвалі вяселлі.

● Калісьці першым днём тыдня была менавіта нядзеля, якая як у народнай, так і хрысціянскай культуры з'яўлялася вяршыняй акта першатварэння Свету і пачаткам існавання новага часу. Можа быць, менавіта з-за гэтага ў народнай традыцыі ўтрымліваецца негатыўнае стаўленне да сучаснага першага дня тыдня: «Панядзелак — дзень цяжкі».

● Выключным сакральным статусам надзелены пачатак новага дня — усход Сонца, асабліва ў вялікія святочныя дні: Чысты чацвер, на Вялікдзень, Купалле.

● Існуе шэраг прыродна-касмічных фактараў, якія не маюць дакладнай часавай прымеркаванасці, але разам з тым могуць аказаць істотны ўплыў на фізічнае здароўе, псіхалагічны стан чалавека, а таксама прадказаць, якім будзе гэты год, які будзе сабраны ўраджай і г. д.

● Пачуўшы першы гром, трэба было стаць спінай да дуба або тройчы перакуліцца праз галаву ці перавярнуцца з боку на бок; а пачуўшы першы раз зязюлю, трэба было патрэсці грошы ў кішэні, каб яны не зводзіліся ўвесь год; калі першы раз убачыш бусла ў палёце, значыць, і сам увесь год на нагах будзеш, калі ж у гняздзе, то можаш цяжка захварэць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Мужык на легкавой едзе за грузавіком на горадзе. На кожным святлафоры вадзіла грузавіка выскоквае з кабіны і з усяго дуру лупіць палкай па грузавым адсеку. Потым заскоквае назад і едзе далей. Нарэшце кіроўцы легкавушкі стала цікава і ён у чарговы раз выйшаў разам з дальнабойшчыкам:

— Выбачай, калі ласка, але ШТО ты робіш?!

— Разумееш, у мяне грузападымальнасць — 6 тон. А ў кузаве — 8 тон канарэек. Мне трэба, каб прынамсі 2 тоны ўвесь час ляталі, а то вось не вытрымае...

☺

На спаборніцтвах па плаванні электрык Сідараў замкнуў тройку лідараў.

☺

Не бывае страшных жанчын, бываюць баязлівыя мужчыны.

☺

Дзве мухі шпацыруюць па лысіне:

— А памятаеш, як мы раней тут у хованкі гулялі?

Да ведама

Збірай грыбы акуратна

У краіне ў сувязі са спрыяльнымі ўмовамі надвор'я, што склаліся, з'явіліся першыя лісічкі.

Мінпрыроды звяртае ўвагу грамадзян на забарону збору гэтых грыбоў з памерам шляпкі менш за 1,5 сантыметра ў дыяметры. Таксама недапушчальна разграбанне лясной падсцілкі ў пошуках лісічак. Заканадаўствам, нагадвае міністэрства, дазволеныя два спосабы збору грыбоў — зразаць іх нажом або акуратна выкручваць з коранем. Лепшым з іх з'яўляецца першы спосаб, паколькі пры выкручванні грыба з коранем церпіць грыбніца. Акрамя таго, калі грыб вырываецца з коранем, пашкоджваецца не толькі грыбніца, але і маленькія зачаткі будучых грыбоў.

За парушэнне гэтых патрабаванняў, згодна з другой часткай артыкула 15.26 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, установлена адказнасць у выглядзе накладання штрафу на грамадзяніна ў памеры да 700 тысяч рублёў (да 20 базавых велічыняў).

Сяргей РАСОЛЬКА.

У СТАЛІЦЫ ПАДЛІЧЫЛІ КОЛЬКАСЦЬ АСАБНЯКОЎ І ПУСТЫХ КВАТЭР

У Мінску, па звестках дзяржаўнага вытворчага аб'яднання (ДВА) «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка», налічваецца 2211 індывідуальных прыватных дамоў, агульная плошча якіх перавышае 200 квадратных метраў.

Акрамя таго, у сталіцы каля 30 тысяч кватэр, дзе ніхто не прапісаны. Як расказаў на прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме генеральны дырэктар аб'яднання Уладзімір Рэентовіч, такія падлікі былі зроблены для таго, каб, згодна з пастановай Савета Міністраў, з 1 чэрвеня налічваць іх уладальнікам плату за камунальныя паслугі па цэнах, якія забяспечваюць эканамічна абгрунтаваныя затраты. Плата за паслугі ЖКГ у такіх дамах і кватэрах узрасла ў сярэднім у 2-2,5 раза.

Міхаіл МІХАЙЛАЎ, «Мінск—Навіны».

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпісі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2995. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12